Астрыд Ліндгрэн

Карлсан хітруе зноў

Мастак Арсен Джанік'ян

Астрыд Ліндгрэн

Карлсан хітруе зноў



Photo JACOB FORSELL

1907–2002

Astrid Lindgren

Астрыд Ліндгрэн

Карлсан хітруе зноў

Пераклад са шведскай Алесі Башарымавай

Мастак
Арсен Джанік'ян

ПАПУРЫ
Мінск

УДК 821.113.6-34-93
ББК 84(4Шве)-44
Л59

ASTRID LINDGREN
«Karlsson på taket smyger igen»
First published in 1968 by Rabén & Sjögren, Sweden

For more information about Astrid Lindgren, see www.astridlindgren.com.
All foreign rights are handled by The Astrid Lindgren Company, Lidingö, Sweden.
For more information, please contact info@astridlindgren.se

Для малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту

ASTRID LINDGREN COMPANY

Ліндгрэн, Астрыд

Л59 Карлсан хітруе зноў : [для малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту] / Астрыд Ліндгрэн ; пер. са швед. А. Башарымава ; маст. А. Джанік'ян. — Мінск : Папуры, 2020. — 208 с. : іл.

ISBN 978-985-15-4262-4.

Найлепшы ў свеце хітрун, малявальнік пеўняў і запускальнік паравых машын, ды і проста спрэс разумны і ўзорна тоўсты мужчына ў сваім найлепшым веку, вяртаецца, каб пагарэзнічаць ізноў… Упершыню на беларускай мове выходзяць усе тры кнігі цыкла. Чытайце папярэднія гісторыі ў нашых выданнях «Малы і Карлсан, які жыве на даху» і «Карлсан прылятае зноў».

Для дзяцей малодшага школьнага ўзросту, іх трошкі старэйшых брацікаў і сястрычак, а таксама для ўсіх дарослых.

УДК 821.113.6-34-93
ББК 84(4Шве)-44

ISBN 978-985-15-4262-4

© Text: Astrid Lindgren / The Astrid Lindgren Company
© Арсен Джанік'ян, ілюстрацыі, 2018
© Пераклад. Афармленне. Выданне на беларускай мове. ТАА «Папуры», 2020

Змест

Кожны мае права быць Карлсанам 7

Карлсан успамінае, што ў яго дзень народзінаў 33

Карлсан — найлепшы вучань у класе 61

Карлсан начуе ў Малога 77

Карлсан займаецца булачкавым і аладкавым надзаляннем 96

Карлсан — найлепшы ў свеце даследчык храпу 121

Карлсан хітруе ў цемры 140

Карлсан адкрывае дзядзьку Юліусу казачны свет 165

Карлсан робіцца самым заможным багацеем свету 189

Кожны мае права быць Карлсанам

Аднаго ранку Малы — самы меншы з дзяцей сям'і Свантэсанаў — прачнуўся і пачуў, як мама і тата размаўляюць на кухні. Здавалася, яны ці то злуюцца, ці то чымсьці засмучаныя.

— Вось і дачакаліся, — сказаў тата. — Ты паглядзі, што пішуць у газеце, вазьмі пачытай!

— О, які жах, — сказала мама. — Які жах!

Малы хуценька вылез з пасцелі. Ён таксама хацеў даведацца, што там за жах такі.

І даведаўся. На першай старонцы газеты быў загаловак:

ЛЯТУЧАЯ БОЧКА — ЦІ НЕШТА ІНШАЕ?

Далей было напісана:

Што за містычнае дзіва лятае ў нас па-над Стакгольмам? Людзі сцвярджаюць, што надзвычай маленькая лятучая бочачка або нешта падобнае час ад часу з магутным гудзеннем пралятае па-над дахамі Васастана. Адміністрацыі паветраных зносін нічога не вядома пра незвычайны лятучы транспартны сродак. Ёсць падазрэнне, што які-небудзь замежны шпіён вылецеў на заданне і нешта высочвае. Каб высветліць гэта, лятучы аб'ект мусіць быць злоўлены. Калі гэта падступны маленькі шпіён, яго трэба перадаць у рукі паліцыі, прычым неадкладна. Хто разгадае лятучую таямніцу Васастана? Мы абяцаем дзесяць тысяч крон у якасці ўзнагароды таму, каму ўдасца злавіць гэты шумны прадмет, чым бы ён ні быў. Проста прынясіце лятучы аб'ект у нашу рэдакцыю і атрымайце свае грошы.

— Бедны Карлсан, — сказала мама. — Людзі яго да смерці заганяюць.

Малы спалохаўся, раззлаваўся і засмуціўся — усё адначасова.

— Чаму Карлсан не можа проста лятаць як хоча?! — крыкнуў ён. — Ён жа нічога не зрабіў. Ён проста жыве ў сваім дамку на даху — хіба ён

не можа палятаць крыху вакол? Што ў гэтым кепскага?

— Нічога, — сказаў тата. — Няма ў гэтым нічога кепскага. Проста Карлсан крышачку... хм... незвычайны.

Так, сапраўды, у Карлсане было нешта незвычайнае, гэта мусіў прызнаць нават Малы. Незвычайна, што маленькія таўсматыя матарызаваныя дзядзечкі са складным прапелерам на спіне і з уключальнікам на жываце жывуць у асобных дамочках на даху.

Такім маленькім дзядзечкам быў Карлсан, найлепшы сябар Малога. Ён быў нават больш найлепшым сябрам за Крыстэра і Гунілу, якія ўсё адно дужа падабаліся Малому і з якімі ён гуляў, калі Карлсан, бывала, раптам знікаў або не меў часу.

Карлсан лічыў, што Крыстэр і Гуніла нічога не вартыя. Ён пырхаў, калі Малы іх згадваў.

— Не кажы пры мне пра гэтых малявак, — казаў ён. — Я прыгожы, спрэс разумны і ўзорна тоўсты мужчына ў сваім найлепшым веку! Колькі дурненькіх хлопчыкаў, па-твойму, маюць такога найлепшага сябрука, га?

— Ніколькі, толькі я, — адказваў Малы, і кожны раз на сэрцы ў яго цяплела ад радасці. Якое шчасце, што Карлсан абжыўся акурат на *ягоным* даху! У Васастане было поўна такіх самых старых непрыгожых

дамоў, як той, дзе жыла сям'я Свантэсанаў, і якое шчасце, што Карлсану собіла трапіць акурат на іхны дах, а не на чыйсьці іншы!

Хаця спачатку мама і тата не надта ўзрадаваліся Карлсану, і Бусэ з Бэтан адразу яго не ўпадабалі. Уся сям'я — апроч Малога, вядома, — лічыла Карлсана самым жахлівым, разбэшчаным, бессаромным і назойлівым вісусам, якога толькі можна прыдумаць. Але з часам яны ўсе пачалі да яго прывыкаць. Цяпер Карлсан ім амаль падабаўся, а самае галоўнае, яны разумелі, што Малому ён патрэбны. Бусэ і Бэтан былі нашмат старэйшыя за Малога. Ён меў патрэбу ў найлепшым сябру, калі ўжо ў яго не было аднагодкі сястры або брата. Яшчэ ён, вядома, меў свайго сабаку — цудоўнага маленькага Бімба, але нават гэтага не ставала: Малому быў патрэбны Карлсан.

— І па-мойму, Карлсану Малы таксама патрэбны, — казала мама.

Але ўсё адно спачатку тата і мама хацелі трымаць Карлсана ў таямніцы. Яны разумелі, які ўздымецца вэрхал, калі, напрыклад, пра яго пранюхае тэлебачанне або калі штотыднёвікі пачнуць пісаць пра «Карлсана ў сябе дома».

— Ха-ха, а было б цудоўна, — сказаў аднойчы Бусэ, — калі б мы ўбачылі на вокладцы «Тыднёвіка»

Карлсана, які нюхае букет чайных руж у зале ці штосьці падобнае!

— Дурань ты, — сказаў тады Малы. — У Карлсана няма ніякай залы, у яго толькі маленькі пакойчык, завалены рознымі штукамі, і ніякіх руж там няма.

Безумоўна, Бусэ і сам гэта ведаў. І ён, і Бэтан, і мама з татам аднойчы — але толькі аднойчы — пабывалі на даху і паглядзелі дамочак Карлсана. Яны падняліся туды праз акенца на гарышчы — тое самае, якім карыстаўся камінар, — і Малы паказаў ім, як удала дамок Карлсана схаваўся за комінам блізка-блізка да глухой сцяны суседняга дома.

Мама крыху спалохалася, калі апынулася на даху і ўбачыла вуліцу так далёка ўнізе. Яна ледзь не самлела і мусіла схапіцца за комін.

— Малы, паабяцай, што ніколі не будзеш хадзіць сюды адзін, — сказала яна.

Перш чым абяцаць, Малы падумаў.

— Добра, — сказаў ён урэшце, — я ніколі не буду хадзіць сюды адзін... хаця, можа быць, я буду часам *прылятаць* сюды з Карлсанам, — дадаў ён ціха-ціха. Калі мама гэтага не пачула, то хай потым наракае на сябе. Ды і як яна можа патрабаваць, каб Малы ніколі не наведваў Карлсана? Яна ж нават не ўяўляе, як весела можа

быць у маленькім пакойчыку Карлсана, завалены рознымі штукамі.

Але цяпер усяму дакладна канец, горка падумаў Малы. І ўсё праз гэтыя брыдкія газетныя пісулькі.

— Перадай Карлсану, каб асцерагаўся, — сказаў тата. — Няхай нейкі час не лятае вакол так шмат. Лепей сядзіце ў тваім пакоі: там яго ніхто не ўбачыць.

— Але калі ён будзе сваволіць, я яго выстаўлю, — сказала мама.

Яна паставіла Малому талерку кашы на кухні, паклала крышку і ў місачку Бімба. Тата развітаўся і пайшоў у кантору. Маме, як высветлілася, таксама трэба было ў горад.

— Я выскачу ў бюро падарожжаў, можа, яны прапануюць нам штось цікавае на час татавага адпачынку, — сказала яна і пацалавала Малога. — Я хутка вярнуся.

І Малы застаўся адзін. Адзін з Бімба, кашай і сваімі думкамі. І з газетай. Яна ляжала з ім побач, і ён час ад часу зазіраў у яе.

Пад той нататкай пра Карлсана быў прыгожы здымак вялікага белага парахода, які прыплыў да Стакгольма і стаў на якар у праліве Стромэн. Малы паглядзеў на параход — о, які ён прыгожы! Вось бы пабачыць на свае вочы такі карабель, а яшчэ лепш — паплыць на ім праз мора!

Малы спрабаваў глядзець толькі на карабель, але ягоны позірк увесь час чапляўся за брыдкі загаловак:

ЛЯТУЧАЯ БОЧКА — ЦІ НЕШТА ІНШАЕ?

Малога не адпускала трывога. Трэба як найхутчэй пагаварыць з Карлсанам, але так, каб не напалохаць

яго занадта, бо хто ведае — а раптам Карлсан напужаецца так, што паляціць і ніколі болей не вернецца!

Малы ўздыхнуў. Потым несхаць засунуў у рот лыжку кашы. Ён яе не глытаў, а проста трымаў на языку, быццам каштаваў. Малы быў з тых хударлявых кволенькіх хлопчыкаў з кепскім апетытам, якіх так шмат апошнім часам. Калі ён сядзеў за сталом, то заўсёды калупаўся ў ежы цэлую вечнасць.

Не надта смачная штука гэтая каша, думаў Малы. Можа, яна крыху пасмачнее, калі пасыпаць яе цукрам болей. Ён узяў цукарніцу, але ў той самы міг пачуў за акном гудзенне матора і — шух! — у кухню заляцеў Карлсан.

— Здароўценькі, Малы! — крыкнуў ён. — Адгадай, хто самы лепшы з найлепшых сяброў, і адгадай, чаму ён прыляцеў акурат цяпер?

Малы паспешліва праглынуў тое, што было ў яго ным роце.

— Самы лепшы з найлепшых сяброў — гэта ты, Карлсан! Але чаму ты прыляцеў акурат цяпер?

— Адгадай з трох разоў, — сказаў Карлсан. — Таму што я засумаваў па такім дурненькім хлопчыку, як ты, ці таму што я проста памыліўся і заляцеў не туды, хаця збіраўся зрабіць кола над Каралеўскім паркам, ці таму што я ўнюхаў кашу — давай, адгадвай!

Твар Малога пасвятлеў ад радасці.

— Таму што ты засумаваў па мне, — сарамліва выказаў ён здагадку.

— Няправільна, — сказаў Карлсан. — І над паркам я лятаць не збіраўся, так што далей можаш не адгадваць.

«Каралеўскі парк, — падумаў Малы, — о, туды Карлсану зусім нельга лятаць! Ды і ў іншыя месцы, дзе поўна людзей, якія змогуць яго пабачыць, таксама. Трэба нарэшце растлумачыць яму гэта».

— Карлсан, паслухай, — пачаў Малы, але спыніўся, бо раптам заўважыў, што Карлсан незадаволены: ён закапыліў губу і хмура глядзеў на Малога.

— Прылятаеш тут замораны голадам, — сказаў ён, — і каб жа табе хто крэсла прапанаваў, ды талерку паставіў, ды сурвэтку начапіў, ды кашы болей наваліў, прымаўляючы: «Лыжачку за маму, лыжачку за тату, лыжачку за цётку Аўгусту»!

— Хто такая цётка Аўгуста? — зацікавіўся Малы.

— Каб я ведаў, — сказаў Карлсан.

— Дык тады ж табе не трэба есці за яе лыжачку! — засмяяўся Малы.

Але Карлсан не засмяяўся.

— Вось як ты лічыш? Вось як? Значыць, па-твойму, я мушу памерці ад голаду толькі таму, што не перазнаёміўся з усімі цёткамі свету, якія, можа,

сядзяць дзе-небудзь у Тумбе, ці Тутарудзе, ці дзе там яшчэ ды лынды б'юць!

Малы паспяшаўся паставіць перад Карлсанам талерку і сказаў, каб той узяў сабе кашы з місы. Усё яшчэ крыху хмуры, Карлсан пачаў накладаць сабе кашу. Ён накладаў, накладаў, а пад канец вычысціў пальцам рэшткі са сценак місы.

— У цябе мілая мама, — сказаў Карлсан, — шкада толькі, што яна такая сквапная, хоць ты плач. Шмат кашы пабачыў я на сваім вяку, але так мала — ніколі.

Ён вытрас увесь цукар з цукарніцы сабе ў талерку і ўзяўся есці.

У наступныя хвіліны ў кухні чулася толькі сёрбанне, якое бывае, калі нехта хутка-хутка есць кашу.

— На жаль, для цёткі Аўгусты лыжачкі не хапіла, — сказаў Карлсан, абціраючы вусны. — Але, я гляджу, тут булачкі! Спакойна, толькі спакойна, цётачка Аўгуста, сядзіце *абсалютна* спакойна ў сваёй Тумбе, а я запхну ў сябе пару булачак. Ці, можа, тры... ці чатыры... ці пяць!

Пакуль Карлсан еў булачкі, Малы спрабаваў прыдумаць, як найлепш яго пра ўсё папярэдзіць. «Можа, усё ж нічога страшнага, калі той прачытае пра ўсё сам», — падумаў Малы і, крыху павагаўшыся, падсунуў газету Карлсану.

— Паглядзі першую старонку, — змрочна сказаў ён.

І Карлсан паглядзеў. Ён глядзеў на яе вельмі зацікаўлена, а потым торкнуў тоўсценькім пальчыкам проста ў здымак белага карабля.

— Аёй, зноў карабель перакуліўся! — сказаў ён. — Няшчасці ідуць адно за адным!

— Глупства, у цябе ж газета дагары нагамі, — сказаў Малы.

Ён даўно падазраваў, што Карлсан не надта ўмее чытаць. Але Малы быў добрым хлапчанём і не любіў нікога засмучаць, а тым больш Карлсана, і таму ён не сказаў яму: «Ха-ха, ты не ўмееш чытаць!» — а проста павярнуў газету з караблём так, як трэба, каб Карлсан убачыў, што ніякай катастрофы не здарылася.

— Але тут напісана пра іншыя няшчасці, — сказаў Малы. — Паслухай вось, зараз ты ўсё пачуеш!

І ён прачытаў Карлсану ўголас пра лятучую бочку і падступнага маленькага шпіёна, які мусіць быць злоўлены, і пра ўзнагароду, і пра ўсё.

— Проста прынясіце лятучы аб'ект у нашу рэдакцыю і атрымайце свае грошы, — скончыў Малы і ўздыхнуў.

Але Карлсан не ўздыхаў — ён быў у захапленні.

— Хой, хой! — крыкнуў ён, жвава і весела падскокваючы, — хой, хой, маленькі падступны шпіён,

лічы, ужо схоплены! Патэлефануй да іх у рэдакцыю і скажы, што здасі лятучы аб'ект адразу пасля абеду!

— Як гэта? — спалохана спытаў Малы.

— Найлепшы ў свеце лоўчы шпіёнаў — адгадай, хто гэта! — сказаў Карлсан і ганарыста паказаў на сябе. — Ніжэйпадпісаны Карлсан, што імкліва нясецца са сваім сачком для мух! Калі гэты маленькі падступны шпіён лятае тут, над Васастанам, дык я злаўлю яго ў свой мухалоўны сачок яшчэ да вечара, будзь упэўнены... Дарэчы, у цябе ёсць які-небудзь чамадан, каб там змясціліся дзесяць тысяч крон?

Малы ўздыхнуў яшчэ раз. Было падобна, што ўсё нават складаней, чым ён думаў. Карлсан нічога не зразумеў.

— Мілы Карлсан, няўжо ты не разумееш, што лятучая бочка — гэта ты сам! Яны хочуць злавіць цябе.

Карлсан спыніўся проста пасярод пераможнага скачка. Ён папярхнуўся, быццам нешта раптам трапіла не ў тое горла, і гнеўна ўтаропіўся ў Малога.

— Лятучая бочка? — крыкнуў ён. — Ты называеш мяне лятучай бочкай? А я мушу быць тваім найлепшым сябрам — фу, фу!

Ён выцягнуўся, стараючыся зрабіцца крыху вышэйшым, і адначасова як мага больш старанна ўцягнуў жывот.

— Ты, напэўна, не заўважыў, — пагардліва сказаў ён, — што я прыгожы, спрэс разумны і ўзорна тоўсты мужчына ў сваім найлепшым веку. Ты, напэўна, не заўважыў гэтага, так?

— Заўважыў, Карлсан, заўважыў, — замармытаў Малы. — Але што я зраблю, калі ў газетах так пішуць? Гэта яны пра цябе, можаш быць пэўны.

Карлсан злаваўся больш і больш.

— Шумны прадмет! — з горыччу крыкнуў ён. — Прадмет! Таго, хто называе мяне прадметам, варта самога ляснуць якім-небудзь прадметам паміж вачэй, каб ажно з носа дым паваліў!

Ён пагрозліва падскочыў да Малога — але не варта было так рабіць, таму што Бімба адразу ўзняў лямант. Ён нікому не дазволіць вось так накідвацца на свайго гаспадара.

— Не, Бімба, не чапай Карлсана, — сказаў Малы, і Бімба не стаў чапаць. Ён толькі пагыркаў крыху, каб Карлсан зразумеў, што ён мае на ўвазе.

Карлсан адышоў і сеў на зэдлік, хмуры і надзьмуты, ажно пара з вушэй.

— Я з табой не гуляю, — сказаў ён. — Я з табой не гуляю, калі ты такі злы, абзываеш мяне прадметам ды цкуеш на мяне сваіх ваўкарэзаў.

Малы быў у адчаі. Ён не ведаў, што сказаць.

— Ну што я зраблю, калі ў газетах так пішуць? — прамармытаў ён і замаўчаў. Карлсан маўчаў такса-

ма. Ён сядзеў на зэдліку і дзьмуўся. У кухні павісла пакутлівая цішыня.

Раптам Карлсан выбухнуў смехам. Ён ускочыў з зэдліка і гулліва штурхануў Малога ў жывот.

— Хаця калі я прадмет, — сказаў ён, — то я, прынамсі, найлепшы прадмет у свеце, які каштуе дзесяць тысяч крон! Як табе гэта?

Малы таксама засмяяўся — о, як цудоўна зноўку бачыць Карлсана вясёлым!

— Але ж і праўда, — у захапленні сказаў Малы, — ты варты дзесяці тысяч крон! У свеце, мабыць, мала тых, хто столькі каштуе.

— Нікога ва ўсім свеце, — запэўніў Карлсан. — Гатовы ісці ў заклад, што такі малюпасенькі прадмецік, як ты, напрыклад, каштуе не болей за адну дваццаць пяць, і гэта самае вялікае.

Ён павярнуў уключальнік, радасна ўзняўся ў паветра і зрабіў пару ганаровых кругоў вакол люстры, весела галёкаючы.

— Хой, хой, — крычаў ён, — вось ляціць Дзесяцітысячакронны Карлсан, хой, хой!

Малы вырашыў ні пра што не турбавацца. Усё ж Карлсан не быў ніякім шпіёнам, і паліцыя не магла яго забраць толькі таму, што ён Карлсан. Мама з татам, пэўна ж, баяцца не гэтага, раптам зразумеў

ён. Яны проста хвалююцца, што Карлсана не атрымаецца схаваць, калі за ім пачнецца пагоня. Але сапраўднай бяды з ім усё ж здарыцца не можа, Малы быў упэўнены.

— Не бойся, Карлсан, — суцешыў ён сябра. — Яны не змогуць табе нічога зрабіць толькі таму, што ты — гэта ты.

— Так! Бо кожны мае права быць Карлсанам, — запэўніў Карлсан. — Хаця пакуль Карлсан існуе толькі адзін-адзінюткі — цудоўны і ўзорна тоўсты экзэмпляр.

Потым яны пайшлі ў пакой Малога, і Карлсан пачаў нецярпліва азірацца навокал.

— У цябе ёсць якая-небудзь паравая машына, каб яе бабахнуць, ці яшчэ што-небудзь падобнае? Мне трэба, каб бабахала, каб весела было, а іначай я не гуляю, — сказаў ён, але раптам заўважыў на стале Малога пакунак і накінуўся на яго, як коршак. Мама пакінула пакунак учора вечарам — унутры быў вялікі спелы персік, і цяпер ён блішчаў у тоўсценькіх пальцах Карлсана.

— Можам яго падзяліць, — адразу ж прапанаваў Малы: ён таксама любіў персікі і разумеў, што мусіць паспяшацца, калі хоча нешта атрымаць.

— З задавальненнем, — сказаў Карлсан. — Давай падзелім: я вазьму персік, а ты — пакунак, тады

табе дастанецца найлепшае, бо з пакункам можна прыдумаць цэлую кучу вясёлых штук!

— Не-не, дзякуй, — сказаў Малы. — Лепш мы падзелім персік, а потым ты можаш забраць сабе і пакунак.

Карлсан незадаволена пакруціў галавой.

— Ніколі не бачыў такога ненажэрнага хлопчыка, як ты, — сказаў ён. — Ну што ж, хай будзе так!

Каб разрэзаць персік, патрэбны быў нож, і Малы пабег па яго ў кухню. Калі ён вярнуўся, Карлсана не было відаць. Але потым Малы ўбачыў, што той схаваўся пад сталом, адкуль чулася паспешлівае чмяканне, быццам нехта хутка-хутка есць сакавіты персік.

— Гэй, што ты там робіш? — занепакоена спытаў Малы.

— Дзялю персік, — сказаў Карлсан і чмякнуў апошні раз.

Калі Карлсан выпаўз з-пад стала, па ягоным падбароддзі сцякаў персікавы сок. Ён працягнуў Малому пульхную ручку, у якой ляжала зморшчаная карычневая костачка ад персіка.

— Я заўсёды стараюся, каб табе даставалася найлепшае, — сказаў ён. — Калі ты пасадзіш гэтую костачку, то ў цябе вырасце цэлае персікавае дрэва, на якім будзе поўна персікаў. Пагадзіся, я самы добры

ў свеце: я нават не абураюся, што мне дастаўся толькі маленечкі няшчасны персік!

Перш чым Малы паспеў пагадзіцца, Карлсан кінуўся да акна, дзе ў гаршку расла ружовая пеларгонія.

— Я такі добры, што нават дапамагу табе пасадзіць гэтую костачку, — сказаў ён.

— Стоп! — крыкнуў Малы. Але позна. Карлсан ужо выдраў пеларгонію з гаршка і, перш чым Малы паспеў нешта зрабіць, выкінуў кветку ў акно.

— Што ты робіш! — усхапіўся Малы, але Карлсан яго не чуў.

— Цэлае вялізнае персікавае дрэва! Ты ўяві! На сваё пяцідзесяцігоддзе ты зможаш прапанаваць персік на дэсерт кожнаму госціку, хіба не цудоўна?

— Так, але асабліва цудоўна будзе, калі мама ўбачыць, што ты выдраў яе пеларгонію, — сказаў Малы. — Дый падумай, калі б які-небудзь дзядзька ішоў вуліцай, а кветка ўпала б яму на голаў, вось што б ён тады, па-твойму, сказаў?

— Дзякуй, любы Карлсан, сказаў бы ён, — запэўніў Карлсан. — Дзякуй, любы Карлсан, што ты выдраў пеларгонію, а не выкінуў яе разам з гаршком… хаця недалёкая мама нашага Малога ўпадабала б гэты варыянт.

— Нічога такога яна б не ўпадабала, — запратэставаў Малы, — не кажы лухты!

Карлсан паклаў костачку ў гаршчок і рупліва прысыпаў яе зямлёй.

— Яшчэ як упадабала б, — запэўніў ён. — Абы пеларгонія тырчала ў гаршку — гэта ўсё, што трэба тваёй маме. А тое, што гэта небяспечна для жыцця маленькіх дзядзечак, якія шпацыруюць вуліцай, — дык гэта яе не хвалюе. Адным дзядзечкам больш, адным дзядзечкам менш — гэта з'ява банальная, кажа яна, галоўнае, каб маю пеларгонію ніхто не выдраў!

Ён утаропіўся ў Малога.

— Але калі б я выкінуў яе разам з гаршком, дзе б мы тады пасадзілі персікавае дрэва? Ты пра гэта падумаў?

Малы ні пра што такое не падумаў і не змог нічога адказаць. Было складана спрачацца з Карлсанам, калі ён быў у такім настроі. Але, на шчасце, настрой у яго змяняўся прыблізна кожныя пятнаццаць хвілін, і раптам з ягоных вуснаў пачуўся задаволены смех.

— У нас застаўся пакунак, — сказаў ён. — З пакункам можна прыдумаць цэлую кучу вясёлых штук.

Малы пра гэта не задумваўся.

— Напрыклад? — спытаў ён. — Што можна рабіць з пакункам?

Вочы Карлсана заззялі.

— Найкаласальнейшы ў свеце шмяк! — сказаў ён. — Хой, хой, які гэта будзе шмяк! Зараз я гэтым і займуся.

Ён узяў пакунак і хуценька знік з ім у ванным пакоі. Малы з цікаўнасцю рушыў следам. Ён вельмі хацеў даведацца, як робяць найкаласальнейшы ў свеце шмяк.

Карлсан схіліўся над ваннай і набіраў у пакунак ваду з крана.

— Што ты робіш? — сказаў Малы. — У папяровы пакунак ваду не набіраюць, няўжо ты не ведаеш?

— А што я, па-твойму, раблю? — сказаў Карлсан, узняўшы перад носам Малога пакунак, гатовы вось-вось парвацца. Карлсан патрымаў яго крыху, каб Малы мог упэўніцца, што ў папяровы пакунак ваду яшчэ як набіраюць, а потым рынуўся з ім назад у пакой.

Малы кінуўся следам, поўны благіх прадчуванняў. І сапраўды… Карлсан перавесіўся праз акно, так што быў бачны толькі ягоны круглы зад і караценькія круглявыя ножкі.

— Хой, хой! — крыкнуў ён. — Глядзіце ўгору, вы там, бо зараз лясне найкаласальнейшы ў свеце шмяк!

— Стоп! — крыкнуў Малы і таксама хутчэй высунуўся ў акно.

— Не, Карлсан, толькі не гэта! — адчайна закрычаў ён.

Але было запозна. Малы ўбачыў, як пакунак упаў, быццам бомба, ля самых ног беднай цётачкі, якая ішла ў малочную краму ў суседнім доме. Ёй відавочна не спадабаўся найкаласальнейшы ў свеце шмяк.

— Яна верашчыць так, нібыта я скінуў гаршчок ад кветак, — сказаў Карлсан. — А гэта ўсяго толькі крышку звычайнай вады.

Малы з грукатам зачыніў акно. Ён не хацеў, каб Карлсан яшчэ што-небудзь выкінуў.

— Не думаю, што так рабіць добра, — сказаў ён сур'ёзна.

Але Карлсан толькі зарагатаў. Ён лятаў вакол люстры, смеючыся і пазіраючы на Малога.

— «Не думаю, што так рабіць добра», — перадражніў ён яго. — А як, па-твойму, добра? Выкідваць пакункі з пратухлымі яйкамі, так? Гэта яшчэ адна з дзівацкіх прыдумак тваёй мамы?

Ён падляцеў да Малога і плюхнуўся перад ім на падлогу.

— Вы найвялікшыя ў свеце дзівакі, ты і твая мама, — сказаў ён і паляпаў Малога па шчацэ. — Але, як ні дзіўна, вы ўсё адно мне падабаецеся.

Малы ажно пачырванеў ад задавальнення. Усё ж цудоўна, што ён падабаецца Карлсану і што мама Карлсану таксама даспадобы, хаця часам здавалася якраз наадварот.

— Так, мне гэта і самому дзіўна, — сказаў Карлсан.

Ён працягваў паляпваць Малога па шчацэ. Ён паляпваў доўга і ўпарта, усё мацней і мацней. Урэшце Карлсан ляпнуў яго так, што атрымалася амаль поўха, і сказаў:

— Ах, які ж я добры! Самы добры ў свеце. І таму я думаю, што нам трэба зараз пагуляцца ў штонебудзь добрае, як лічыш?

І Малы так лічыў. Ён пачаў разважаць, у што такое добрае можна пагуляць з Карлсанам.

— Напрыклад, — сказаў Карлсан, — мы можам пагуляць, нібы стол — гэта наш каўчэг, на якім мы ратуемся ад вялікай паводкі... А вось і яна!

Ён паказаў на маленькі струменьчык, што з'явіўся з-пад дзвярэй.

Малы ахнуў.

— Ты не закруціў кран? — спалохана спытаў ён.

Карлсан нахіліў галаву набок і лагодна паглядзеў на Малога.

— Адгадай з трох разоў, зрабіў я гэта ці не?

Малы адчыніў дзверы ў вітальню — і сапраўды, вялікая паводка пачалася. Ванны пакой і вітальня апынуліся пад вадой — можна нават паплёскацца, калі заманецца.

Карлсану заманулася. Ён з захапленнем ускочыў абедзвюма нагамі проста ў мокрадзь.

— Хой, хой, — сказаў ён. — Бываюць жа дні, калі здараюцца адны толькі прыемнасці!

Малы закруціў кран і спусціў ваду ў перапоўненай ванне, а потым апусціўся на крэсла ў вітальні і роспачна паглядзеў навокал.

— Аёй, — сказаў ён, — аёй, што скажа мама?

Карлсан завіс у паветры і абурана паглядзеў на Малога.

— Не, ну, ведаеш, — сказаў ён. — У цябе нейкая плакса, а не мама! Гэта ж проста крыху звычайнай вады!

Ён зноў падскочыў і плюхнуўся дзвюма нагамі ў ваду, так што пырскі паляцелі на Малога.

— Вельмі прыемная вадзічка, дарэчы, — сказаў ён. — Нават можна прымаць ванны для ног. Хіба твая мама не любіць ванны для ног?

Ён падскочыў ізноў і запырскаў Малога яшчэ больш.

— Хіба яна *ніколі* не мые ног? Хіба яна цэлымі днямі *толькі і робіць*, што кідае з вокнаў гаршкі з кветкамі?

Малы не адказваў. Яго думкі былі занятыя іншым. Нарэшце ён ачомаўся — о, яны мусяць як след усё выцерці, пакуль не вярнулася мама!

— Карлсан, нам трэба спяшацца... — сказаў ён і ўзняўся з крэсла. Ён кінуўся на кухню і адразу ж вярнуўся з парай анучаў для падлогі.

— Карлсан, дапамажы, — пачаў быў ён.

Але ніякага Карлсана не было. Яго не было ні ў ванным пакоі, ні ў вітальні, ні ў пакоі Малога. Затое Малы пачуў гудзенне матора знадворку. Ён падбег да акна і ўбачыў, як нехта з абрысамі тоўсценькай кілбасіны прашумеў міма.

— Лятучая бочка — ці нешта іншае? — прамармытаў Малы.

Не, ніякая гэта не лятучая бочка! Гэта проста Карлсан вяртаецца ў свой зялёны дамок на даху.

Але тут Карлсан заўважыў Малога. Ён зрабіў крутое піке і са свістам праляцеў міма акна. Малы горача замахаў яму анучай, і Карлсан памахаў у адказ пульхнай ручкай.

— Хой, хой, — крыкнуў ён. — Вось ляціць Дзесяцітысячакронны Карлсан, хой, хой!

І ён паляцеў. А Малы пайшоў у вітальню, трымаючы ў кожнай руцэ па анучы, і пачаў выціраць ваду.

Карлсан успамінае, што ў яго дзень нараджэнаў

Карлсану пашанцавала, што яго не было, калі мама вярнулася з бюро падарожжаў, бо яна сапраўды вельмі раззлавалася — і за пеларгонію, і за паводку, хаця Малы паспеў зрабіць большага ўсё выцерці.

Мама адразу зразумела, хто тут пабываў, а тата даведаўся пра патоп, калі ўвечары прыйшоў дадому.

— Ведаю, што гэта непрыгожа, — сказала мама, — бо я ўжо больш-менш пачала прызвычайвацца да Карлсана, але *калі-нікалі* і адчуваю, што сама з задавальненнем заплаціла б дзесяць тысяч крон, каб толькі яго пазбавіцца.

— Фу, не кажы так, — сказаў Малы.

— Так, годзе, — сказала мама — за сталом павінна быць прыемна.

Мама заўсёды казала, што за сталом павінна быць прыемна. І Малы так лічыў. І як жа насамрэч прыемна было, калі яны сядзелі разам, елі і размаўлялі пра ўсё на свеце. Малы больш размаўляў, чым еў, — прынамсі, калі падавалі вараную траску, суп з агародніны або рыбныя біткі. Але сёння ў іх былі катлеты з бараніны і клубніцы, і ўсё таму, што летнія канікулы толькі пачаліся і Бусэ з Бэтан з'язджалі: Бусэ — у школу ветразевага спорту, а Бэтан — на хутар з коньмі. Таму зладзілі невялікі развітальны вечар: мама любіла час ад часу рабіць такія маленькія святы.

— Але не сумуй, Малы, — сказаў тата, — мы таксама паедзем у падарожжа — мама, ты і я.

І ён паведаміў навіны. Аказалася, што ў бюро падарожжаў мама заказала білеты на круіз на такім самым караблі, які Малы бачыў у газеце. Судна адправіцца праз тыдзень, і чатырнаццаць дзён яны будуць плаваць на гэтым белым параходзе, наведваючы розныя парты́ і гарады. «Хіба не цудоўна?» — спытала мама. І тата спытаў таксама. І Бусэ спытаў, і Бэтан...

— Хіба не цудоўна, хіба не весела будзе, Малы?

— Ага, — сказаў Малы, разумеючы, што вандроўка і праўда можа быць вясёлай. Але разам з тым ён адчуваў нешта нядобрае, і адразу ж здагадаўся,

што не так: Карлсан! Як можна пакінуць Карлсана аднаго цяпер, калі яму патрэбна дапамога? Малы шмат разважаў над гэтым, пакуль выціраў сляды вялікай паводкі.

Нават калі Карлсан ніякі не шпіён, а проста Карлсан, усё адно можа здарыцца што-небудзь непрыемнае, калі людзі пачнуць за ім ганяцца, каб атрымаць дзесяць тысяч крон. Хто ведае, што прыйдзе ім у голаў? Можа, яны пасадзяць Карлсана ў клетку ў заасадзе Скансэна або выдумаюць яшчэ што-небудзь жахлівае. У любым разе, можна не сумнявацца: яны не дазволяць яму па-ранейшаму жыць у сваім дамочку на даху.

Таму Малы вырашыў застацца дома і прыглядзець за Карлсанам. Ён пастараўся давесці гэта ўсім за вячэрай, пакуль сядзеў за сталом і жаваў сваю катлету з бараніны.

Бусэ засмяяўся.

— Карлсан у Скансэне ў клетцы... аёй! Уяві, Малы, прыходзіш ты такі са сваім класам туды, ходзіш там, разглядаеш звяроў, чытаеш таблічкі на клетках. Белы мядзведзь, чытаеш ты, а тут лось, а тут воўк, а тут бабёр, а вось тут Карлсан.

— Ш-ш-ш, — сказаў Малы.

Бусэ хіхікаў.

— «Карлсан. Звера не карміць!» Уяві, гэтак будзе напісана — гэта ж як раззлуецца Карлсан!

— Дурань ты! — сказаў Малы. — Дурны як бот!

— Але ж, Малы, — сказала мама, — калі ты не паплывеш з намі, то і мы не зможам паплыць, разумееш?

— Вядома, вы зможаце паплыць, — сказаў Малы. — Мы з Карлсанам разам прыгледзім за домам.

— Хо-хо, — сказала Бэтан. — І ўвесь дом затопіце, га? І ўсю мэблю павыкідаеце праз акно?

— Вось дурная, — сказаў Малы.

За сталом чамусьці зрабілася не так прыемна, як звычайна.

Хаця Малы быў добрым і мілым хлопчыкам, часам ён страшэнна ўпарціўся. Цяпер ён быў цвёрды, як крэмень, і нават слухаць не хацеў ніякіх угавораў.

— Так, але паслухай, мой хлопча... — пачаў быў тата.

Больш ён нічога не паспеў сказаць: у дзвярах бразнула вечка адтуліны, у якую закідвалі пошту. Бэтан кінулася з-за стала, не спытаўшы дазволу: яна чакала лістоў ад нейкага патлатага хлопца. Вось чаму яна так спяшалася паспець першай у калідор. І праўда, на дыванку перад дзвярыма ляжаў ліст, але не для Бэтан і не ад патлатага хлопца... Наадварот. Ліст быў для таты ад дзядзькі Юліуса, у якога валасоў не было зусім.

— За сталом павінна быць прыемна, — сказаў Бусэ. — Лісты ад дзядзькі Юліуса прыемнымі не назавеш.

Дзядзька Юліус быў далёкім сваяком таты і раз на год прыязджаў у Стакгольм наведаць свайго лекара і завітаць да сям'і Свантэсанаў.



Дзядзька не хацеў жыць у гатэлі, бо лічыў, што гэта занадта дорага. Хаця грошай у яго было як смецця. Проста ён вельмі баяўся іх траціць.

Ніхто ў сям'і Свантэсанаў не быў асабліва рады, калі прыязджаў дзядзька Юліус. А тата дык менш за ўсіх. Але мама заўсёды казала:

— Ты ўсё ж адзіны ягоны сваяк, і яго так шкада. Давайце будзем спагадлівымі да беднага дзядзькі Юліуса.

Хаця пасля пары дзён гасцявання дзядзькі Юліуса, падчас якіх ён рабіў заўвагі яе дзецям, бурчаў, што яна кепска гатуе, і скардзіўся на ўсё, у мамы паміж броваў з'яўлялася зморшчынка. Мама тады здавалася амаль такой жа, якім рабіўся тата, як толькі дзядзька Юліус пераступаў парог. Бусэ і Бэтан трымаліся дзе далей. Яны амаль не з'яўляліся дома, пакуль там жыў дзядзька Юліус.

— Малы адзіны, хто хоць крыху спагадлівы да яго, — часта паўтарала мама. Але нават Малы ўрэшце стамляўся. Апошнім разам, калі ў іх гасцяваў дзядзька Юліус, Малы намаляваў яго ў сваім альбоме і падпісаў: «Ён дурны».

Дзядзька Юліус выпадкова ўбачыў малюнак і сказаў:

— Вельмі кепска ў цябе конь атрымаўся!

Дзядзьку Юліусу *ўсё* здавалася вельмі кепскім. Прыемным госцем назваць яго не выпадала, і калі ён урэшце збіраў свой чамадан і з'язджаў назад у Вэстэргётланд, Малому здавалася, што ўвесь дом расцвітаў і пачынаў напяваць вясёленькую песеньку. Усе рабіліся смяшлівымі і ажыўленымі, нібыта здарылася нешта надзвычай вясёлае, хаця здарылася толькі тое, што бедны дзядзька Юліус паехаў дадому.

Але цяпер ён збіраўся прыехаць і пісаў у лісце, што будзе гасцяваць каля чатырнаццаці дзён. Гэта, безумоўна, вельмі здорава, пісаў ён, і да таго ж

лекар сказаў, што яму патрэбныя працэдуры і масаж, бо раніцай у яго ў целе такое напружанне!

— Так-так, значыць, бывай, круіз... — сказала мама. — Малы не хоча плыць, і дзядзька Юліус прыязджае!

Але тут тата ўдарыў кулаком па стале і сказаў, што ён асабіста выправіцца ў круіз, прычым разам з мамай — нават калі яму давядзецца для гэтага яе выкрасці. Малы можа плыць з ім або застацца дома, як яму заманецца, — выбірай, калі ласка, — а дзядзька Юліус хай прыязджае, жыве ў кватэры і ходзіць да лекара колькі хоча, або хай застаецца ў Вэстэргётландзе, калі гэта яму больш даспадобы, але ён асабіста выправіцца ў круіз, нават калі прыедуць дзесяць дзядзькаў Юліусаў, вось так!

— Так-так, — сказала мама, — давядзецца нам добра падумаць.

Падумаўшы як след, мама сказала, што мусіць спытаць тую фрэкен Бок, якая дапамагала ім падчас мамінай хваробы мінулай восенню, ці не зможа яна прыйсці і дагледзець дом... і двух упартых старых халасцякоў — Малога і дзядзьку Юліуса.

— А таксама трэцяга старога халасцяка — Карлсана, які жыве на даху, — сказаў тата. — Не забывайся на Карлсана, бо ён будзе гойсаць сюды і назад цэлымі днямі.

Бусэ зарагатаў так, што ледзь не звaліўся з крэсла.

— Страхмістрыня разам з дзядзькам Юліусам і Карлсанам, які жыве на даху! Што тут будзе!

— І на Малога ж не забывайся! — сказала Бэтан.

Яна абняла Малога і задумліва паглядзела яму ў вочы.

— Бываюць жа такія, як ты, мой Малы, — сказала яна. — І навошта табе сядзець дома са Страхмістрыняй, дзядзькам Юліусам і Карлсанам, замест таго каб выправіцца ў найцудоўнейшы круіз з мамай і татам?

Малы вырваўся.

— Калі маеш найлепшага сябра, трэба сачыць, каб з ім усё было добра, — пахмура сказаў ён.

Не думайце, быццам ён не разумеў, як складана ўсё будзе! Ён ведаў, што будзе проста каласальна складана, калі Карлсан пачне гудзець ля вушэй дзядзькі Юліуса і фрэкен Бок. Але камусьці трэба застацца дома, каб разбірацца з непрыемнасцямі.

— І застацца мушу я, Бімба, ты разумееш? — сказаў Малы. Ён ляжаў у пасцелі, а Бімба соп у сваім кошыку побач з ложкам.

Малы спусціў руку і пачухаў Бімба пальцам пад аброжкам.

— Давай лепей спаць, — сказаў Малы, — нам з табой спатрэбіцца сіла.

Але тут зусім нечакана пачулася гудзенне матора, і ў пакой заляцеў Карлсан.

— Ах, як міла, — сказаў ён. — Пра ўсё заўжды мушу думаць сам! Каб жа хоць нехта нагадаў і не даў забыцца!

Малы сеў у пасцелі.

— Не даў забыцца на што?

— Што сёння мой дзень народзінаў! Увесь гэты доўгі дзень у мяне быў дзень народзінаў, а я нават і не ўспомніў, бо ніхто не павіншаваў.

— Але ж, — сказаў Малы, — як твой дзень народзінаў можа быць восьмага чэрвеня? У цябе ўжо быў дзень народзінаў перад самым Вялікаднем!

— Быў, так, — сказаў Карлсан. — Але нельга ўвесь час святкаваць адзін і той жа дзень народзінаў, калі для гэтага ёсць столькі іншых дзён. Восьмага чэрвеня — цудоўны дзень для дня народзінаў, што ўжо табе ў ім не падабаецца?

Малы засмяяўся.

— Што ты, я заўсёды рады твайму дню народзінаў, у любы дзень!

— А калі так, — сказаў Карлсан і кранальна схіліў галаву набок, — калі так, то папрашу мае падарункі.

Малы асцярожна падняўся з пасцелі. Было няпроста вось так знянацку адшукаць падарунак, варты Карлсана, але ён паспрабуе.

— Я пагляджу ў сваіх шуфлядках, — сказаў ён.

— Паглядзі-паглядзі, — сказаў Карлсан і застаўся чакаць.

Але тут ён заўважыў гаршчок, у які пасадзіў персікавую костачку, і адразу кінуўся туды. Ён засунуў палец у зямлю і спрытна выкалупаў адтуль костачку.

— Трэба праверыць, наколькі яна вырасла, — сказаў ён. — Ой, па-мойму, яна вырасла нашмат!

Потым гэтак жа спрытна ён засунуў костачку назад і абцёр зямлю з рукі аб піжаму Малога.

— Праз дзесяць-дваццаць гадоў ты не нарадуешся, — сказаў ён.

— Чаму? — спытаў Малы.

— Ты зможаш драмаць удзень у цяні персікавага дрэва! Якая ўдача, скажы? А ложак табе ў любым разе давядзецца выкінуць. Нельга трымаць столькі мэблі разам з персікавым дрэвам... Ну што, знайшоў для мяне падарунак?

Малы даў яму адну са сваіх машынак, але Карлсан паматляў галавой — «не тое». Малы пачаў па чарзе прапаноўваць мазаіку, і настольную гульню, і торбачку з каменнымі шарыкамі, але Карлсан кожны раз матляў галавой. Тады Малы зразумеў, што хацеў Карлсан, — пісталет! Ён ляжаў глыбока-глыбока ў правай шуфлядцы ў скрыначцы ад запалак. Гэта быў самы маленькі ў свеце цацач-

ны пісталет — і самы прыгожы. Тата прывёз яго аднойчы Малому з замежнай вандроўкі, і Крыстэр з Гунілай зайздросцілі некалькі дзён, бо такога пісталета ніхто ніколі не бачыў. Ён выглядаў зусім як сапраўдны, хоць і быў такі маленькі, і бахаў ён гэтак жа моцна, як і сапраўдны пісталет. Зусім незразумела, дзівіўся тата, як ён можа так гучна страляць.

— Будзь асцярожны з ім, — сказаў ён, укладаючы маленькі пісталет у руку Малога, — не цягай яго паўсюль з сабой і не палохай людзей.

З пэўных прычын Малы не паказваў Карлсану пісталет. Ён і сам лічыў, што гэта не надта па-сяброўску, але надалей хаваць яго не было сэнсу, бо акурат учора Карлсан усё адно знайшоў яго, калі корпаўся ў шуфлядках Малога. Карлсану пісталет таксама здаўся вельмі прыгожым. Магчыма, якраз таму дзень народзінаў Карлсана — сёння, падумаў Малы і, уздыхнуўшы, дастаў скрыначку.

— Віншую з днём народзінаў, — сказаў ён.

Карлсан спачатку загалёкаў ад радасці, потым кінуўся да Малога і расцалаваў яго ў абедзве шчакі, а пасля адкрыў скрыначку і, задаволена пакрэктваючы, дастаў адтуль пісталет.

— Самы лепшы з найлепшых сяброў — гэта ты, Малы, — сказаў ён, і тады Малы раптам адчуў сябе

вясёлым і задаволеным, быццам атрымаў у падарунак цэлую сотню пісталетаў і яму было за радасць аддаць Карлсану адзін.

— Разумееш, — сказаў Карлсан, — мне ён і праўда патрэбны. Я буду карыстацца ім вечарамі.

— Як гэта? — з трывогай спытаў Малы.

— Калі я ляжу і лічу авечак, — сказаў Карлсан.

Карлсан часам скардзіўся Малому на кепскі сон.

— Уначы я сплю як бервяно, — звычайна казаў ён, — і ўранку таксама. Але ж пасля абеду я адно ляжу і перакідаюся з боку на бок, а часам не магу заснуць нават увечары.

Таму Малы навучыў яго хітрасці. Калі не атрымліваецца заснуць, трэба заплюшчыць вочы і ўявіць, быццам гурт авечак па чарзе пераскоквае цераз плот. Калі авечкі скачуць, іх трэба пералічваць адну за адной. Ад гэтага ўрэшце пачынае хіліць у сон, і ты нават не заўважаеш, як засынаеш.

— Разумееш, сёння ўвечары я не мог заснуць, — сказаў Карлсан. — Тады я пачаў лічыць авечак. І сярод іх была адна брыдкая авечка, якая не хацела скакаць — ну ніяк не хацела! — сказаў Карлсан.

Малы засмяяўся.

— Чаму не хацела?

— Проста каб паўпарціцца і мяне падражніць, — сказаў Карлсан. — Стаяла надзьмутая каля плота і проста не хацела скакаць. І тады я падумаў, што калі б у мяне быў пісталент, я б ужо навучыў яе скакаць! Тады я ўспомніў, што ў цябе, Малы, ёсць

адзін пісталент у шуфлядцы, а потым я ўспомніў, што ў мяне дзень народзінаў, — патлумачыў Карлсан і з захапленнем пагладзіў пісталет.

Потым ён захацеў стрэльнуць, каб выпрабаваць свой падарунак.

— Трэба, каб бабахала, каб весела было, іначай я з табой не гуляю!

Але Малы адмовіў яму вельмі рашуча.

— Ні за што ў жыцці! Мы пабудзім увесь дом.

Карлсан паціснуў плячыма.

— Ну дык што, гэта ж з'ява банальная! Зноўку заснуць, тае бяды! А калі ў іх няма сваіх авечак, каб лічыць, могуць пазычыць у мяне.

Але Малы ўсё адно не жадаў пагаджацца на спробны стрэл, і тады Карлсану прыйшла ідэя.

— Мы паляцім да мяне, — сказаў ён. — Дый салодкі стол трэба зладзіць... У цябе ёсць які-небудзь торт?

Малы мусіў прызнацца, што торта ў яго няма, і калі Карлсан забурчаў у адказ, Малы заявіў, што гэта ж усё адно з'ява банальная.

— Торт — ніякая не банальная з'ява, — строга сказаў Карлсан. — Але паспрабуем задаволіцца булачкамі. Ідзі і прынясі сюды ўсе, што ёсць!

Малы прабраўся ў кухню і вярнуўся з ладным грузам булачак. Мама раз і назаўсёды паабяцала яму, што ён можа частаваць Карлсана булачкамі, калі трэба. А цяпер было праўда трэба.

Затое мама ніколі не дазваляла яму лятаць з Карлсанам на дах, але Малы на гэта проста забыўся і здзівіўся б, калі б нехта нагадаў яму пра заба-

рону. Малы так прызвычаіўся лятаць з Карлсанам і адчуваў сябе так спакойна і надзейна, што яму нават у жываце не заказытала, калі ён, абхапіўшы Карлсана рукамі, вылецеў праз акно. Яны прагудзелі ў паветры да Карлсанавага дамочка на даху.

Чэрвеньскія стакгольмскія вечары не падобныя ні на што ў цэлым свеце. Нідзе неба не ззяе такім дзівосным святлом, нідзе поцемкі не бываюць такімі прыемнымі, чарадзейнымі і сінімі. І ў гэтых сініх поцемках раскінуўся на бляклых водах горад, нібыта вылецеў са старажытнай казкі, а не існаваў наяве.

Такія вечары нібы створаныя для булачкавых банкетаў на ганку Карлсанавага дамка. Малы звычайна амаль не заўважаў ні нябеснага святла, ні чарадзейнага сутоння, а Карлсану ўвогуле не было да гэтага клопату. Але цяпер, калі яны сядзелі там разам і пілі сок з булачкамі, Малы прынамсі адчуў, што гэты вечар не падобны да іншых вечароў. А Карлсан адчуў, што маміны булачкі не падобныя да іншых булачак. А Малы падумаў, што дамок Карлсана не падобны ні да якога іншага дамка ў свеце. Больш нідзе не можа існаваць такой утульнай і ўдала размешчанай хаткі з такім краявідам, і нідзе няма столькі ўсялякіх дробязей і штуковін, сабраных у адным месцы. Карлсан быў як вавёрка — набіваў сваё жытло чым

толькі мог. Малы не ведаў, дзе ён усё гэта бярэ: у Карлсана ўвесь час з'яўляліся новыя рэчы. Большасць з іх ён развешваў на сценах, каб лягчэй дабрацца пры патрэбе.

— Дробязі ў мяне злева, а штуковіны справа, — патлумачыў Карлсан Малому.

Сярод дробязей і штуковін у Карлсана віселі дзве карціны, якія Малы любіў разглядаць. На адной карціне быў певень, і яна называлася «Партрэт самотнага маленечкага чырвонага пеўня», а на другой — ліса, і гэтая карціна называлася «Партрэт маіх зайцаў». На ёй, праўда, не было бачна ніякіх зайцаў, але якраз таму, што яны ў лісе, патлумачыў Карлсан.

— Калі знайду вольны час, намалюю яшчэ «Партрэт маленькай злой авечкі, якая не хоча скакаць», — паабяцаў Карлсан з набітым булачкамі ротам.

Але Малы амаль не слухаў: усе гукі і водары летняга вечара наплывалі на яго і кружылі галаву. Ён адчуваў водар ліп, што квітнелі на вуліцы, чуў пошчак абцасаў па брукаванцы далёка ўнізе, дзе прыгожым чэрвеньскім вечарам прагульваліся людзі, і яму здавалася, што гэты пошчак гучыць вельмі па-летняму. З дамоў навокал даносіліся галасы: вечар быў такі спакойны, што ўсё чулася вельмі выразна. Людзі то гаманілі, то спявалі, то

сварыліся, то крычалі, то смяяліся, то плакалі і не ведалі, што на даху сядзіць хлопчык і слухае ўсё, нібыта музыку.

«Не, яны не ведаюць, што я сяджу тут з Карлсанам, атрымліваю асалоду і частуюся булачкамі», — задаволена падумаў Малы.

Крыху воддаль з мансарды пачулася гучнае выццё і галас.

— Ты толькі паслухай маіх памаўзлюкаў, — сказаў Карлсан.

— Каго-каго?.. Ты пра Філе і Руле? — спытаў Малы.

— Пра іх — іншых памаўзлюкаў у мяне няма, наколькі я ведаю, — сказаў Карлсан.

Малы таксама ведаў Філе і Руле. Гэта былі найгоршыя зладзюгі ва ўсім Васастане, памаўзлівыя, як сарокі. Таму Карлсан называў іх памаўзлюкамі. Летась аднаго вечара яны ўлезлі ў кватэру сям'і Свантэсанаў, каб яе абчысціць, але Карлсан тады гуляў у прывіда і напалохаў іх так, што яны і да сёння памятаюць. Тым разам яны не змаглі сцягнуць нават срэбнай лыжачкі. Але калі Карлсан пачуў, як Філе і Руле ўсчалі галас у сваёй мансардзе, ён падняўся і змахнуў з сябе крошкі ад булачак.

— Я лічу, карысна іх час ад часу папужаць, — сказаў ён. — Іначай яны валэндаюцца паўсюль і цягаюць чужыя рэчы.

І ён кінуўся па дахах да мансарды.

Малы ніколі не бачыў, каб нехта з такімі маленькімі і тоўсценькімі ножкамі бегаў так хутка. Мала хто здолеў бы дагнаць Карлсана, але Малы, хоць і не звыкся бегаць па дахах, штосілы стараўся паспець за ім.

— Памаўзлюкі — жахлівыя, — сказаў на бягу Карлсан. — Калі я сцягну сабе нешта, я адразу ж расплачваюся пятаком, бо я самы сумленны ў свеце. Але хутка мае манеткі скончацца, і я не ведаю, дзе сцягнуць яшчэ.

Акно мансарды стаяла адчыненае, але гардзіны былі ссунутыя. Чулася, як за імі рагочуць і гарлапаняць Філе ды Руле.

— Зараз пабачым, што іх так насмяшыла, — сказаў Карлсан і крыху адсунуў гардзіну, каб зазірнуць у шчыліну. Малы таксама паглядзеў і ўбачыў Філе і Руле ў брудным пакоі. Яны ляжалі ніцма на падлозе, разгарнуўшы перад сабой газету. Іх ажывіла акурат тое, што яны там вычыталі.

— Дзесяць тысяч, ну не, каб мяне мухі! — крычаў Руле.

— І ён лятае над Васастанам — ну не, пацалуй мяне ў пятку! — крычаў Філе, захлынаючыся смехам.

— Гэй, Філе, — сказаў Руле. — Я ведаю кагосьці, хто збіраецца разбагацець на дзесяць тысяч крон, ха-ха-ха!

— Гэй, Руле, — сказаў Філе. — Я таксама ведаю аднаго такога, хто збіраецца злапаць падступнага маленькага шпіёна, хо-хо-хо!

Калі Малы пачуў іхнія словы, то спалохаўся так, што ажно збялеў, а вось Карлсан захіхікаў.

— А я ведаю кагосьці, хто збіраецца крыху пахітраваць, — сказаў ён і даў залп. Бахнула так, што рэха ад стрэлу пранеслася па-над дахамі, і Карлсан крыкнуў:

— Адчыняйце, паліцыя!

Руле і Філе ў мансардзе ўскочылі з падлогі, быццам падсмаленыя.

— Хавуле, райся! — крыкнуў Філе.

Ён хацеў сказаць: «Руле, хавайся!» — але ад страху звычайна блытаў словы.

— Шутчэй у хафу! — крыкнуў ён, і яны разам з Руле ўваліліся ў шафу, з грукатам зачынілі за сабой дзверы і больш не паказваліся. Але было чуваць, як Філе адчайна гарлае:

— Мушу сказаць, што Рыле і Фуле няма дома! Няма іх, *зусім* няма, сышлі!

Потым, калі Карлсан і Малы вярнуліся на свой ганак, Малы зусім павесіў галаву, уся ягоная радасць

знікла. Ён зразумеў, як цяжка будзе пільнаваць Карлсана, што так неасцярожна паводзіўся, калі вакол шныпарылі такія тыпусы, як Руле і Філе. А яшчэ ж фрэкен Бок і дзядзька Юліус... Ой, ён жа зусім забыўся расказаць Карлсану!

— Слухай, Карлсан... — пачаў Малы.

Але Карлсан не слухаў. Ён працягваў булачкавы банкет і акурат цяпер сёрбаў сок з блакітнага кубачка, які раней належаў Малому і які Малы падарыў яму на мінулы дзень народзінаў тры месяцы таму. Карлсан моцна абхапіў кубачак абедзвюма рукамі, як робяць малыя дзеці, але раптам упусціў яго долу — таксама зусім як гэта робяць малыя дзеці.

— Ой, — сказаў Малы, таму што блакітны кубачак быў цудоўны і было б шкада, каб ён разбіўся.

Але ён не разбіўся. Акурат калі кубачак ляцеў міма Карлсанавых разутых ног, той спрытна злавіў яго вялікімі пальцамі, якія, быццам дзве чорненькія кілбаскі, вытыркаліся з дзіравых шкарпэтак у чырвоную палоску.

— Адгадай, у каго найлепшыя вялікія пальцы на нагах? — спытаў Карлсан.

Ён замілавана паглядзеў на свае чорныя кілбасінкі і нейкі час забаўляўся тым, што то вытыркаў, то засоўваў іх у дзіркі шкарпэтак ды час ад часу згінаў і разгінаў іх.

— Паслухай, Карлсан... — паспрабаваў Малы яшчэ раз, але Карлсан перапыніў яго.

— Ты ж умееш лічыць, — сказаў ён. — Калі я ўвесь каштую дзесяць тысяч крон, то колькі пятакоў я атрымаю за свае вялікія пальцы на нагах?

Малы засмяяўся.

— Не ведаю. Ты хочаш іх прадаць?

— Так, — сказаў Карлсан. — Табе. Я аддам іх танна, бо яны ўжо крыху зацяганыя. І да таго ж... — працягнуў ён задумліва, — нібыта крыху запэцканыя.

— Што ты кажаш! — сказаў Малы. — Як жа ты абыдзешся без гэтых пальцаў?

— А навошта мне абыходзіцца? — сказаў Карлсан. — Яны застануцца са мной, але *ўсё адно* будуць тваімі. Я проста дам іх табе напракат.

Ён паклаў ногі на калені Малога, каб той зразумеў, што ўжо цяпер можа лічыць ягоныя вялікія пальцы сваімі, і пачаў падбухторваць Малога:

— Уяві: кожны раз, як ты іх убачыш, ты зможаш казаць: «Гэтыя мілыя пальчыкі належаць мне!» Хіба не чароўна?

Але Малы не хацеў заключаць ніякіх пагадненняў пра пальцы на нагах. Ён паабяцаў Карлсану аддаць усе пятакі са сваёй скарбонкі проста так. А потым ён нарэшце паведаміў тое, што мусіў.

— Паслухай, Карлсан, — сказаў Малы, — зможаш адгадаць, хто будзе даглядаць мяне, калі мама з татам паедуць у адпачынак?

— Найлепшы ў свеце даглядальнік дзяцей, я мяркую, — сказаў Карлсан.

— Гэта ты пра сябе? — удакладніў Малы, хаця сам добра ведаў адказ. Карлсан пацвердзіў:

— Вядома. А калі ты зможаш паказаць мне лепшага даглядальніка дзяцей, я табе дам пяць эрэ.

— Фрэкен Бок, — сказаў Малы.

Ён баяўся, Карлсан раззлуецца, што мама паклікала фрэкен Бок у той час, як найлепшы ў свеце даглядальнік дзяцей быў гатовы да яе паслуг, але, як ні дзіўна, гэтая навіна па-добраму ўзрушыла і захапіла Карлсана.

— Хой, хой, — толькі і сказаў ён. — Хой, хой!

— Што ты хочаш сказаць гэтым «хой-хой»? — трывожна пацікавіўся Малы.

— Калі я кажу «хой-хой», то гэтым я хачу сказаць «хой-хой», — запэўніў Карлсан. Ягоныя вочы ажно ззялі.

— А яшчэ дзядзька Юліус прыедзе, — сказаў Малы. — Яму трэба да лекара на працэдуры, бо раніцай у яго напружанне ў целе.

І ён расказаў Карлсану, які даставучы гэты дзядзька Юліус і што ён будзе жыць у іхняй кватэры ўвесь

час, пакуль мама з татам будуць плаваць на тым белым караблі з газеты, а Бусэ і Бэтан раз'едуцца хто куды.

— Цікава, як усё будзе, — занепакоена сказаў Малы.

— Хой, — сказаў Карлсан, — гэтую пару тыдняў яны павек не забудуць!

— Яны — гэта мама з татам ці Бусэ з Бэтан? — не зразумеў Малы.

— Яны — гэта Страхмістрыня і дзядзька Юліус, — сказаў Карлсан.

Тады Малы занепакоіўся яшчэ больш. Але Карлсан суцяшальна паляпаў яго па шчацэ.

— Спакойна, толькі спакойна! Мы будзем гуляць з імі ў добрыя гульні, бо мы самыя добрыя ў свеце... прынамсі, я.

І ён даў такі залп каля самага вуха Малога, што з перапуду той падскочыў.

— І не трэба беднаму дзядзьку Юліусу ні да якіх лекараў ні на якія працэдуры, — сказаў Карлсан, — гэты клопат я бяру на сябе.

— Гэта як? — спытаў Малы. — Ты хіба ведаеш, якія працэдуры патрэбныя, калі ў целе напружанне?

— Яшчэ як ведаю, — сказаў Карлсан. — Кляну-ся, са мной дзядзька Юліус зробіцца шпаркім і рухавым, як хорт... Для гэтага ёсць тры спосабы.

— Якія спосабы? — падазрона спытаў Малы.

— Надзаляць, хітраваць і фігураваць, — сказаў Карлсан, — іншых працэдур не спатрэбіцца.

Малы трывожна азірнуўся, бо паўсюль у дамах людзі пачалі высоўвацца з вокнаў, каб паглядзець, хто гэта страляў. Да таго ж ён заўважыў, што Карлсан зноў зараджае пісталет.

— Не, Карлсан, — сказаў Малы. — Не, Карлсан, не страляй болей!

— Спакойна, толькі спакойна, — сказаў Карлсан. — Слухай, — дадаў ён, — я вось сяджу і думаю. Табе не здаецца, што ў Страхмістрыні таксама невялікае напружанне ў целе?

Не паспеў Малы адказаць, як Карлсан радасна ўзняў пісталет і стрэліў. Бабахнула так, што рэха пранеслася над дахамі. З навакольных дамоў пачуліся галасы, спалоханыя і раззлаваныя, нехта крыкнуў штосьці пра ўчастковага. Малы зусім перапалохаўся. Але Карлсан сядзеў сабе ды спакойна жаваў булачку, апошнюю, якая засталася.

— Чаго ты накінуўся? — сказаў ён. — Яны хіба не ведаюць, што ў мяне дзень народзінаў?

Ён праглынуў булачку. А пасля завёў песню — вясёлую песеньку, якая так прыгожа пералівалася ў летнім вечары.

Трэба, каб бабахала, каб весела было —
вось так: бабах, бубух, бабам, бубум, тра-ла-ло!
Каб імянінных булачак быў поўны дом,
вось так! Бах, бух, бам, бум, бом!
Хай мне крычаць:
«Здароўценькі! Віншуем! Ура!» —
І дораць падарункі, каб аж бах-тарарах!
Вось так: хой, хой, хой!
Вось так: вой, вой, вой!
Вось так: бах, бубух, бабам, бубум і бом!

Карлсан — найлепшы вучань у класе

Мама і тата выправіліся ў круіз увечары, калі дождж ліў так, што струмені малацілі ў шыбы і грымелі ў вадасцёкавых трубах. За дзесяць хвілін да іх ад'езду, не раней, у дзверы ўвалілася фрэкен Бок, прамоклая да ніткі і злая, як стары пірат.

— Нарэшце! — сказала мама. — Нарэшце!

Яна ўвесь дзень чакала і не знаходзіла спакою, і таму цяпер вельмі нервавалася. Але фрэкен Бок гэтага не зразумела. Яна пахмура сказала:

— Я не магла прыйсці раней. Гэта ўсё Фрыда віноватая.

Маме трэба было шмат пра што дамовіцца з фрэкен Бок, але часу на гэта ўжо не было, бо на вуліцы чакала таксі.

— Самае важнае — гэта наш хлопчык, — сказала мама са слязамі ў вачах. — О, толькі б з ім нічога не здарылася, пакуль нас не будзе!

— Там, дзе я, нічога не здараецца, — запэўніла фрэкен Бок.

Тата сказаў, што давярае ёй і што ён упэўнены: усё будзе добра. Потым тата і мама абнялі на развітанне Малога, выбеглі з кватэры і зніклі ў ліфце... Малы застаўся сам-насам з фрэкен Бок.

Яна села за кухонны стол, вялікая, грубая і злая, і пачала расчэсваць мокрыя валасы вялі-

кімі, грубымі рукамі. Малы баязліва глядзеў на яе і слаба ўсміхаўся, каб паказаць прыязнасць. Ён памятаў, як баяўся яе мінулым разам і як яна яму тады не спадабалася. Але цяпер усё іначай, цяпер яму здавалася нават прыемным, што фрэкен Бок сядзіць тут. І нават калі ёй з Карлсанам будзе складана ўжыцца ў адным доме, Малы ўсё адно быў удзячны фрэкен Бок, што яна прыйшла. Іначай мама ніколі ў жыцці не дазволіла б яму застацца дома аднаму, каб прыглядаць за Карлсанам, гэта ўжо дакладна. Таму Малы хацеў з самага пачатку паказаць сваю прыязнасць да фрэкен Бок і ветліва спытаў:

— Як пачуваецца Фрыда?

Фрэкен Бок не адказала, а толькі чмыхнула. Фрыда была сястрой фрэкен Бок. Малы ніколі не сустракаўся з ёй, а толькі чуў пра яе. Вельмі шмат чуў. Ад фрэкен Бок. Фрэкен Бок жыла разам з Фрыдай у кватэры на вуліцы Фрэйгатан, але выдавала на тое, што вясёлага ў гэтым мала. Малы зразумеў: фрэкен Бок недалюблівала сястру і лічыла, што тая важнічае і выяўляе з сябе невядома каго. Спачатку Фрыду паклікалі выступіць у тэлеперадачы пра прывідаў, і гэта вельмі зачапіла фрэкен Бок. Вядома, пазней яна сама трапіла на іншую перадачу, дзе паказвала ўсяму

шведскаму народу, як гатуе «Духмельны ласунак Хільдур Бок», але гэтага, відаць, было мала, каб асадзіць Фрыду. Мабыць, тая ўсё адно працягвала важнічаць і выдаваць з сябе невядома каго, раз фрэкен Бок толькі чмыхнула ў адказ на пытанне Малога, як пачуваецца Фрыда.

— Дзякуй, яна, па ўсім відаць, пачуваецца выдатна, — сказала фрэкен Бок, начмыхаўшыся як след. — Жаніха сабе вычапіла, бядачка!

Малы не зусім разумеў, што яму адказаць на гэта, але нешта сказаць ён мусіў. Ён так хацеў быць ветлівым, што спытаў:

— А ў вас, фрэкен Бок, таксама ёсць жаніх?

Гэтага, відаць, яму не варта было пытаць, бо фрэкен Бок рэзка паднялася і пачала з грукатам мыць посуд.

— Не, дзякуй богу, — сказала яна. — Я і не хачу ніякіх жаніхоў. Не ўсім жа быць такімі ветрагонкамі, як Фрыда.

Яна крыху пастаяла ціха, а тады пачала так шараваць посуд, што пена паляцела ва ўсе бакі.

Але потым фрэкен Бок, відаць, пра нешта ўспомніла і занепакоена павярнулася да Малога.

— Паслухай, а той брыдкі тоўсты хлопчык, з якім ты гуляў раней, ён жа болей сюды не прыходзіць, я спадзяюся?

Фрэкен Бок так і не зразумела, што Карлсан, які жыве на даху, быў прыгожым, спрэс разумным і ўзорна тоўстым мужчынам у сваім найлепшым веку, — яна думала, што ён школьны сябрук Малога, ягоны аднагодак і самы звычайны вісус. Тое, што гэты вісус умеў лятаць, яе не здзіўляла. Яна думала, што ягоны матор — цацка, якую можна купіць у любой краме, калі маеш дастаткова грошай, і толькі лаялася, якія разбэшчаныя цяпер дзеці з усімі гэтымі дарагімі гульнюшкамі.

— Хутка, відаць, і на Месяц пачнуць лятаць, яшчэ не пачаўшы хадзіць у школу! — казала яна.

А цяпер яна назвала Карлсана «той брыдкі тоўсты хлопчык» — гэта, на думку Малога, было зусім не ветліва.

— Карлсан не брыдкі... — пачаў ён, але тут якраз пазванілі ў дзверы.

— Ой, няўжо дзядзька Юліус прыехаў! — усклікнуў Малы і пабег адчыняць.

Але гэта быў не дзядзька Юліус, гэта быў Карлсан. Прамоклы наскрозь Карлсан, які стаяў пасярод маленькай лужынкі дажджавой вады і глядзеў на Малога з дакорам.

— Як доўга я мушу лятаць пад дажджом і лаяцца толькі таму, што ты не можаш пакінуць сваё акно адчыненым? — спытаў Карлсан.

— Але ж ты сказаў, што паляціш да сябе спаць! — пачаў апраўдвацца Малы, бо Карлсан і праўда гэта сказаў. — Я нават не думаў, што ты сёння вернешся.

— Ты мог бы спадзявацца, — сказаў Карлсан. — Ты мог бы падумаць — можа, ён усё ж такі прыляціць, мілы Карлсанчык, о, як гэта было б здорава, так, можа быць, ён прыляціць, бо яму ж, пэўна, захочацца пабачыць Страхмістрыню — ты мог бы пра гэта падумаць!

— Ты хочаш яе пабачыць? — затрывожыўся Малы.

— Хой, хой, — сказаў Карлсан з агнём у вачах. — Хой, хой, а ты як думаеш?

Малы, вядома, разумеў, што не зможа ўвесь час адмяжоўваць Карлсана ад фрэкен Бок, але ён не быў гатовы, што яны сутыкнуцца адно з адным ужо ў першы вечар. Ён адчуваў, што мусіць паразмаўляць з Карлсанам, але той ужо бег у кухню, узрушаны, як паляўнічы сабака.

Малы дагнаў яго і схапіў за руку.

— Паслухай, Карлсан, — пачаў ён пераконваць, — яна лічыць, што ты мой школьны таварыш, і я думаю, будзе лепей, калі яна і далей так будзе лічыць.

Карлсан рэзка спыніўся. Потым у ім забулькаў смех, як звычайна бывала, калі ён захапляўся чымнебудзь.

— Яна праўда думае, што я таксама хаджу ў школу? — радасна спытаў ён і зноў прыпусціў да кухні.

Фрэкен Бок чула ягоны галоп. Яна чакала дзядзьку Юліуса і таму здзівілася, што спаважны мужчына можа гойсаць на такой хуткасці. Яна з цікаўнасцю павярнулася, каб паглядзець на гэтага хуткаснага бегуна, але калі дзверы адчыніліся і ў кухню ўварваўся Карлсан, яна ахнула, быццам убачыла змяю. Змяю, якую нізашто не жадала бачыць у сваёй кухні.

Але Карлсан гэтага не зразумеў. За пару скачкоў ён апынуўся побач з ёй і ўзрушана паглядзеў у яе незадаволены твар.

— І хто, па-твойму, найлепшы вучань у класе? — спытаў ён. — Адгадай, хто найлепшы ў лічэнні, чытанні, пісьме і ў... ва ўсім?

— Калі ўваходзіш, трэба вітацца, — сказала фрэкен Бок. — І мяне не цікавіць, хто найлепшы вучань у класе. У кожным разе, не ты.

— А вось і я, уяві сабе, — сказаў Карлсан, але раптам сціх і нібыта задумаўся. — Прынамсі, я найлепшы ў лічэнні, — падумаўшы як след, сказаў ён пахмура. Але потым паціснуў плячыма.

— Ну але што ж, гэта з'ява банальная, — сказаў ён і пачаў жвава скакаць па кухні.

Ён кружляў вакол фрэкен Бок, а потым раптам завёў сваю вясёлую песеньку:

— Трэба, каб бабахала, каб весела было...

— Не, Карлсан, — паспешліва сказаў Малы. — Не, не!

Але гэта не дапамагло.

— Вось так: бабах, бубух, бабам, бубум, тра-ла-ло! — спяваў Карлсан.

І калі ён дайшоў да «тра-ла-ло», раптам пачуўся стрэл, а потым крык. Стрэл быў з Карлсанавага пісталета, а крык — з вуснаў фрэкен Бок. Малы спачатку падумаў, што яна знепрытомнела, бо яна апусцілася на крэсла і сядзела там ціха, заплюшчыўшы вочы, але калі Карлсан праспяваў далей сваё «бах, бубух, бабам, бубум і бом», яна расплюшчыла іх і сярдзіта сказала:

— Калі ты зараз жа не спынішся, я цябе так адбабахаю і адбубухаю, брыдкае дзіця, што ты павек не забудзеш!

На гэта Карлсан нічога не адказаў. Ён толькі тыцнуў сваім тоўсценькім пальцам пад яе падбародак, дзе на каўняры была прыгожая брошка.

— Прыгожая штучка, — сказаў ён. — Дзе ты яе сцягнула?

— Ты што, Карлсан! — спалохана сказаў Малы, бо заўважыў, як раз'юшылася фрэкен Бок.

— Гэта... гэта... гэта найбессаромнейшая выхадка! — запінаючыся, прамовіла яна. Словы даваліся цяжка, але ўрэшце яна гаркнула:

— Прэч! Прэч адсюль, кажу!

Карлсан здзіўлена паглядзеў на яе.

— Чаго ты, чаго ты, — сказаў ён. — Я ж проста спытаў. А калі ветліва пытаеш, можаш разлічваць на ветлівы адказ, я лічу так.

— Прэч! — крыкнула фрэкен Бок.

— Дарэчы, — сказаў Карлсан. — Я б хацеў нештачкі даведацца. У цябе таксама раніцай бывае напружанне ў целе? Калі так, то а якой гадзіне мне лепш пачынаць цябе фігураваць?

Фрэкен Бок раз'юшана агледзелася па баках у пошуках якой-небудзь зброі, каб прагнаць Карлсана, і той угодліва збегаў у камору, дастаў выбівалку для дываноў і ўсунуў ёй у руку.

— Хой, хой! — крыкнуў ён і пачаў марш-кідок вакол кухні. — Хой, хой, ізноў пагоня!

Але фрэкен Бок адкінула выбівалку. Яна, пэўна, памятала, як ганялася з ёю за Карлсанам мінулым разам, і не хацела такое паўтараць.

Малому гэта ўсё здалося не надта добрым пачаткам, і ён задумаўся, ці доўга зможа фрэкен Бок спакойна назіраць за тым, як Карлсан гарцуе вакол і крычыць «хой-хой». Доўга яна не выдужае, думаў

Малы. Трэба як мага хутчэй выцягнуць Карлсана з кухні. І калі той адзінаццаты раз праносіўся побач, Малы ўхапіў яго за каўнер.

— Карлсан, — падлабуніўся ён, — хадзем лепей да мяне ў пакой.

І Карлсан пайшоў за ім, хоць і не надта ахвотна.

— Як недарэчна ты мяне спыніў — акурат калі яна амаль што разварушылася! — сказаў ён. — Калі б у мяне было яшчэ крыху часу, яна б ужо дакладна гойсала і была б вясёлая і гуллівая, нібы марскі леў.

Як звычайна, ён падышоў да акна і выкалупаў з гаршка персікавую костачку, каб паглядзець, наколькі тая вырасла.

Малы таксама падышоў паглядзець і, паклаўшы руку Карлсану на плячо, адчуў, які той мокры. Небарака, мусіць, яму давялося доўга лятаць пад дажджом.

— Ты не мерзнеш? Ты ж увесь прамок! — сказаў Малы.

Было не падобна, што Карлсан раней пра гэта задумваўся, але цяпер ён і сам гэта адчуў.

— Яшчэ як мерзну, — сказаў ён. — Але хіба кагосьці гэта турбуе? Хіба кагосьці засмучае, што найлепшы сябар прыходзіць наскрозь прамоклы, калоціцца ад холаду? Хіба хтосьці просіць яго

зняць вопратку і вешае яе сушыцца, хіба хтосьці надзявае на яго мяккі ўтульны халат, ідзе гатаваць яму цёплы шакалад, і частуе яго кучай булачак, і ўкладвае яго ў пасцель, і спявае яму сумную прыгожую песеньку, каб ён пакрысе заснуў? Хіба хтосьці гэта робіць? — ён з папрокам паглядзеў на Малога.

— Не, ніхто гэтага не робіць, — сказаў той, гатовы вось-вось заплакаць.

Тады Малы паспяшаўся зрабіць усё тое, што, як лічыў Карлсан, патрэбна было зрабіць для найлепшага сябра. Самае складанае было раскруціць фрэкен Бок на гарачы шакалад, але ў яе не было больш ні часу, ні сілы, каб спрачацца, бо яна акурат смажыла курыцу для дзядзькі Юліуса, які мог з'явіцца ў любую хвіліну.

— Можаш усё і сам арганізаваць, — сказала яна.

Малы так і зрабіў. Потым Карлсан, круглявы і ружавашчокі, сядзеў у ложку Малога, апрануты ў яго ны купальны халат, піў шакалад і еў булачкі, пакуль у ванным пакоі сушыліся яго штаны, бялізна, чаравікі і шкарпэткі.

— Сумнай песенькі спяваць не трэба, — сказаў Карлсан. — Але ты можаш паўгаворваць мяне, каб я застаўся ў цябе начаваць.

— А ты хочаш застацца? — спытаў Малы.

Карлсан акурат засунуў у рот цэлую булачку і не мог адказаць, таму толькі горача заківаў. Бімба забрахаў. Яму не падабалася, што Карлсан ляжыць у пасцелі Малога. Але Малы ўзяў Бімба на рукі і прашаптаў яму на вуха:

— Не хвалюйся, я перабяруся на канапу і перанясу туды твой кошык!

Фрэкен Бок бразнула чымсьці на кухні, і Карлсан, пачуўшы гэта, абурана сказаў:

— Яна не паверыла, што я найлепшы вучань у класе!

— А чаго тут здзіўляцца? — спытаў Малы.

Ён жа ведаў, што Карлсан не ўмеў як след ні чытаць, ні пісаць, ні лічыць, хаця так выхваляўся перад фрэкен Бок.

— Табе трэба практыкавацца, — сказаў Малы. — Можа, давай я крыху павучу цябе арыфметыцы?

Карлсан чмыхнуў, ды так, што шакалад пырснуў ва ўсе бакі.

— Можа, давай я крыху павучу цябе ведаць сваё месца? Ці ты думаеш, я не разбіраюся ў амырфе... ну, у тым, што ты сказаў?

Але з практыкаваннямі ў іх не склалася, бо тут у дзверы пазванілі. Малы здагадаўся, што цяпер гэта ўжо дакладна дзядзька Юліус, і кінуўся адчыняць. Ён хацеў яго сустрэць адзін і думаў, што Карлсан застанецца ў ложку. Але Карлсан думаў іначай. Ён з усіх ног прыпусціў за Малым, так што падол халата трапятаў вакол яго ног.

Малы расчыніў дзверы — за імі і праўда стаяў дзядзька Юліус. У кожнай руцэ ён трымаў па чамадане.

— Прывітанне, дзядзька Ю... — пачаў быў Малы.

Далей ён нічога сказаць не паспеў. Бо ў гэты момант пачуўся жудасны стрэл, і дзядзька Юліус у непрытомнасці паваліўся на падлогу.

— Ты што, Карлсан! — адчайна ўсклікнуў Малы. О, як ён пашкадаваў, што падарыў Карлсану гэты пісталет! — Што нам цяпер рабіць, навошта ты гэта ўчыніў?

— Мусіць жа быць салют, — пачаў апраўдвацца Карлсан. — А як інакш? Без салюта *не абысціся*, калі візіт наносяць салідныя асобы і найвышэйшае чынавенства.

Малы быў такі няшчасны, што, здавалася, вось-вось заплача. Бімба раз'юшана брахаў, а фрэкен Бок, якая таксама пачула стрэл, прыбегла ўся задыханая і пачала ўзмахваць рукамі ды вохкаць над бедным дзядзькам Юліусам, які ляжаў на дыванку ля дзвярэй, нібы ссечаная хваіна ў бары. Толькі Карлсан зусім не хваляваўся.

— Спакойна, толькі спакойна, — сказаў ён.

Ён схапіў палівачку, з якой мама Малога звычайна паліваля расліны ў доме, і шчодра паліў душыкам дзядзьку Юліуса. Гэта насамрэч дапамагло — дзядзька Юліус павольна расплюшчыў вочы.

— Калі гэты дождж ужо скончыцца... — прамармытаў ён. Але калі ўбачыў схіленыя над сабой устрывожаныя твары, то цалкам ачомаўся.

— Што... што... што адбываецца? — злосна рыкнуў ён.

— Адбываецца салют, — сказаў Карлсан, — хаця для некаторых асоб, якія млеюць з нічога ніякага, гэты зарад, лічы, пушчаны на вецер.

Фрэкен Бок узяла на сябе клопат пра дзядзьку Юліуса. Яна абцёрла яго і павяла ў спальню, дзе ён мусіў жыць, і было чуваць, як яна тлумачыць яму, што гэты брыдкі тоўсты хлопчык — аднакласнік Малога, і што кожны раз, як ён тут з'яўляецца, яго даводзіцца выстаўляць.

— Чуеш? — сказаў Малы Карлсану. — Паабяцай, што ніколі больш не будзеш рабіць салютаў!

— Яшчэ што скажаш! — нахмурыўся Карлсан. — Ты тут прыходзіш і спрабуеш зрабіць гасцям прыемна, узняць настрой, і што ў выніку? Хтосьці кідаецца табе насустрач, цалуе ў абедзве шчакі і крычыць, што ты найлепшы ў свеце весялун? Не, дзе ўжо! Усе вы тут зануды і задавакі, вось вы хто!

Малы не чуў, што казаў Карлсан. Ён прыслухоўваўся да скаргаў дзядзькі Юліуса ў спальні. Матрац занадта цвёрды, казаў той, і ложак занадта кароткі, а коўдры занадта тонкія. Ну вось, цяпер нарэшце заўважна, што дзядзька Юліус прыехаў.

— Ён нічым не бывае задаволены, — сказаў Малы Карлсану. — Мне здаецца, ён цалкам задаволены толькі самім сабой.

— Ад гэтага я яго хутка адвучу, калі добра мяне папросіш, — сказаў Карлсан.

Але Малы добра папрасіў Карлсана ні ў якім разе гэтага не рабіць.

Карлсан начуе ў Малога

Крыху пазней дзядзька Юліус сядзеў за абедзенным сталом і еў курыцу, а фрэкен Бок, Малы, Карлсан і Бімба стаялі вакол і глядзелі. Зусім як кароль, думаў Малы. Настаўніца расказвала ім у школе, што калісьці даўно, калі каралі елі, вакол заўсёды стаялі і назіралі прыдворныя.

Дзядзька Юліус быў тоўсты і выглядаў вельмі пагардлівым і самазадаволеным, але Малы памятаў, што і старажытныя каралі часам бывалі такімі самымі.

— Прыбяры адсюль сабаку, — сказаў дзядзька Юліус. — Ты ведаеш, што я не люблю сабак, Малы.

— Але ж Бімба нічога не робіць! — запярэчыў Малы. — Ён жа зусім ціхі і добры.

Тады дзядзька Юліус напусціў на сябе тую жартаўлівую міну, якую рабіў заўсёды, калі збіраўся сказаць што-небудзь гадкае.

— Вось як, цяпер дзеці такім чынам паводзяцца? — сказаў ён. — Маленькія хлопчыкі пярэчаць, калі робіш ім заўвагу? Вось як, аказваецца... Не скажу, каб гэта мне падабалася.

Карлсан увесь час глядзеў толькі на курыцу, але цяпер задумліва перавёў позірк на дзядзьку Юліуса. Ён стаяў так і глядзеў на яго даволі доўга.

— Дзядзька Юліус, — нарэшце сказаў ён. — Хто-небудзь табе казаў, што ты прыгожы, спрэс разумны і ўзорна тоўсты мужчына ў сваім найлепшым веку?

Такога вытанчанага камплімента дзядзька Юліус не чакаў. Ён быў ад яго проста ў захапленні, хаця вельмі стараўся не паказаць гэтага. Ён толькі выдаў кароткі сціплы смяшок і прамовіў:

— Не, гэтага мне яшчэ не казалі!

— Вось як, не казалі? — сказаў Карлсан. — Як жа тады табе ў чарапню прыйшла такая бязглуздая думка?

— Ты што, Карлсан... — папікнуў яго Малы, уражаны такім нахабствам. Але тут Карлсан раззлаваўся.

— «Ты што, Карлсан, ты што, Карлсан» і зноў «ты што, Карлсан»! — перадражніў ён. — Чаго ты бурчыш увесь час? Я ж нічога не зрабіў.

Дзядзька Юліус строга паглядзеў на Карлсана, але, пэўна, вырашыў на яго не зважаць. Ён працягваў есці курыцу, а фрэкен Бок угаворвала яго частавацца яшчэ.

— Спадзяюся, вам смачна, — сказала яна.

Дзядзька Юліус з храбусценнем учапіўся зубамі ў курыцу, а потым сказаў сваім жартаўлівым тонам:

— Дзякуй, смачна! Хаця гэтай курыцы дакладна гады чатыры ці пяць, гэта я па зубах адчуваю.

Фрэкен Бок хапанула ротам паветра, а на лбе адразу выступіла пара сярдзітых зморшчынак.

— Няма ў кур ніякіх зубоў, што вы кажаце! — адрэзала яна.

Тады твар у дзядзькі Юліуса зрабіўся яшчэ больш жартаўлівы.

— У кур няма, а ў мяне ёсць, — сказаў ён.

— Але толькі не ноччу, наколькі я чуў, — дадаў Карлсан, і Малы пачырванеў, бо гэта ён расказаў

Карлсану, што дзядзька Юліус перад сном кладзе свае зубы ў шклянку з вадой і ставіць на тумбачку.

На шчасце, у гэты момант фрэкен Бок гучна завыла ад таго, што курыца здалася дзядзьку Юліусу жорсткай. Калі нешта магло зачапіць яе за жывое, дык гэта калі яе кухарскім здольнасцям рабілі заўвагі. Таму цяпер яна горка рыдала.

Дзядзька Юліус, вядома, не думаў, што яна прыме гэта так блізка да сэрца. Ён паспяшаўся падзякаваць за ежу і амаль прысаромлены адышоўся, сеў у крэсла-гайданку і схаваўся за газетай.

Карлсан сярдзіта ўтаропіўся ў яго.

— Фу, якія ж некаторыя бываюць гадкія! — прамовіў ён, а потым падбег да фрэкен Бок і пагладзіў яе, дакуль змог дастаць.

— Ну-ну, мая любачка, — суцяшальна сказаў ён. — Жорсткая курыца — з'ява банальная. Што ўжо тут зробіш, калі ты так і не навучылася як след гатаваць.

Але тут фрэкен Бок узвыла і штурхнула Карлсана так моцна, што ён праляцеў праз увесь пакой і ўпаў на каленкі дзядзькі Юліуса.

— Хой, хой! — загарлапаніў Карлсан, і не паспеў дзядзька Юліус скінуць яго з каленяў, як Карлсан улёгся там ямчэй. Ён зацягнуў ногі пад падол халата, утульна скруціўся, а потым прабуркаваў:

— Давай пагуляем, што ты мой дзядуля і расказваеш мне казку, толькі не дужа страшную, бо я спужаюся.

Дзядзька Юліус зусім не хацеў гуляць у дзядулю, і да таго ж ён знайшоў у газеце нешта цікавае. Ён бесцырымонна скінуў Карлсана на падлогу і павярнуўся да фрэкен Бок.

— Што я прачытаў у газеце! — сказаў ён. — У Васастане праўда лятаюць шпіёны?

Малы скамянеў, калі пачуў гэта: здорава, нічога не скажаш! І чаму дзядзьку Юліусу трапілася гэтая няшчасная газета? Ёй болей за тыдзень, даўно трэба было яе выкінуць!

Але, на шчасце, дзядзька Юліус толькі пагардліва пасмяяўся з таго, што пісалі ў газеце.

— Яны думаюць, што народ праглыне любую лухту, — сказаў ён. — Вось яны ўсю гэтую дурасць і пішуць, абы людзі куплялі болей. Шпіён... Ну і глупства! Вы ж не бачылі ніякіх шпіёнаў ці лятучых бочак у гэтых мясцінах, фрэкен Бок?

Малы стаіў дыханне. Калі яна зараз скажа, што гэты брыдкі тоўсты хлопчык часам лятае вакол, то ўсё, канец, бо прынамсі дзядзька Юліус тады задумаецца.

Але фрэкен Бок, відаць, нават у галаву не магло прыйсці, што палёты Карлсана — гэта штосьці незвычайнае. Да таго ж яна ўсё яшчэ ўсхліпвала, так што ледзьве магла гаварыць.

— Не ведаю я ні пра якіх шпіёнаў, — сказала яна скрозь слёзы. — Па-мойму, гэта звычайная газетная лухта.

Малы выдыхнуў з палёгкай. Калі б ён цяпер угаварыў Карлсана ніколі-ніколі не лятаць на вачах

у дзядзькі Юліуса, то ўсё было б добра. Малы агледзеўся ў пошуках Карлсана, але той знік. Тады Малы захваляваўся і адразу хацеў пайсці яго шукаць, аднак дзядзька Юліус затрымаў яго. Яму дужа карцела паслухаць, як ідуць школьныя справы Малога, і праверыць, наколькі добра ён умее лічыць вусна, і няважна, што цяпер канікулы і не да таго. Урэшце Малы вызваліўся і пабег у свой пакой паглядзець, ці там Карлсан.

— Карлсан! — крыкнуў ён з парога. — Карлсан, дзе ты?

— У тваіх піжамных штанах, — сказаў Карлсан. — Калі толькі гэтыя няшчасныя кілбасныя скуркі можна назваць штанамі!

Ён сядзеў на краі ложка і спрабаваў уціснуцца ў штаны, але, як ні стараўся, у яго нічога не атрымлівалася.

— Я прынясу табе піжаму Бусэ, — сказаў Малы і збегаў у пакой брата.

Піжама Бусэ больш-менш пасавала ўзорна тоўстаму мужчыну накшталт Карлсана, хаця, вядома, рукавы і калашыны былі занадта доўгія. Карлсан хутка даў ім рады, абрэзаўшы лішняе. Малы заўважыў гэта толькі тады, калі было позна, але пераймацца не стаў. Піжама — з'ява банальная, і яна не сапсуе цудоўны вечар, калі Карлсан застаўся ў яго начаваць.

Малы паслаў сабе на канапе бялізну Бусэ і паставіў кошык Бімба побач. Бімба ляжаў там і спрабаваў заснуць, але час ад часу адплюшчваў адно вока і падазрона касавурыўся на Карлсана.

Карлсан спрабаваў уладкавацца ямчэй у ложку Малога.

— Я хачу зрабіць сабе цёпленькае гняздзечка, — сказаў ён.

Малы падумаў, што Карлсан даволі мілы ў блакітнай паласатай піжаме Бусэ, і калі падтыкнуць яму коўдру з усіх бакоў, сапраўды атрымалася б нешта накшталт цёплага гняздзечка.

Але Карлсан не хацеў накрывацца.

— Рана яшчэ, — сказаў ён. — Калі начуеш у гасцях, трэба спачатку зрабіць кучу вясёлых штук. Паесці бутэрбродаў з кілбасой у пасцелі, пагуляць у «прасціну-кішэнь»* і пабіцца падушкамі. Пачнём з бутэрбродаў!

---

* Гульня, калі нехта ўпотай сцеле ложак так, каб у яго нельга было легчы. Спачатку сцелюць ніжнюю прасціну, наверх — яшчэ адну, на якую кладзецца коўдра. Пры гэтым верхняя прасціна сцелецца складзенай напалам, каб атрымалася «кішэнь». Край прасціны прыгожа загінаецца на коўдру зверху. Выглядае як звычайная пасцель, але той, хто захоча ў яе легчы, трапіць у кароткую «кішэнь» і не зможа выпрастаць ногі.

— Але ты толькі што з'еў цэлую гару булачак! — здзівіўся Малы.

— Калі мы не зробім усё, што *трэба*, то я з табой не гуляю, — сказаў Карлсан. — Нясі бутэрброды!

І Малы прабраўся на кухню ды зрабіў бутэрброды. Ніхто яму не замінаў. Фрэкен Бок сядзела ў гасцёўні ды размаўляла з дзядзькам Юліусам. Яна, відаць, ужо прабачыла яму тое, што ён сказаў пра курыцу.

Потым Малы сядзеў скраю ложка і глядзеў, як Карлсан есць бутэрброды. Малы быў вельмі шчаслівы — так здорава, калі сябар побач! І Карлсан нарэшце таксама быў у гуморы.

— Добрыя бутэрброды, і ты добры, і Страхміструня таксама добрая, — сказаў ён. — Хаця яна не паверыла, што я найлепшы вучань у класе, — дадаў ён і спахмурнеў. Было бачна, што гэта ўсё яшчэ не дае яму спакою.

— Ды ну, — сказаў Малы. — Не пераймайся! Дзядзька Юліус хоча, каб я быў найлепшым у класе, але дзе мне!

— Ты не найлепшы, так, — сказаў Карлсан. — Але я мог бы навучыць цябе афыр... гэтай самай, як яе там.

— Арыфметыцы, — сказаў Малы. — *Ты* хочаш навучыць *мяне*?

— Так, бо я найлепшы ў свеце арыфметык.

Малы засмяяўся.

— Ну, давай праверым, — сказаў ён. — Хочаш?

Карлсан кіўнуў.

— Давай!

Тады Малы пачаў.

— Калі, напрыклад, мама дасць табе тры яблыкі...

— Дзякуй, давай іх сюды! — сказаў Карлсан.

— Не перапыняй, — сказаў Малы. — Калі мама дасць табе тры яблыкі, тата — два, Бусэ — два і я — адзін...

Далей ён сказаць не паспеў, бо Карлсан ушчувальна падняў палец.

— Я так і ведаў! — сказаў ён. — Я ведаў, што ты самы сквапны ў гэтай сям'і, і вось таму сведчанне.

— Ш-ш-ш, зараз мы не пра тое, — сказаў Малы, але Карлсан упарта працягваў:

— Мне было б прыемна, калі б ты даў мне цэлую торбу яблыкаў і яшчэ паклаў туды парачку грушак і некалькі такіх смачных жоўтых слівак, ну, ты ведаеш якіх!

— Не сварыся, Карлсан, — сказаў Малы. — Гэта ўсяго толькі арыфметыка... Адзін яблык табе дае мама...

— Стоп! — сярдзіта крыкнуў Карлсан. — Я на такое не згодны. Куды яна падзела яшчэ два яблыкі, якія я толькі што ад яе атрымаў?

Малы ўздыхнуў.

— Мілы Карлсан, яблыкі — гэта ж толькі дзеля прыкладу. Гэта каб ты зразумеў, што я табе тлумачу.

Карлсан чмыхнуў.

— Ды разумею я твае тлумачэнні. Атрымліваецца так, што варта пакінуць тваю маму без нагляду, як яна пачынае грызці мае яблыкі.

— Не сварыся, Карлсан, — паўтарыў Малы. — Калі мама дасць табе тры яблыкі...

Карлсан задаволена кіўнуў.

— Вось так! Зробіш заўвагу — і ўсё як мае быць. Я гэта ведаў. Толькі цяпер пастарайся не блытаць! Тры яблыкі мне дае твая мама, два — тата, два — Бусэ, тры — Бэтан, а яшчэ адзін — ты, бо ты самы сквапны...

— Так, і колькі ў цябе тады яблыкаў? — спытаў Малы.

— А ты як лічыш? — спытаў Карлсан.

— Я не лічу, бо я ўжо ведаю, — запэўніў Малы.

— Дык скажы тады, — прапанаваў Карлсан.

— Не, сказаць павінен ты сам, разумееш?

— Чакай, ага! Скажы сам! Іду ў заклад, што твой адказ няправільны.

— А вось і правільны, — запярэчыў Малы. — У цябе будзе адзінаццаць яблыкаў.

— Гэта ты так думаеш, — сказаў Карлсан. — А вось і не адгадаў! Бо я нацягаў дваццаць шэсць яблыкаў у адным садзе на Лідзінгёне заўчора ўвечары, і з іх у мяне засталіся тры і яшчэ адзін крыху надкусаны, — што цяпер скажаш?

Малы спачатку нават не ведаў, што адказаць. Але потым ён успомніў.

— Ха-ха, усё ты схлусіў! — сказаў ён. — У чэрвені яблыкі яшчэ не растуць!

— Вось як? — сказаў Карлсан. — А дзе ж вы самі тады сцягнулі свае яблыкі?

Тады Малы махнуў рукой і вырашыў болей Карлсана не вучыць.

— Ну, цяпер ты прынамсі ведаеш, што такое арыфметыка, — сказаў ён.

— Гэта тое самае, што цягаць яблыкі! Думаеш, я і так не ведаў? — запярэчыў Карлсан. — Гэтаму мяне вучыць не трэба, я і без цябе ўмею. Я найлепшы ў свеце яблычны арыфметык, і калі буду мець вольны час, вазьму цябе з сабой на Лідзінгён ды пакажу, як гэта робіцца.

Карлсан засунуў у рот апошні кавалак бутэрброда, і яны пачалі бойку падушкамі. Але атрымалася не дужа гладка, бо калі Карлсан пляснуў Малога падушкай па галаве, Бімба пачаў шалёна брахаць.

— Гаў! — азваўся Бімба і ўчапіўся зубамі ў падушку. Бімба і Карлсан тузалі яе, ажно пакуль яна не парвалася. Тады Карлсан падкінуў падушку пад столь, пух вылецеў з яе і пачаў павольна апускацца на Малога, які ляжаў на канапе і смяяўся.

— Па-мойму, ідзе снег, — сказаў Карлсан. — Ага які снегапад! — усклікнуў ён і яшчэ раз падкінуў падушку. Але тады Малы сказаў, што бойку падушкамі трэба заканчваць і класціся спаць. Было позна, і яны чулі, як у вітальні дзядзька Юліус пажадаў фрэкен Бок добрай ночы.

Карлсан раптам зрабіўся на дзіва вясёлы.

— Хой, хой, — сказаў ён. — А я нешта забаўнае прыдумаў!

— І што гэта? — пацікавіўся Малы.

— Нешта забаўнае, што трэба зрабіць, калі застаешся ў каго-небудзь начаваць, — сказаў Карлсан.

— «Прасціна-кішэнь»? Ужо занадта позна, ты ж не думаеш рабіць гэта зараз?

— Не, ужо занадта позна, — сказаў Карлсан.

— Ну так, — задаволена сказаў Малы.

— Таму рабіць «прасціну-кішэнь» я не буду, — сказаў Карлсан.

— Выдатна, — сказаў Малы.

— Бо я ўжо яе зрабіў, — сказаў Карлсан.

Малы агаломшана сеў.

— І каму ты... ты ж не дзядзьку Юліусу зрабіў «прасціну-кішэнь»?

Карлсан пырснуў смехам.

— Адкуль ты такі кемлівы? І *як* гэта ты здагадаўся?

Пасля бою падушкамі Малы быў у такім смяшлівым настроі, што толькі захіхікаў на гэта, хоць і ведаў, што не мусіць.

— О, як раззлуецца дзядзька Юліус! — сказаў ён.

— Так, і я хачу на гэта паглядзець, — сказаў Карлсан. — Таму я збіраюся вылецець ненадоўга і зазірнуць у акно спальні.

Тады Малы перастаў хіхікаць.

— Нізашто! А раптам ён цябе ўбачыць? Ён падумае, што ты той самы шпіён, і тады ўяві сабе, што будзе.

Але Карлсан упарціўся. Калі ўжо зрабіў «прасціну-кішэнь», дык мусіш убачыць, наколькі раззлуецца той, з каго так пажартавалі, інакш у жарце ніякага сэнсу, запэўніў ён.

— Дарэчы, я ж магу схавацца за парасонам!

Карлсан прыцягнуў з калідора мамін чырвоны парасон, бо дождж усё яшчэ ліў.

— Я не хачу прамачыць піжаму Бусэ, — сказаў Карлсан.

Ён стаў у расчыненым акне з раскрытым парасонам, гатовы ляцець. Малога гэта прывяло ў такі жах, што ён умольна папрасіў:

— Асцярожна, прашу, асцярожна! Глядзі, каб ён не заўважыў цябе, бо тады канец!

— Спакойна, толькі спакойна, — сказаў Карлсан і вылецеў у дождж.

Малы застаўся адзін, але яму было зусім не спакойна, а, наадварот, так трывожна, што ён кусаў сабе пальцы.

Хвіліны ішлі, дождж ліў, Малы чакаў.

Тут раптам ён пачуў са спальні немы крык дзядзькі Юліуса, які клікаў на дапамогу. І адразу ў акно заляцеў Карлсан. Задаволена пасмейваючыся, ён спыніў матор і паставіў парасон на дыван, каб сцякала вада.

— Ён цябе бачыў? — усхвалявана спытаў Малы. — Ён ужо лёг у ложак?

— Акурат спрабуе легчы, — сказаў Карлсан.

Тут ізноў пачуўся крык дзядзькі Юліуса.

— Я пайду пагляджу, што з ім такое, — сказаў Малы і кінуўся ў спальню.

Дзядзька Юліус сядзеў, заблытаны ў прасцінах, ягоны твар быў белы, а вочы жахліва вырачаныя. На падлозе бязладнай кучай валяліся падушкі і коўдры.

— Я не цябе клікаў, — сказаў дзядзька Юліус, убачыўшы Малога. — Гукні сюды фрэкен Бок!

Але фрэкен Бок, відаць, таксама чула ягоны крык, бо якраз прыбегла з кухні і застыла на парозе.

— Святыя ўгоднікі, — сказала яна. — Вы перасцілаеце пасцель, спадар Янсан?

— Не, — сказаў дзядзька Юліус, — хаця гэты ваш новы спосаб слаць пасцель мне зусім не падабаецца... Але я не магу цяпер пра гэта думаць.

Ён ціха застагнаў і замоўк. Тады фрэкен Бок падышла да яго цяжкімі крокамі і паклала далонь яму на лоб.

— Вы не захварэлі, спадар Янсан?

— Захварэў, — цяжка вымавіў дзядзька Юліус. — Я захварэў, *няйначай*... Выйдзі адсюль, — сказаў ён Малому.

І Малы выйшаў. Але застаўся каля дзвярэй, бо вельмі хацеў паслухаць працяг.

— Я разумны цвярозы чалавек, — сказаў дзядзька Юліус. — Ні газеты, ні хто іншы не могуць прымусіць мяне паверыць у розныя глупствы... Так што, няйначай, я захварэў.

— І што з вамі такое? — пацікавілася фрэкен Бок.

— У мяне відзежы... ліхаманкавыя відзежы, — сказаў дзядзька Юліус. Потым ён панізіў голас, так што Малы ледзьве мог разабраць, што ён кажа.

— Я не хачу, каб вы пра гэта каму-небудзь расказвалі, фрэкен Бок, — прашаптаў дзядзька Юліус. — Але рэч у тым, што я пабачыў духа сноў.

Карлсан займаецца булачкавым і аладкавым надзаляннем

Калі наступнай раніцай Малы прачнуўся, Карлсана не было. Піжама Бусэ валялася на падлозе, акно было адчыненае. Малы зразумеў, што Карлсан паляцеў дадому. Без яго пакой здаваўся пустым, але, з іншага боку, было добра, што Карлсана няма. Фрэкен Бок не будзе чаго сварыцца. Яна нават не даведаецца, што Карлсан начаваў у Малога. І ўсё адно было дзіўна, якім ціхім, сумным і шэрым усё робіцца, як толькі Карлсан адлятае. Хоць з ім часам і цяжка, усё адно Малы без яго сумуе. І цяпер яму захацелася перадаць Карлсану маленькае прывітанне.

Таму ён падышоў да акна і тройчы пацягнуў за шнурок, хітра схаваны за фіранкамі. Гэта быў званок, які правёў Карлсан, каб Малы мог дасылаць яму

сігналы. Калі пацягнуць за шнурок, то ў Карлсана наверсе зазвініць званочак. Карлсан сам вырашыў, што будуць азначаць сігналы.

— Калі ты пазвоніш адзін раз, гэта значыць «Прылятай», — сказаў Карлсан. — Два разы азначае «Не прылятай ні ў якім разе», а тры разы значыць «Як здорава, што ў свеце ёсць нехта такі прыгожы, спрэс разумны, узорна тоўсты, мужны і добры ва ўсіх сэнсах, як ты, мілы Карлсан!»

Вось акурат гэта апошняе Малы хацеў сказаць Карлсану. Таму ён пацягнуў за шнурок тры разы і пачуў, як наверсе зазвінеў званочак. А потым пачуў адказ. Высока на даху бахнуў стрэл з пісталета, а потым, хоць далёка і слаба, пачулася, як Карлсан спявае «Трэба, каб бабахала, каб весела было!»

— Не, Карлсан, не, Карлсан, — прашаптаў Малы. Дурненькі, чаго ён там шуміць і страляе! Яго ж лёгка заўважаць Філе і Руле ці яшчэ хто-небудзь, злапаюць і прададуць газеце за дзесяць тысяч крон!

— Але тады хай ужо на сябе наракае, — сказаў Малы Бімба, які ляжаў у сваім кошыку з такім выглядам, нібыта ўсё-ўсё разумее. Малы надзеў кашулю і штаны і пагуляў крыху з Бімбам, чакаючы, пакуль у доме ўсе прачнуцца.

Дзядзька Юліус, відаць, яшчэ не ўставаў, прынамсі, са спальні не было чуваць ані гуку. Затое з кухні

неўзабаве пачуўся водар свежазваранай кавы, і Малы пайшоў паглядзець, чым там займаецца фрэкен Бок.

Яна сядзела ва ўсёй сваёй мажнасці на крэсле за ранішнім кубачкам кавы і, як ні дзіўна, нават не запярэчыла, калі Малы ўсеўся за стол. Ніякай кашы ён не заўважыў, затое заўважыў свежыя булачкі: відаць, фрэкен Бок рана прачнулася, каб іх напячы. Два споды з цёплымі духмянымі булачкамі стаялі на пасудным століку, а яшчэ цэлая куча ляжала ў хлебным кошыку на стале. Малы ўзяў булачку і наліў сабе шклянку малака, а потым яны сядзелі разам з фрэкен Бок, елі і пілі ў цішыні, ажно пакуль тая не сказала:

— Цікава, як там Фрыда!

Малы задумліва паглядзеў на яе па-над шклянкай. Няўжо фрэкен Бок гэтак жа сумавала ў разлуцы па Фрыдзе, як ён па Карлсану?

— Вы сумуеце па Фрыдзе, фрэкен Бок? — ветліва спытаў ён.

Фрэкен Бок каротка і горка засмяялася.

— Гэ, ты не ведаеш Фрыды!

Насамрэч Фрыда Малога не цікавіла. Але ён бачыў, што фрэкен Бок хочацца пра яе пагаварыць, і таму спытаў:

— А хто жаніх Фрыды?

— Махляр! — адрэзала фрэкен Бок. — Так, я ведаю, што ён махляр, бо ён выцягвае з яе грошы, я гэта заўважыла.

Фрэкен Бок ад адной думкі пра гэта заскрыгатала зубамі і пачала вывальваць Малому ўсё. Небарака, ёй зусім няма з кім паразмаўляць, падумаў Малы, калі яна захацела расказаць пра Фрыду такому хлопчыку, як ён. А расказаць ёй хацелася шмат. Малому давялося сядзець і слухаць усё-ўсё пра тую Фрыду і яе Філіпа ды пра тое, якой недарэкай яна зрабілася, калі Філіп убіў ёй у галаву, што ў яе прыгожыя вочы і проста неверагодна добранадзейны нос, на які можна паспадзявацца ў любой прыгодзе, — Філіп так і сказаў.

— Неверагодна добранадзейны нос, — чмыхнула фрэкен Бок, — ну што ж, вядома, калі нехта лічыць, што бульбіна сярэдніх памераў пасярод твару сведчыць пра добранадзейнасць, то…

— А сам Філіп як выглядае? — спытаў Малы, каб паказаць, што яму цікава.

— Пра гэта, дзякуй Богу, я не маю ніякага ўяўлення, — сказала фрэкен Бок. — Ты ж не думаеш, што Фрыда мне яго паказвае!

Кім Філіп працуе, фрэкен Бок таксама не ведала. Але ў яго, казала Фрыда, ёсць на працы таварыш, якога завуць Рудальфам.

— Ён быў бы мне добрай парай, сказала мне Фрыда, але ён, вядома, ніколі мной не зацікавіцца, бо я страшная — так яна і сказала… Не, няма ў мяне добранадзейнага носа, што зробіш! — зноў чмыхнула фрэкен Бок. Потым яна раптам падняласа і пайшла нешта ўзяць у калідоры. Як толькі яна пакінула кухню, у акно заляцеў Карлсан.

Малы не на жарт раззлаваўся.

— Ты што, Карлсан, я ж *прасіў* цябе не лятаць на вачах у фрэкен Бок і дзядзькі Юліуса…

— Таму я і не лятаю на вачах у фрэкен Бок і дзядзькі Юліуса, — сказаў Карлсан. — Насамрэч я ім зусім не паказваюся, — дадаў ён і залез пад

стол. Там ён і засеў, добра схаваны абрусам, які нізка звісаў.

Фрэкен Бок прынесла ваўняную кофту, наліла сабе яшчэ кавы, узяла чарговую булачку і пачала расказваць далей.

— Як я сказала... ніякім неверагодна добранадзейным носам-бульбінай пахваліцца я не магу.

Тады пачуўся голас — такі дзіўны, якім размаўляюць чэравамоўцы, так што нельга вызначыць, адкуль ён ідзе. І вось гэты голас сказаў:

— Не, твой нос больш нагадвае агурок з пупырышкамі.

Фрэкен Бок так уздрыгнула, што праліла каву, і падазрона паглядзела на Малога.

— Гэта ты, сарамотнік?

Малы пачырванеў і не ведаў, што яму адказаць.

— Не, — няўпэўнена сказаў ён, — па-мойму, гэта перадача пра агарод ідзе па радыё, пра памідоры, агуркі і ўсякае такое.

Ён здолеў выкруціцца, бо часам у іх на кухні насамрэч было чуваць суседскае радыё, прычым фрэкен Бок і сама скардзілася на гэта. Яна крыху пабурчала, але цяпер ёй трэба было думаць пра іншае, бо ў кухню прыйшоў дзядзька Юліус, які таксама захацеў кавы.

Ён прашорхаў пару разоў вакол стала, стогнучы на кожным кроку.

— Што за ноч! — сказаў ён. — Святыя апосталы, што за ноч! Не, у мяне, вядома, і раней бывала напружанне ў целе, але з такім ложкам, з такой пасцеллю гэта проста невыносна!

Ён цяжка сеў за стол і ўперыўся перад сабою, быццам задумаўся пра штосьці асаблівае. Ён здаўся Малому зусім не падобным да сябе.

— І ўсё адно я рады і ўдзячны за такую ноч, — урэшце сказаў дзядзька Юліус. — Яна зрабіла мяне новым чалавекам.

— Вось і добранька, бо стары даўно прасіў замены.

Гэта зноў прагучаў той дзіўны голас. Фрэкен Бок, як і тады, уздрыгнула і падазрона паглядзела на Малога.

— Гэта ўсё радыё ў Ліндбергаў... Цяпер, напэўна, перадача пра старыя аўтамабілі, — прамармытаў Малы.

Дзядзька Юліус нічога не заўважыў. Ён так занурыўся ў свае думкі, што нічога не чуў і не бачыў. Фрэкен Бок паставіла перад ім каву, і ён безуважна працягнуў руку, каб узяць булачку. Але толькі ён гэта зрабіў, як іншая рука — маленькая і пульхная — высунулася з-пад стала і схапіла ягоную

булачку. Дзядзька Юліус і гэтага не заўважыў. Ён усё думаў і думаў, і толькі ўсунуўшы пальцы ў гарачую каву, ачуўся і зразумеў, што няма ніякай булачкі, каб акунуць яе туды. Ён крыху раззлаваўся і падзьмуў на пальцы, але потым ізноў паглыбіўся ў роздумы.

— Паміж небам і зямлёй ёсць болей, чым мы можам здагадвацца, вось што я зразумеў уначы, — сказаў ён сур'ёзна. У той жа час ён ізноў выцягнуў

руку і ўзяў новую булачку. Тады з-пад стала зноў вытыркнулася пульхная ручка і схапіла яе. Але дзядзька Юліус нічога не заўважыў, ён толькі думаў і думаў, ажно пакуль не засунуў у рот свой вялікі палец і добра яго не ўкусіў. Тады ён ізноў ненадоўга раззлаваўся, але гэты новы дзядзька Юліус, відаць, быў прыемнейшы за старога, бо хутка супакойваўся. Ён нават не спрабаваў болей узяць булачку, а проста піў сваю каву і думаў.

А булачак рабілася ўсё меней. Яны знікалі з кошыка адна за адной, і толькі Малы заўважаў, куды. Ён ціха хіхікнуў і асцярожна перадаў Карлсану пад стол шклянку з малаком, каб той не еў сухама.

Гэта тое, што Карлсан называў «булачкавым надзаляннем». Фрэкен Бок пакаштавала гэтага надзаляння, яшчэ калі была ў іх мінулым разам.

— Можна проста каласальна надзаляць народу, адно толькі з'ядаючы іхнія булачкі, — сказаў неяк Карлсан. Ён, вядома ж, ведаў, што правільна казаць «назаляць», але сцвярджаў, што «надзаляць» гучыць больш пагрозліва.

І вось цяпер Карлсан пачаў новае страшэннае булачкавае надзалянне, хаця фрэкен Бок гэтага пакуль не зразумела. І пагатоў дзядзька Юліус. Якое б страшнае гэтае булачкавае надзалянне ні было, ён яго не заўважаў, бо толькі думаў і думаў. Раптам

ён схапіў фрэкен Бок за руку і моцна сціснуў яе, нібыта просячы дапамогі.

— Я мушу з кімсьці пагаварыць пра гэта, — сказаў ён. — Я цяпер ведаю, фрэкен Бок, гэта было не трызненне, не начныя жахі — я *пабачыў* духа сноў!

Фрэкен Бок выпрачыла вочы.

— Хіба такое магчыма?

— Магчыма, — сказаў дзядзька Юліус. — І таму я цяпер новы чалавек і жыву ў новым свеце. У казачным свеце, разумееце, фрэкен Бок? Ён расчыніў перада мной свае дзверы гэтай ноччу. Бо калі ўжо дух сноў сапраўды існуе, дык чаму б не існаваць ведзьмам, тролям, прывідам, феям, гномам і ўсім іншым патаемнікам, пра якіх апавядаюць у казках?

— І лятучым шпіёнам таксама? — паспрабавала ўставіць фрэкен Бок, але дзядзьку Юліусу гэта не спадабалася.

— Лухта, — сказаў ён. — Ад газетных глупстваў трэба трымацца далей!

Ён нахіліўся да фрэкен Бок і ўважліва паглядзеў ёй у вочы.

— Запомніце адну рэч, — сказаў ён. — Нашыя продкі верылі ў троляў, гномаў, ведзьмаў і ўсялякае такое. Дык чаму мы думаем, нібы такіх патаемнікаў не існуе? Няўжо мы разумнейшыя за нашых продкаў? Каб жа! Толькі тугадумы могуць такое сцвярджаць.

Фрэкен Бок не хацела здацца тугадумам, таму заявіла, што, ясная рэч, ведзьмаў можа існаваць нават болей, чым можна сабе ўявіць, і тое самае датычыцца троляў ды іншых патаемнікаў — варта толькі добра паназіраць і ўважліва падлічыць іх.

Але тут дзядзьку Юліусу давялося спыніць развагі, бо ён мусіў ісці да лекара. Малы ветліва правёў яго ў калідор, фрэкен Бок таксама. Малы падаў яму кій, а фрэкен Бок дапамагла апрануць плашч. Бедны дзядзька Юліус здаваўся Малому і праўда стомленым. Добра, што ён ідзе да лекара, падумаў Малы і нясмела пагладзіў дзядзькаву руку. Фрэкен Бок, відаць, таксама непакоілася, бо заклапочана спытала:

— Як вы, спадар Янсан? Як сябе адчуваеце?

— Як я магу гэта ведаць, калі я яшчэ не схадзіў да лекара? — агрызнуўся дзядзька Юліус.

І Малы падумаў, што крышачку ад старога дзядзькі Юліуса ўсё ж засталося, нават калі казачны свет разнасцежыў перад ім свае дзверы.

Калі дзядзька Юліус сышоў, Малы і фрэкен Бок вярнуліся на кухню.

— А цяпер я хачу папіць яшчэ кавы з булачкамі і пабыць у спакоі, — сказала фрэкен Бок. Але тут жа ўскрыкнула. Бо на бляхах не засталося ніводнай булачкі, нават самай маленькай. Там ляжаў толькі

папяровы пакунак, на якім нехта напісаў страшнымі касабокімі літарамі.

ЗЦЯГНУЎ ЯЧШЭ НЕ КАЛКІ БУЛАЧАК ТРЭБА ПА ЧАСТАВАЦ УВЕС КАЗАЧНЫ СВЕТ

Дуг Сноў

Прачытаўшы цыдулку, фрэкен Бок нахмурыла бровы.

— Ніхто не прымусіць мяне паверыць, што дух сноў скраў булачкі, нават калі ён і праўда існуе. Ён занадта добры, каб такім займацца. Не, я ведаю, хто за гэтым стаіць!

— І хто? — спытаў Малы.

— Той брыдкі тоўсты хлопчык, вядома. Карлсан, ці як там яго завуць? Паглядзі, заднія дзверы ў кухню адчыненыя! Ён падслухоўваў за імі, а потым пратачыўся сюды, пакуль мы былі ў калідоры.

Яна сярдзіта затрэсла галавой.

— Дух сноў! Як міла! Перавальвае з хворай галавы на здаровую, а сам не ўмее нават пісаць як трэба!

Малы не хацеў працягваць гаворку пра Карлсана, таму проста сказаў:

— А я ўсё адно думаю, што гэта быў дух сноў! Хадзем, Бімба!

Штораніцы Малы і Бімба гулялі ў парку Васы, і для Бімба гэты шпацыр быў самай вясёлай падзеяй за дзень, бо яны сустракалі так шмат цудоўных сабак, з якімі можна паабнюхвацца ды паразмаўляць.

Малы звычайна гуляў там з Крыстэрам і Гунілай, але сёння іх не было бачна. Магчыма, яны ўжо з'ехалі ў вёску, падумаў Малы. Што ж, гэта не так і страшна, пакуль у яго ёсць Карлсан... і Бімба, вядома.

Нейкі вялікі сабака падбег і пачаў задзірацца з Бімба. Той таксама рваўся ў бойку. Бімба вельмі хацеў выказаць гэтаму дурному барбосу ўсё, што пра яго думае. Але Малы яму не даў.

— Нават не думай, — сказаў Малы. — Ты занадта маленькі, каб біцца з такім вялікім сабакам.

Ён узяў Бімба на рукі і агледзеўся ў пошуках свабоднай лаўкі, каб перачакаць, пакуль Бімба супакоіцца. Але паўсюль сядзелі людзі і грэліся пад промнямі сонейка. Толькі адышоўшыся даволі далёка, ён знайшоў у куточку парку вольнае месца на лаўцы. Там ужо, праўда, сядзелі два дзядзькі, і ў кожнага ў руцэ было па пляшцы піва. Малы пазнаў гэтых двух! Дакладна — гэта былі Філе і Руле. Спачатку Малы спалохаўся і памкнуўся збегчы. Але нешта прыцягвала яго да гэтай лаўкі. Яму

карцела даведацца, ці не кінулі Філе і Руле свайго намеру злапаць Карлсана. Можа быць, тут ён якраз усё высветліць? Ды і чаго яму баяцца? Філе і Руле ніколі яго не бачылі і не маглі пазнаць. І гэта добра, вельмі нават добра! Ён зможа сядзець каля іх колькі захоча. Акурат так героі прыгодніцкіх кніжак выведвалі розныя штукі: проста ціха сядзелі ды слухалі на ўсе вушы.

Так што Малы сеў на лаўку, навастрыў вушы і ўвесь час ціхенька размаўляў з Бімба, каб Філе і Руле не здагадаліся, што іх падслухоўваюць. Было не падобна, што ён пачуе нешта вартае ўвагі: Філе і Руле проста жлукцілі піва ды маўчалі. Урэшце Філе гучна адрыгнуўся і сказаў:

— Дык гэта, зловім мы яго, зловім. Мы ж ведаем, дзе ён жыве. Я сто разоў бачыў, як ён туды залятае.

Малы так перапалохаўся, што не мог дыхаць. Ён быў у адчаі: цяпер Карлсану дакладна канец! Філе і Руле знайшлі ягоны дамок на даху, і цяпер усё скончана!

Малы ўкусіў сябе за пальцы, стараючыся не заплакаць, але калі ён ужо гатовы быў сарвацца, Руле сказаў:

— Дык і я таксама бачыў шмат разоў, як ён туды залятае... Гэта ж тая кватэра, дзе мы былі

мінулым летам. Дванаццатая, на чацвёртым паверсе. Я праверыў, там вісіць шыльда «Свантэсаны».

Вочы Малога зрабіліся круглыя ад здзіўлення, ён вушам сваім не мог паверыць. Філе і Руле праўда думалі, што Карлсан *жыве* ў Свантэсанаў? Якая ўдача! Значыць, у сябе дома Карлсан можа пачувацца больш-менш бяспечна: Філе і Руле яго пакуль не знайшлі, і можна схавацца там! Дзіва што: ні Філе, ні Руле, ні яшчэ які чалавек, апрача хіба камінара, ніколі не выходзілі на дах.

Але нават калі Руле і Філе нічога не ведалі пра дамок Карлсана, усё адно гэта было жахліва. Бедны Карлсан: цяпер яны пачалі паляваць на яго па-сапраўднаму, а ён, вар'ят, нават не думае хавацца!

Філе і Руле зноў замаўчалі, але раптам Руле сказаў ціхім голасам — Малы яго ледзьве пачуў:

— Можа, гэтай ноччу?

Тады Філе нарэшце, відаць, заўважыў, што з імі на лаўцы сядзіць нехта яшчэ. Ён зірнуў на Малога і гучна адкерхаўся.

— Так, добра, сёння ўночы сходзім накапаць чарвякоў, — сказаў ён.

Але так лёгка Малога не падманеш! Ён выдатна зразумеў, што Філе і Руле задумалі зрабіць гэтай ноччу. Яны хочуць злавіць Карлсана, пакуль той будзе спаць, і яны лічаць, што спаць ён будзе дома ў Свантэсанаў.

«Мне трэба расказаць пра гэта Карлсану, — падумаў Малы. — І расказаць як мага хутчэй!»

Але Карлсан вярнуўся не раней, чым надышоў час абеду. Гэтым разам ён не заляцеў праз акно, а, як мае быць, пазваніў у званок дзвярэй. Малы адчыніў.

— О, як добра, што ты прыйшоў, — пачаў быў Малы, але Карлсан яго не слухаў. Ён адразу кінуўся на кухню да фрэкен Бок.

— Што ў нас сёння за духмельны ласунак? — спытаў ён. — Што-небудзь жорсткае, як звычайна, ці нешта прыдатнае для нармальных іклаў?

Фрэкен Бок стаяла каля пліты і смажыла аладкі, каб пачаставаць дзядзьку Юліуса чым-небудзь мякчэйшым за курыцу. Пачуўшы за спінай голас Карлсана, яна падскочыла і разліла лыжку цеста на пліту. Фрэкен Бок раззлавана азірнулася.

— Ах ты! — крыкнула яна. — Ах ты... ніякага сораму не маеш! І як ты насмеліўся тут паказвацца і глядзець мне ў твар, брыдкі выкрадальнік булачак?

Карлсан прыклаў да вачэй пульхныя далонькі і хітравата паглядзеў паміж пальцаў.

— Вось неяк так насмеліўся — асцярожненька, — адказаў ён. — Ты, вядома, не самая прыгожая ў свеце, але з усім звыкаешся. Галоўнае, што ты добрая... Давай сюды аладкі!

Фрэкен Бок раз'юшана паглядзела на яго, а потым павярнулася да Малога.

— Слухай, а твая мама хіба казала, што мы павінны карміць гэтага брыдкага хлопчыка? Ён праўда мусіць есці тут у нас?

Малы, як звычайна, пачаў запінацца.

— Мама, у любым разе, лічыць... што Карлсан...

— Адказвай — так або не, — сказала фрэкен Бок. — Твая мама казала, што мы мусім карміць Карлсана?

— Яна, у любым разе, хоча, каб ён... — паспрабаваў Малы зноў, але фрэкен Бок жорстка яго абарвала:

— Адказвай — так або не! Няўжо так складана адказаць «так» ці «не» на простае пытанне?

— А ты думаеш, не складана? — умяшаўся Карлсан. — Я задам табе простае пытанне, і пабачыш сама. Вось слухай! Ты перастала піць каньяк уранку? Адказвай — так або не!

Фрэкен Бок схапіла ротам паветра і ледзьве не задыхнулася. Яна хацела нешта сказаць, але не магла.

— Ну дык што? — паўтарыў Карлсан. — Ты перастала піць каньяк уранку?

— Так, яна перастала! — горача сказаў Малы. Ён вельмі хацеў дапамагчы фрэкен Бок, але толькі больш раз'юшыў яе.

— Вядома, я *не* перастала! — сярдзіта крыкнула яна, напалохаўшы Малога да паўсмерці.

— Ой, не, не, яна не перастала! — запэўніў ён.

— Прыкра гэта чуць, — сказаў Карлсан. — Выпіўка прыводзіць да вялікіх праблем.

Фрэкен Бок усхліпнула і апусцілася на крэсла. Затое Малы нарэшце знайшоў правільны адказ.

— Яна не *перастала*, бо ніколі і не *пачынала*, ясна табе? — упікнуў ён Карлсана.

— А я хіба такое казаў? — спытаў Карлсан і павярнуўся да фрэкен Бок. — Дурненькая, бачыш цяпер, што немагчыма ўвесь час адказваць толькі «так» або «не»... Давай сюды аладкі!

Вось ужо што фрэкен Бок рабіць не збіралася, дык гэта частаваць Карлсана аладкамі. Яна з рыкам ускочыла і расчыніла заднія дзверы.

— Прэч, — сказала яна. — Прэч!

І Карлсан пайшоў. Ён пасунуўся да дзвярэй вельмі напышліва.

— Я сыходжу, — сказаў ён. — Я сыходжу з радасцю. Ёсць і іншыя, акрамя цябе, хто ўмее пячы аладкі!

Калі Карлсан знік, фрэкен Бок доўга сядзела моўчкі і проста адпачывала. Але потым трывожна зірнула на гадзіннік.

— І дзе твайго дзядзьку Юліуса носіць? — сказала яна. — А раптам ён заблукаў! Ён жа, мабыць, не дужа добра ведае Стакгольм.

Малы таксама пачаў непакоіцца.

— І праўда, а раптам ён не знойдзе дарогу дадому?

Якраз тут зазваніў тэлефон у калідоры.

— Мабыць, гэта дзядзька Юліус, — сказаў Малы, — тэлефануе сказаць, што заблукаў.

Фрэкен Бок пайшла адказваць, і Малы за ёй следам. Але ён адразу зразумеў, што тэлефануе не дзядзька Юліус, бо пачуў, як фрэкен Бок кажа самым раз'юшаным сваім голасам:

— А, гэта ты, Фрыда? Як пачуваешся, нос яшчэ на месцы?

Малы не хацеў слухаць чужыя размовы і таму пайшоў да сябе ды сеў чытаць, але ўсё адно яму было чутнае мармытанне з вітальні, і гэтае мармытанне працягвалася хвілін дзесяць, не меней.

Малы згаладаўся. Ён хацеў, каб гэтае мармытанне скончылася, каб дзядзька Юліус прыйшоў дадому

і каб яны ўсе нарэшце паелі. Як толькі фрэкен Бок паклала слухаўку, ён выбег у вітальню, каб сказаць ёй пра гэта.

— Ну добра, зараз паясі, — велікадушна дазволіла фрэкен Бок і павяла яго ў кухню. Але на парозе рэзка спынілася. Яе мажнае цела запоўніла ўвесь праход, і Малы нічога не бачыў. Ён толькі чуў яе раззлаваны крык і, калі цікаўна высунуў галаву з-за яе спадніцы, каб высветліць, чаго яна крычыць, убачыў Карлсана. Той сядзеў за сталом ды спакойна і з задавальненнем умінаў аладкі. Малы спалохаўся, што фрэкен Бок заб'е Карлсана, бо выглядала на тое. Але яна толькі ўварвалася ў кухню і вырвала з-пад носа Карлсана спод з аладкамі.

— Ах ты... Ах ты... Ах ты жахлівы хлопчык! — крыкнула яна. Тады Карлсан ляпнуў яе па пальцах і сказаў:

— Вярні мае аладкі. Я іх сумленна купіў у Ліндбергаў за пяць эрэ!

Ён разявіў рот і загрузіў туды ладную порцыю аладак.

— Як я і казаў, ёсць і іншыя, хто ўмее пячы аладкі. Трэба толькі рухацца на пах, і хутка іх знойдзеш.

Малому было амаль шкада фрэкен Бок, бо яна зусім разгубілася.

— Дзе… дзе… дзе ж тады *мае* аладкі? — спыталa яна запінаючыся і паглядзела на пліту. Там стаяў яе спод, але аладак на ім было роўна нуль. Гэтае відовішча раз'юшыла яе зноў.

— Нахабнае дзіцё! — крыкнула яна. — Ты і мае аладкі з'еў!

— Якраз не, — абурыўся Карлсан. — Але табе абы ўсё на мяне павесіць.

Тут пачуліся крокі па сходах. Нарэшце гэта быў дзядзька Юліус, цяпер ужо дакладна. Малы быў рады і таму, што сварка спыніцца, і таму, што дзядзька Юліус не заблукаў у гарадскім тлуме.

— Як здорава! — сказаў Малы. — Значыць, ён усё ж знайшоў дарогу дадому!

— А ўсё дзякуючы знакам, якія яго прывялі, — сказаў Карлсан. — Без іх ён ніколі б назад не трапіў!

— Якім знакам? — пацікавіўся Малы.

— Маім, — сказаў Карлсан. — Я ж самы добры ў свеце!

Але тут у дзверы пазванілі, фрэкен Бок паспяшалася адчыніць іх, а Малы выйшаў следам, каб сустрэць дзядзьку Юліуса.

— Калі ласка ў хату, спадар Янсан, — сказала фрэкен Бок.

— Мы думалі, можа, ты заблукаў, — сказаў Малы.

Але дзядзька Юліус нікому з іх не адказаў.

— Як так атрымалася, — спытаў ён строга, — што на кожнай дзвярной ручцы ва ўсім пад'ездзе вісіць па аладцы?

Ён з дакорам паглядзеў на Малога, і той спалохана забубніў:

— Мабыць, дух сноў...

Але потым ён рэзка павярнуўся і кінуўся ў кухню, каб сказаць Карлсану пару ласкавых слоўцаў.

Карлсана ў кухні не было. Там стаялі толькі два пустыя споды з-пад аладак, а на стале, там, дзе сядзеў Карлсан, красавалася самотная кропелька варэння.

Дзядзька Юліус, Малы і фрэкен Бок елі на абед крывянку. Гэта таксама было даволі смачна.

Малому давялося спешна збегаць па яе ў малочную краму. Ён не пярэчыў, калі фрэкен Бок выправіла яго туды, бо вельмі хацеў пабачыць дзвярныя ручкі з аладкамі.

Але ніякіх аладак там не было. Малы прабег па сходах і праверыў усе-ўсе дзверы, але не знайшоў аніводнай аладачкі і амаль падумаў быў, што дзядзьку Юліусу ўсё прымроілася. Але потым ён спусціўся ўніз — там на апошняй прыступцы сядзеў Карлсан. Ён еў аладкі.

— Смаката! — сказаў ён. — Цяпер нашаму Казачніку Юле знакі не трэба, цяпер ён дарогу ведае.

Потым ён чмыхнуў.

— А Страхмістрыня — несправядлівая! Сказала, што я з'еў яе аладкі, хаця я бязвінны, нібы ягнятка. Калі так, дык і праўда іх з'ем!

Малы засмяяўся.

— Ты найлепшы ў свеце паядальнік аладак, Карлсан! — сказаў ён.

Але потым ён успомніў нешта і адразу пасур'ёзнеў. Малы згадаў пра тое жахлівае, што пачуў ад Філе ды Руле. Цяпер ён нарэшце мог расказаць пра гэта Карлсану.

— Думаю, яны збіраюцца паспрабаваць злавіць цябе гэтай ноччу, — занепакоена сказаў Малы. — Ты разумееш, што гэта значыць?

Карлсан аблізаў тлустыя ад аладак пальцы і задаволена правуркатаў:

— Гэта значыць, што ў нас будзе вясёлая ночка. Хой, хой! Хой, хой!

Карлсан — найлепшы ў свеце даследчык храпу

Пакрысе надышоў вечар. Цэлы дзень Карлсан не паказваўся. Напэўна, ён хацеў, каб Страхмістрыня як след адпачыла пасля такога аладкавага надзаляння. Малы схадзіў з дзядзькам Юліусам у музей чыгункі. Абодвум там спадабалася. А потым яны вярнуліся дадому і павячэралі з фрэкен Бок. Усё было ціха і мірна — нідзе ніякага Карлсана. Але калі Малы прыйшоў пасля вячэры ў свой пакой, Карлсан быў там.

Малы, шчыра кажучы, быў зусім не рады яго бачыць.

— Ой, які ты неасцярожны, — сказаў ён. — Чаму ты цяпер прыляцеў?

— Што за дурное пытанне, — сказаў Карлсан. — Бо я буду ў цябе начаваць, няўжо не зразумела!

Малы ўздыхнуў. Ён увесь дзень хадзіў з трывогай у душы і разважаў, як Карлсану не трапіцца ў лапы Філе і Руле. О, колькі ён усяго перадумаў! Можа, патэлефанаваць у паліцыю? Не, бо тады трэба тлумачыць, чаму Філе і Руле захацелі выкрасці Карлсана, а гэтага расказваць нельга. Папрасіць дапамогі ў дзядзькі Юліуса? Не, бо тады *ён сам* адразу патэлефануе ў паліцыю, і тады ўсё адно давядзецца тлумачыць, чаму Філе і Руле хочуць выкрасці Карлсана, так што гэты варыянт таксама кепскі.

Карлсан, па ўсім відаць, не марнаваў часу на такія роздумы і зусім не пераймаўся. Ён спакойна разглядаў персікавую костачку, правяраючы, наколькі тая вырасла. Але Малы быў сам не свой.

— Я нават не ведаю, што нам рабіць, — сказаў ён.

— Ты пра Філе і Руле? — удакладніў Карлсан. — Я ведаю. Як я ўжо казаў, ёсць тры спосабы — надзаляць, хітраваць і фігураваць, і я збіраюся ўжыць усе тры.

Малому больш даспадобы быў чацвёрты спосаб — каб Карлсан застаўся гэтай ноччу ў сябе дома, зашыўся пад коўдру і ляжаў там ціха, як мышка. Але Карлсан сказаў, што з усіх бязглуздых спосабаў гэта самы бязглузды, пра які яму даводзілася чуць.

Малы ўсё адно не хацеў здавацца. Дзядзька Юліус набыў яму кулёк карамелек. Магчыма, Карлсан

паквапіцца на іх? Малы спакусліва пагайдаў кульком перад носам Карлсана і хітравата сказаў:

— Я дам табе ўвесь гэты кулёк, калі паляціш да сябе і ляжаш спаць!

Але Карлсан адштурхнуў руку Малога.

— Фу, які ты жахлівы, — сказаў ён. — Пакінь сабе свае няшчасныя карамелькі! Не вельмі яны мне патрэбныя!

Ён закапыліў губу, адышоўся і сеў на зэдлік у самым дальнім кутку.

— Я з табой не гуляю, калі ты такі жахлівы, — сказаў ён. — Я проста не гуляю!

Малы быў у роспачы. Найгоршае, што ён ведаў, — гэта Карлсанава «не гуляю». Малы хуценька папрасіў прабачэння і паспрабаваў рознымі спосабамі залагодзіць Карлсана, але нічога не выходзіла. Карлсан працягваў дзьмуцца.

— Ну, я тады ўжо і не ведаю, што для цябе зрабіць, — урэшце сказаў Малы.

— Затое ведаю я, — сказаў Карлсан. — Гэта недакладна, але, можа быць, я зноў буду з табой гуляць, калі атрымаю якую-небудзь дробязь... Хай сабе нават гэты кулёк з карамелькамі!

Тады Малы аддаў яму кулёк, і Карлсан зноў пачаў з ім гуляць. І рабіць гэта ён збіраўся ўсю ноч.

— Хой, хой! — сказаў ён. — Ты не ўяўляеш, як мы з табой пагуляем!

Паколькі Карлсан пастанавіў начаваць у Малога, той падумаў, што давядзецца зноў паслаць сабе на канапе. Але толькі ён узяўся за гэта, як Карлсан яго спыніў. Няма сэнсу, сказаў ён. Гэтай ноччу будзе не да сну!

— Хаця, спадзяюся, Страхмістрыня і Казачнік Юле адключацца хутка, бо нам трэба будзе паштукаваць, — сказаў Карлсан.

Дзядзька Юліус і праўда паклаўся рана. Ён, пэўна, стаміўся пасля трывожнай ночы і дзённага клопату. Фрэкен Бок, падобна, таксама хацела выспацца пасля цяжкага булачкавага ды аладкавага надзяляння. Яна хутка знікла ў сваім пакоі — насамрэч, вядома, гэта быў пакой Бэтан. Мама часова пасяліла там фрэкен Бок.

Перад тым яны абодва зайшлі пажадаць Малому добрай ночы, але Карлсан тады сядзеў у шафе. Ён сам разумеў, што так будзе разумней за ўсё.

Дзядзька Юліус пазяхнуў.

— Спадзяюся, дух сноў хутка прыляціць і мы мірна заснём пад яго чырвоным парасонам, — сказаў ён.

«Анягож, асабліва ты», — падумаў Малы, але ўголас сказаў:

— Дабранач, дзядзька Юліус, прыемных сноў! Дабранач, фрэкен Бок!

І яны пайшлі.

Малы распрануўся і нацягнуў на сябе піжаму. Так будзе найлепей, вырашыў ён, калі фрэкен Бок або дзядзька Юліус ускочаць пасярод ночы і ўбачаць яго.

Малы і Карлсан рэзаліся ў п'яніцу і чакалі, пакуль заснуць дзядзька Юліус і фрэкен Бок. Карлсан страшэнна махляваў і хацеў выйграваць увесь час, а іначай ён не гуляе. Малы не пярэчыў. Калі,

нягледзячы на гэта, у адным туры Карлсан пачаў прайграваць, то згроб карты ў кучу і сказаў:

— Годзе гуляцца, трэба пачынаць штукаваць!

Дзядзька Юліус і фрэкен Бок ужо заснулі — дапамога духа сноў з ягоным парасонам не спатрэбілася. Нейкі час Карлсан забаўляўся тым, што бегаў ад адных дзвярэй да другіх і параўноўваў храп.

— Адгадай, хто найлепшы ў свеце даследчык храпу? — бадзёра сказаў ён, а потым паказаў Малому, як храпуць дзядзька Юліус і фрэкен Бок.

— «Хр-р-р-р-пі-пі-пі» — такі гук выдае Казачнік Юле. А Страхмістрыня храпе вось так: «Хр-р-р-р-аш, хр-р-р-р-аш!»

Потым думкі Карлсана пераключыліся на іншае. У яго заставалася яшчэ куча карамелек, хаця ён пачаставаў адной Малога і сам з'еў дзясятак. Ён сказаў, што цяпер яму трэба дзесьці схаваць кулёк, каб рукі былі свабодныя, калі ён пачне штукаваць. І хованка мусіць быць вельмі надзейная.

— Усё ж такі прыйдуць зладзеі, — сказаў ён. — У вас дома няма якога-небудзь сейфа?

Малы сказаў, што калі б быў, дык ён бы найперш схаваў там Карлсана, але сейфа, на жаль, няма.

Карлсан задумаўся.

— Я пакіну кулёк у Казачніка Юле, — сказаў ён. — Бо калі зладзеі пачуюць «хр-р-р-р-пі-пі-пі», яны падумаюць, што гэта тыгр, і збаяцца туды зайсці.

Ён ціха адчыніў дзверы ў спальню, «хр-р-р-р-пі-пі-пі» пачулася яшчэ мацней. Карлсан задаволена хіхікнуў і знік унутры з кульком. Малы застаўся чакаць. Неўзабаве Карлсан вярнуўся. Без кулька. Затое з зубамі дзядзькі Юліуса ў кулаку.

— Ты што, Карлсан! — сказаў Малы. — Навошта ты ўзяў іх?

— Ты ж не думаеш, што я пакіну свае карамелькі на захаванне чалавеку, які мае зубы? А раптам Казачнік Юле прачнецца пасярод ночы і ўбачыць кулёк! Калі ў яго пад рукой будуць зубы, ён адразу схрабусціць усе карамелькі. Але цяпер, на шчасце, зубоў пад рукой у яго няма.

— Дзядзька Юліус нізашто не з'еў бы твае карамелькі, — запэўніў Малы. — Ён нізашто не ўзяў бы нават адной чужой цукеркі.

— Дурында, ён можа падумаць, што нейкая фея з казачнага свету прынесла яму гэты кулёк, — сказаў Карлсан.

— Нічога ён не падумае, бо ён сам купіў гэтыя карамелькі, — запярэчыў Малы, але Карлсан не хацеў нічога слухаць.

— І ўвогуле, гэтыя зубы мне патрэбныя, — сказаў ён і дадаў, што яму таксама патрэбны моцны шнурок.

Малы збегаў на кухню і дастаў з каморы вяроўку для бялізны.

— Навошта яна табе? — пацікавіўся Малы.

— Буду рабіць пастку на зладзеяў, — сказаў Карлсан. — Жахлівую, страшэнную, смяротную пастку на зладзеяў!

Ён паказаў, дзе збіраецца яе паставіць — там, дзе вузкі калідорчык пераходзіць у вітальню.

— Вось тут, — сказаў Карлсан.

У вітальні абапал праходу стаялі два важкія крэслы, і Карлсан пачаў рабіць сваю простую, але хітрую пастку.

Ён прывязаў вяроўку да трывалых ножак крэслаў перад самым праходам у калідор — нізка, амаль каля самай падлогі. Любы, хто пасунуўся б цёмначы з калідора ў вітальню, спатыкнуўся б аб тую вяроўку.

Малы памятаў, як летась Філе і Руле хацелі абрабаваць іхнюю кватэру. Яны тады прасунулі ў адтуліну для пошты стальны дрот і адамкнулі ім замок. Напэўна, і цяпер яны хочуць зрабіць тое самае, таму будзе справядліва, калі яны грымнуцца, спатыкнуўшыся аб вяроўку.

Малы ціха захіхікаў, а потым узгадаў нешта і ўсцешыўся яшчэ больш.

— А я ж дарэмна хваляваўся, — сказаў ён. — Бімба пачне брахаць, і ўсе прачнуцца, а Філе і Руле тады збягуць.

Карлсан утаропіўся ў яго, нібыта не верыў сваім вушам.

— Выходзіць, — сказаў ён строга, — выходзіць, я марна рабіў сваю пастку? І ты думаеш, я пагаджуся

на гэта, так? Ні ў якім разе! Сабаку трэба прыбраць, і кропка!

Малы вельмі раззлаваўся.

— Гэта як? Куды я яго падзену, па-твойму?

Тады Карлсан сказаў, што Бімба можа заначаваць у яго наверсе. Ён прыстроіць яго на кухоннай канапе, і хай сапе ў дзве дзюрачкі, пакуль Карлсан будзе заняты хітраваннем. А калі раніцай Бімба вылезе з пасцелі, то Карлсан яму наваліць цэлую гару фаршу, і няхай Малы прыслухаецца да голасу розуму.

Але да такога голасу розуму Малы прыслухоўвацца не хацеў. Ён лічыў, што несправядліва выстаўляць сабаку з дома. Да таго ж сапраўды добра, калі Філе і Руле спалохаюцца ягонага брэху.

— Давай, псуй усё, псуй, — з прыкрасцю сказаў Карлсан. — Ты ніколі не даеш мне пазабаўляцца, дзе ўжо! Толькі замінаеш, каб я не мог нармальна надзаляць, хітраваць і фігураваць. Давай, псуй мне ўсё зноў! Галоўнае, каб твой цюцька змог набрахацца і паставіць на вушы ўвесь дом.

— Ты ж сам разумееш, — пачаў быў Малы, але Карлсан абарваў яго.

— Я з табой не гуляю! Шукай сабе якога іншага хітруна дзе хочаш, а я цяпер з табой не гуляю!

Бімба раздражнёна загырчаў, калі Малы выцягнуў яго з кошыка, дзе ён толькі што заснуў. Апошняе,

што Малы ўбачыў, калі Карлсан падняўся з Бімба ў паветра, — гэта пара вялікіх здзіўленых вачэй.

— Не бойся, Бімба! Хутка я прыйду і забяру цябе! — крыкнуў Малы так суцяшальна, як толькі мог.

Праз пару хвілін Карлсан вярнуўся назад, бадзёры і вясёлы.

— Бімба прасіў табе нешта перадаць — адгадай, што! «Як *утульна* ў цябе тут, Карлсан, — сказаў ён. — Можна, я лепей буду *тваім* сабакам?»

— Ха-ха, нічога ён такога не казаў!

Малы смяяўся, бо дакладна ведаў, чый сабака Бімба, — і Бімба гэта ведаў таксама.

— Ну што, цяпер усё выдатна, — сказаў Карлсан. — Ты ж разумееш, што такія добрыя сябры, як мы з табой, павінны час ад часу падладжвацца адзін пад другога. Калі-нікалі адзін мусіць рабіць тое, што хоча другі.

— Так, але гэты другі — заўсёды ты, — хіхікнуў Малы, і яму зрабілася цікава, што ж такое задумаў Карлсан.

Любому было ясна, што ў гэтую ноч для Карлсана было б найлепей зашыцца дома на канапе, схаваўшыся з галавой пад коўдрай, а Бімба — застацца тут і палохаць Філе і Руле такім брэхам, што ўвесь дом хадзіў бы ходырам. Але Карлсан зрабіў усё наадварот і нават амаль пераканаў Малога, што так найлепш. Малому самому хацелася ў гэта верыць, бо глыбока ў душы ён быў аматарам прыгод, і яго апанавала цікаўнасць, як жа Карлсан будзе хітраваць гэтым разам.

Карлсан спяшаўся — ён думаў, што Філе і Руле могуць заявіцца ў любы момант.

— Я схітрую што-небудзь такое, што адразу напалохае іх да смерці, — сказаў ён. — І можаш мне паверыць, ніякіх бяглуздых шчанюкоў для гэтага не спатрэбіцца.

Ён выбег у кухню і пачаў корпацца ў каморы. Малы спалохана папрасіў, каб ён не грымеў там, бо фрэкен Бок спала ў пакоі Бэтан праз сценку. Карлсан пра гэта не падумаў.

— Будзеш слухаць пад дзвярыма, — загадаў ён Малому. — Як толькі пачуеш, што «хр-р-р-пі-пі-пі» ці «хр-р-р-аш» спыніліся, кажы мне, бо, значыць, небяспека блізка.

Ён крыху паразважаў.

— Ведаеш, што тады рабіць? — сказаў ён. — Сам пачынай храпці гучна, як толькі можаш. Вось так: «хр-р-р-а-а-ах, хр-р-р-а-а-ах!»

— Навошта? — здзівіўся Малы.

— Ну глядзі, калі прачнецца Казачнік Юле, то ён падумае, што гэта храпе Страхмістрыня, а калі прачнецца Страхмістрыня, то яна падумае на Казачніка Юле. Але я буду ведаць, што «хр-р-р-а-а-ах» — гэта ты, і зразумею, што нехта прачнуўся і блізка небяспека, і тады я залезу ў камору і там схаваюся. Хі-хі, адгадай, хто найлепшы ў свеце хітрун?

— А калі прыйдуць Філе і Руле, што мне рабіць? — спалохана спытаў Малы. Не надта ж прыемна заставацца аднаму ў вітальні, калі прыйдуць зладзеі, а Карлсан будзе на кухні.

— Тады таксама храпі, — сказаў Карлсан. — Вось так: «хр-р-хо-хо-хо, хр-р-хо-хо-хо».

Гэта здалося Малому не меней складаным, чым табліца множання, — запомніць усе гэтыя «хр-р-р-пі-пі-пі», «хр-р-р-аш», «хр-р-р-а-а-ах» і «хр-р-хо-хо-хо», але ён паабяцаў пастарацца.

Карлсан падышоў да паліцы з ручнікамі і згроб адтуль іх усе.

— Ручнікоў не стае, — сказаў ён. — Але ў ванным пакоі, мабыць, знойдуцца яшчэ.

— Што ты будзеш рабіць? — спытаў Малы.

— Мумію, — сказаў Карлсан. — Жахлівую, страшэнную, смертаносную мумію!

Малы не зусім уяўляў, што такое мумія, але ведаў, што іх знаходзілі ў старажытных магілах егіпецкіх каралёў. Здаецца, гэта акурат самі мёртвыя каралі ды каралевы, якія там ляжаць, быццам запакаваныя, з вырачанымі вачыма. Пра гэта неяк расказваў тата. Ён растлумачыў, што, каб каралі і каралевы заставаліся як жывыя, іх спачатку бальзамавалі, а потым шматкроць абгортвалі старымі лахманамі. Але Малы падумаў, што Карл-

сан усё ж не бальзамавальнік. Таму ён здзіўлена спытаў:

— *Як* ты зможаш зрабіць мумію?

— Абкручу выбівалку, але ты за гэта не хвалюйся, — сказаў Карлсан. — Ідзі на варту і займайся сваёй справай, а тут я ўжо дам рады.

І Малы пачаў вартаваць. Ён слухаў пад дзвярыма і чуў самы што ні ёсць спакойны храп. «Хр-р-р-пі-пі-пі» і «хр-р-р-аш» — усё як мае быць. Але потым дзядзьку Юліусу, відаць, прымроіліся нейкія жахі, бо ягоны храп змяніўся і ператварыўся ў дзіўныя стогны накшталт «хр-р-р-м-м-м, хр-р-р-м-м-м» — зусім не такія, як спакойнае папіскванне «пі-пі-пі». Малы задумаўся, ці не варта дзеля надзейнасці схадзіць на кухню і расказаць пра гэта найлепшаму ў свеце даследчыку храпу, але раптам пачуў таропкія крокі, а потым жахлівы грукат, а потым адборную лаянку. Яны чуліся з боку пасткі — о, ратуйце! Філе і Руле ўжо тут, няйначай! У гэты момант Малы са страхам заўважыў, што храп «хр-р-р-аш» сціх. Ратуйце, куды ж падзецца?! Ён адчайна паўтараў сам сабе ўсе загады, што атрымаў ад Карлсана, а потым пачаў храпці на ўсе лады: спачатку жаласнае «хр-р-р-а-а-ах» і адразу ж такое самае жаласнае «хр-р-р-хо-хо-хо», але атрымлівалася зусім не падобна да храпу.

Ён паспрабаваў яшчэ раз.

— Хр-р-р...

— Зашчоўкні сківіцы, — прашыпеў нехта з боку пасткі, і Малы разгледзеў у цемры штосьці маленькае і тоўстае. Яно варушылася паміж перакуленых крэслаў і марна спрабавала падняцца на ногі. Гэта быў Карлсан.

Малы падбег да яго і падняў крэслы, каб Карлсан мог устаць. Але Карлсан ані кропелькі не быў за гэта ўдзячны. Ён быў злы як аса.

— Гэта ўсё ты, — прашыпеў ён. — Хіба я табе не сказаў прынесці ручнікі з ваннага пакоя?

Насамрэч Карлсан такога не казаў. Небарака, ён, відаць, забыў, што шлях у ванны пакой ішоў праз пастку на зладзеяў, але пры чым тут Малы? Аднак у іх не было часу высвятляць, хто вінаваты, бо яны пачулі, як фрэкен Бок важдаецца з дзвярной ручкай у сваім пакоі. Нельга было губляць ні секунды.

— Бяжым, — прашаптаў Малы.

Карлсан рынуўся на кухню, а Малы памчаў у свой пакой і кінуўся на ложак. Ён паспеў у апошні момант. Малы нацягнуў на сябе коўдру і паспрабаваў выхрапці з сябе праўдападобнае «хр-р-р-а-ах», але атрымалася проста жахліва, таму ён сціх. Ён ляжаў так і слухаў, як у пакой заходзіць фрэкен Бок і ідзе да ягонага ложка. Малы асцярожна прыўзняў павекі і ўбачыў, як яна стаіць у сваёй начной кашулі, уся

белая ў шэрай цемры. Яна так пільна яго разглядала, што Малому было козытна ва ўсім целе.

— Не прыкідвайся, што спіш, — сказала фрэкен Бок, але зусім не сярдзіта. — Цябе таксама пабудзіла навальніца? — спытала яна, і Малы прамармытаў:

— Так... здаецца.

Фрэкен Бок згодна кіўнула.

— Я ўвесь дзень адчувала, што будзе навальніца. Было так душна і дзіўна. Але баяцца няма чаго, — сказала яна і пагладзіла Малога па галаве. — Яна проста грыміць, але вось так пасярод горада маланкі ніколі не б'юць.

Потым яна пайшла. Малы паляжаў яшчэ крыху ў ложку, баючыся варухнуцца. Ён з трывогай падумаў, як там Карлсан, і ціха, як мог, пракраўся на кухню.

Першым, што ён убачыў, была мумія. Святыя апосталы, як казаў дзядзька Юліус, перад ім была мумія! Яна сядзела на пасудным століку, а побач стаяў горды, як певень, Карлсан і свяціў на яе кішэнным ліхтарыкам, які знайшоў у каморы.

— Стыльная, скажы? — пахваліўся ён.

Стыльная — значыць, яна. Значыць, гэта мумія каралевы, вырашыў Малы. Што праўда, гэтая каралева была досыць пышная і круглявая, бо Карлсан абкруціў выбівалку ўсімі кухоннымі і лазневымі ручнікамі, якія змог адшукаць. «Галава» выбівалкі зрабілася тварам: Карлсан нацягнуў на яе ручнік і намаляваў на ім два вялікія чорныя лупатыя вокі. Зубы ў муміі таксама былі. Прычым сапраўдныя. Зубы дзядзькі Юліуса. Яны

былі ўціснутыя ў ручнік і, відаць, утыркнутыя паміж пруткоў выбівалкі, а каб зубы дакладна не адваліліся, Карлсан моцна прыляпіў іх пластырам у кутках рота мумії. Мумія была і праўда жахлівая, страшэнная і смертаносная, але Малы ўсё адно хіхікнуў.

— Чаму яна з пластырам? — спытаў ён.

— Бо галілася і парэзалася, — сказаў Карлсан і пагладзіў мумію па шчацэ. — Хой, хой, яна так падобная да маёй маці, што я збіраюся назваць яе Матухнай.

Ён узяў мумію на рукі і аднёс у вітальню.

— Філе і Руле будуць радыя сустрэцца з Матухнай, — сказаў ён.

Карлсан хітруе ў цемры

Праз адтуліну для пошты прасунуўся доўгі стальны дрот. Яго не было відаць, бо ў калідоры стаяла поўная цемра, але непрыемныя скрып і скрыгат былі чуваць. Так, Філе і Руле ўжо тут!

Малы і Карлсан сядзелі, стаіўшыся, пад круглым столікам у вітальні і чакалі. Яны прасядзелі ўжо не менш за гадзіну. Малы нават быў крыху прыснуў. Але калі з боку дзвярэй пачуўся скрыгат, ён уздрыгнуў і прачнуўся: ой, яны ўсё ж такі прыйшлі! Сон як рукой зняло. Ён так перапалохаўся, што холад прабег па спіне, а вось Карлсан задаволена вуркатнуў у цемры.

— Хой, хой! — прашаптаў ён. — Хой, хой!

Гэта ж трэба — як лёгка можна адамкнуць замок адным толькі дротам! Дзверы асцярожна адчыніліся, і нехта ўвайшоў. Пастаяў у калідоры… Малы затрымаў дыханне: якое брыдкае адчуванне! Пачуўся шэпт, потым ціхія крокі… Але потым — грукат, авоечкі, які грукат — і два прыглушаныя ўскрыкі!

А потым пад сталом раптам загарэўся ліхтарык Карлсана — і гэтак жа раптоўна згас, але за гэты кароткі міг промень асвятліў жахлівую, страшэнную і смертаносную мумію, прыхіленую да сцяны. Яна вусцішна ўсміхалася зубамі дзядзькі Юліуса. Тады з боку пасткі зноў пачуліся крыкі — гэтым разам гучнейшыя.

Потым усё адбывалася хутка — Малы нават не паспяваў заўважыць, што за чым. Ён пачуў, як адчыніліся дзверы — гэта з пакояў выскачылі дзядзька Юліус і фрэкен Бок, і адразу чыесьці ногі пратупацелі праз калідор, а яшчэ было чутна, як

па падлозе шоргае Матухна, — гэта Карлсан цягнуў яе да сябе на павадку Бімба, прывязаным за яе шыю. Яшчэ Малы чуў, як фрэкен Бок некалькі разоў шчоўкнула ўключальнікам, каб запаліць святло, але Карлсан павыкручваў усе пробкі ў шчытку на кухні — ён сказаў, што найлепей хітраваць у цемры, — так што спробы фрэкен Бок і дзядзькі Юліуса асвятліць вітальню былі марнымі.

— Якая жахлівая навальніца, — сказала фрэкен Бок. — Ну і гром, праўда? Дзіва што яны адключылі электрычнасць!

— Гэта праўда навальніца? — засумняваўся дзядзька Юліус. — Я думаў, нешта зусім іншае.

Але фрэкен Бок запэўніла, што ўмее адрозніваць грукат навальніцы.

— А што яшчэ гэта магло быць? — спытала яна.

— Я думаў, можа, якія-небудзь патаемнікі з казачнага свету прызначылі тут сустрэчу, — сказаў дзядзька Юліус.

Насамрэч ён сказаў «патаемнікі ш кажашнага шфэту», бо так шапялявіў, ажно шыпеў. Таму што ён без зубоў, зразумеў Малы, але адразу думаць пра гэта забыў. Ён не мог думаць ні пра што іншае, акрамя таго, дзе цяпер Філе і Руле. Яны змыліся? Ён не чуў, каб дзверы за імі зачыніліся, а значыць, яны недзе там, у цемры калідора — можа, хаваюцца

за вопраткай... О, як жахліва! Малы прыціснуўся да Карлсана як мага бліжэй.

— Спакойна, толькі спакойна, — прашаптаў Карлсан. — Хутка яны зноў аб'явяцца тут.

— Не адно, дык іншае, — сказаў дзядзька Юліус. — Ніякага шпакою ў гэтым доме!

Потым яны з фрэкен Бок разышліся па сваіх пакоях, і ў вітальні зноў зрабілася ціха. Карлсан і Малы сядзелі пад столікам і чакалі. Малы думаў, прайшла цэлая вечнасць. Зноў пачулася «хр-р-р-пі-пі-пі» і «хр-р-р-аш» — адсюль слаба і ціха, але гэта быў дакладны знак, што дзядзьку Юліуса і фрэкен Бок агарнуў сон.

І тады Філе і Руле асцярожна выступілі з цемры. Яны ішлі крадком, каля пасткі спыніліся і прыслухаліся. Было чуваць іх дыханне. Як вусціш-на! Вось яны запалілі свае ліхтарыкі — так, у іх і ліхтарыкі з сабой былі — і святло пачало шнарыць па вітальні. Малы заплюшчыў вочы, нібыта думаў, што так ён будзе меней заўважны. Абрус, на шчасце, звісаў вельмі нізка, але Філе і Руле ўсё адно лёгка маглі іх там знайсці — Малога, Карлсана і Матухну. Малы зажмурыўся і стаіў дыханне. І пачуў, як Філе і Руле перашэптваюцца зусім побач.

— Ты таксама бачыў прывід? — спытаў Філе.

— *Каб жа* не бачыў! — сказаў Руле. — Ён стаяў там, каля сцяны, але цяпер яго няма.

— Гэта, напэўна, самая зачараваная кватэра ва ўсім Стакгольме. Ну, мы гэта ўжо ведаем, паспыталі, — сказаў Філе.

— Ух, страх які... Давай змывацца, — прапанаваў Руле.

Але Філе не захацеў.

— Нізашто! Дзеля дзесяці тысяч крон я гатовы сустрэцца з тузінам прывідаў, так і запішы!

Ён ціха падняў перакуленыя крэслы і адставіў іх убок. Мабыць, каб яны не былі пад нагамі, калі раптам давядзецца спешна адступаць. Філе сярдзіта панаракаў на разбэшчаных дзяцей у гэтым доме — маўляў, забаўляюцца тым, што ставяць пасткі на гасцей.

— Ох як я грымнуўся — ажно вокам выцяўся! — сказаў ён. — Ліхтар будзе здаравенны, клятыя бэйбусы!

Потым ён зноў пашнарыў ліхтарыкам па ўсіх закуточках.

— Цяпер паглядзім, куды вядуць усе гэтыя дзверы і адкуль пачынаць шукаць, — сказаў ён.

Промень святла замітусіўся па вітальні, і кожны раз, калі ён успыхваў каля століка, Малы заплюшчваў вочы і замірaў. Ён адчайна падціскаў пад сябе

ногі. Яму здавалася, яны такія вялізныя, што не змяшчаюцца пад столікам і ўвесь час спрабуюць вытыркнуцца так, каб трапіць на вочы Філе і Руле.

Раптам Малы заўважыў, што Карлсан ізноў корпаецца з Матухнай. Промень слізгануў далей, і пад абрусам зноў зрабілася цёмна, але Малы ўсё адно бачыў, як Карлсан выпіхнуў Матухну вонкі і прыхіліў да століка. Яна была там, калі святло ліхтарыка раптоўна вярнулася і ўпала проста на яе вусцішную ўхмылку. Тады зноў спачатку пачуліся два прыглушаныя ўскрыкі, а потым таропкае тупаценне ног у бок калідора.

Карлсан быў у захапленні.

— Хадзем, — выдыхнуў ён Малому ў вуха і хутка, як вожык, папоўз, цягнучы за сабой па падлозе на павадку Матухну.

Ён знік у пакоі Малога, следам запоўз і Малы.

— Якія недалёкія людзі, — сказаў Карлсан і зачыніў за сабой і за Малым дзверы. — Не бачыць розніцы паміж прывідам і муміяй — гэта, я лічу, недалёкасць.

Ён асцярожна расчыніў дзверы і ўслухаўся ў цемру вітальні. Малы таксама навастрыў вушы. Ён спадзяваўся пачуць, як за Філе і Руле зачыняцца дзверы, але надзея не апраўдалася. Яны ўсё яшчэ былі тут і ціха размаўлялі паміж сабой.

— Дзесяць тысяч крон, — сказаў Філе, — не забывайся! Я не дам ніякім прывідам сябе напужаць, так і ведай.

Мінуў нейкі час. Карлсан напружана слухаў.

— Яны пайшлі да Казачніка Юле, — сказаў ён. — Хой, хой, значыць, маем час паштукаваць!

Ён узяў Матухну за павадок і акуратна ўклаў яе ў ложак Малога.

— Здароўценькі, Матухна, нарэшце ты зможаш паспаць, — сказаў ён і старанна яе накрыў, як маці накрываюць на ноч сваіх дзетак. Потым ён памахаў Малому, каб той падышоў.

— Паглядзі, хіба яна не міленькая? — сказаў ён і пасвяціў на сваю мумію ліхтарыкам. Малы ўздрыгнуў. Мумія ляжала, уперыўшыся ў столь чорнымі лупатымі вачыма. Сваёй вусцішнай ухмылкай Матухна магла напужаць да смерці любога. Але Карлсан задаволена паглядзіў яе, а потым нацягнуў коўдру на самыя вочы. Ён узяў пакрывала, якое фрэкен Бок склала і пакінула на крэсле, калі заходзіла сказаць Малому добрай ночы, і разаслаў яго зверху — мабыць, каб Матухна не мерзла. Малы хіхікнуў. Цяпер яе зусім не было бачна — толькі круглае, пульхнае цела ўздымалася пад пакрывалам.

— Здароўценькі, Малы, — сказаў Карлсан, — цяпер, па-мойму, і табе трэба паспаць.

— А дзе? — устрывожыўся Малы, бо зусім не хацеў спаць побач з Матухнай. — Я не магу спаць у ложку, там жа Матухна…

— У ложку не можаш, а *пад* ложкам — яшчэ як, — сказаў Карлсан. І хутка, як вожык, зашыўся пад ложак сам. Малы таксама спрытна, як мог, залез туды.

— Зараз ты пачуеш тыповы шпіёнскі храп, — сказаў Карлсан.

— А шпіёны неяк па-асабліваму храпуць? — здзівіўся Малы.

— Так, яны храпуць падступна і грозна — звар'яцець можна. Вось так: ро-о-о-ох, о-о-о-ох, о-о-о-ох!

Шпіёнскі храп пагрозліва гудзеў, гырчаў, уздымаўся і апускаўся. Гучала гэта і праўда падступна і грозна. І да таго ж занадта гучна. Малы запанікаваў.

— Цішэй! Філе і Руле могуць прыйсці!

— Якраз дзеля гэтага шпіёнскі храп і патрэбны, — сказаў Карлсан.

У той жа міг Малы пачуў, як нехта павярнуў ручку дзвярэй. Яны прыадчыніліся. Тонкая палоска святла праслізнула ў пакой, потым крадком прабраліся Філе і Руле.

Карлсан хроп падступна і грозна, а Малы ў адчаі заплюшчыў вочы. Хаця мог і не заплюшчваць: ён і так быў нябачны. Пакрывала звісала да самай

падлогі і захінала іх з Карлсанам і ад святла, і ад пільных вачэй. Карлсан усё прадумаў.

— Ро-о-о-ох, — выводзіў Карлсан.

— Нарэшце мы яго знайшлі, — ціха сказаў Філе. — Так дзеці не храпуць, гэта мусіць быць ён. Паглядзі, які таўсмыга, дакладна ён!

— Ро-о-о-ох, — сярдзіта захроп Карлсан. Яму зусім не спадабалася, што яго назвалі таўсмыгам, гэта было чуваць.

— Кайданкі падрыхтаваў? — спытаў Руле. — Лепш адразу іх начапіць, пакуль спіць.

Пакрывала зашамацела, а потым Філе і Руле разам выдыхнулі. Малы зразумеў, што яны ўбачылі ўхмылку страшэннай смертаноснай мумііі, што ляжала ў пасцелі. Але зладзеі, відаць, ужо крыху прызвычаіліся да яе і не пужаліся так лёгка, бо не ўскрыкнулі і не пабеглі, а толькі выдыхнулі.

— Ат, гэта ж проста лялька, — крыху збянтэжана сказаў Філе, — і што за лялька — каб яе трасца...

Ён, відаць, накрыў яе зноў, бо пакрывала пражамацела яшчэ раз.

— Але слухай, — сказаў Руле, — ты можаш мне патлумачыць, як гэтая лялька трапіла сюды? Яна ж толькі што была ў вітальні, хіба не?

— Усё так, — задумліва сказаў Філе. — І хто гэта, дарэчы, храпе?

Але пра гэта Філе даведацца не паспеў, бо якраз тут з вітальні пачуліся крокі. Малы пазнаў цяжкую хаду фрэкен Бок і з хваляваннем падумаў, што зараз пачнецца гром, горшы за навальнічны.

Але ён памыліўся.

— Шутчэй у хафу, — прашыпеў Філе, і не паспеў Малы міргнуць, як Філе і Руле схаваліся ў ягонай шафе.

Карлсан дзейнічаў спрытна. Хутка, як вожык, ён падпоўз да шафы і надзейна замкнуў Філе і Руле на ключ. Потым гэтак жа хутка ён запоўз на сваё месца пад ложкам, а ў наступную секунду ў пакой зайшла фрэкен Бок — амаль як Люсія ў сваёй белай кашулі і з запаленай свечкай у руках.

Малы зразумеў, што яна ўжо каля ложка, калі ўбачыў з-пад нізу мыскі яе ног і пачуў над сваёй галавой строгі голас:

— Гэта ты, Малы, толькі што заходзіў у мой пакой і свяціў ліхтарыкам?

— Не, не я, — сарвалася ў Малога з языка.

— Чаго ж ты тады не спіш? — падазрона спытала фрэкен Бок і дадала: — І не гавары з-пад коўдры, нічога не чуваць!

Пасцель зашамацела, калі яна сцягнула пакрывала з таго, што, як яна думала, было галавой Малога. Потым пачулася страшэннае выццё. «Бедная

фрэкен Бок, — падумаў Малы, — яна ж яшчэ не прызвычаілася да смертаносных мумій, не тое што Філе і Руле!» Ён зразумеў, што цяпер самы час выпаўзці з-пад ложка. Усё адно яна хутка яго зной-

дзе. І з Філе ды Руле яму патрэбная дапамога. Трэба іх выкурыць з шафы, нават калі разам з імі развеюцца ўсе таямніцы свету.

І Малы выпаўз са схованкі.

— Не бойцеся, — нясмела сказаў ён. — Матухна нічога не зробіць, але ў шафе — аёй, там два злодзеі!

Фрэкен Бок усё яшчэ была сама не свая пасля сустрэчы з Матухнай. Яна трымалася за сэрца і цяжка дыхала, але калі Малы сказаў ёй пра зладзеяў у шафе, то мала не раззлавалася.

— Што ты вярзеш! Зладзеі ў шафе! Не кажы глупстваў!

Але на ўсялякі выпадак падышла да шафы і крыкнула:

— Там хто-небудзь ёсць?

Адказу не было, і яна раззлавалася яшчэ больш.

— Адказвайце! Там хто-небудзь ёсць? Калі вас там няма, дык прынамсі так і скажыце!

Тут яна пачула, як у шафе нешта грукнула, і зразумела, што Малы казаў праўду.

— Ах, які ты смелы хлопчык! — усклікнула яна. — Такі маленькі, а змог злавіць дваіх вялікіх і дужых злодзеяў — ах, які ты смелы!

Тады пад ложкам нешта загрымела, і адтуль выпаўз Карлсан.

— А вось і не, — сказаў ён. — Гэта *я* іх злавіў!

Ён кідаў гнеўныя позіркі то на фрэкен Бок, то на Малога.

— Бо я смелы і добры ва ўсіх сэнсах, — сказаў ён. — А яшчэ я спрэс разумны і да таго ж неверагодна прыгожы, а не нейкі там таўсмыга, вось так!

Фрэкен Бок вельмі раззлавалася, убачыўшы Карлсана.

— Ах ты... Ах ты... — ускрыкнула яна, але на тым і спынілася. Яна разумела, што цяпер не час і не месца, каб выгаворваць Карлсану за аладкі: былі важнейшыя справы. Яна рэзка павярнулася да Малога.

— Збегай пабудзі дзядзьку Юліуса, хай выкліча паліцыю... Ой, мне ж трэба халат накінуць! — дадала яна, спалохана паглядзеўшы на сваю начную кашулю.

Яна кінулася з пакоя. Малы таксама. Але спачатку ён выцягнуў у Матухны зубы, падумаўшы, што дзядзьку Юліусу яны зараз патрэбныя больш.

У спальні на поўную моц чулася «хр-р-р-пі-пі-пі»: дзядзька Юліус спаў сном дзіцяці.

Паціху пачало днець. У паўзмроку Малы разгледзеў на начным століку шклянку з вадой. Ён апусціў туды зубы, вада ціха плюхнула. Побач са шклянкай ляжалі дзядзькавы акуляры і Карлсанаў кулёк з ка-

рамелькамі. Малы ўзяў кулёк і засунуў у кішэню пі-жамы, каб вярнуць потым Карлсану. Лепей будзе, калі дзядзька Юліус не ўбачыць кулёк, як прачнецца, інакш пачне думаць, як жа ён туды трапіў. У Малога было адчуванне, што звычайна на століку ляжала не-што яшчэ... Так, дзядзькавы гадзіннік і гаманец. Цяпер іх там не было. Але гэта не ягоная, Малога, спра-ва. Ён сюды прыйшоў, каб пабудзіць дзядзьку Юліуса, што ён і зрабіў. Дзядзька Юліус прахапіўся са сну.

— Што яшчэ такое?

Ён спрытна намацаў свае зубы і ўставіў у рот, а потым сказаў:

— Праўду кажу, хутка паеду назад у Вэстэргётланд з такімі начнымі прыгодамі... І там высплюся нарэш-це — праспію шаснаццаць гадзін запар, не менш!

«Такое і праўда без зубоў не вымавіш», — па-думаў Малы і пачаў тлумачыць дзядзьку Юліусу, навошта ён ім так раптоўна спатрэбіўся. Дзядзька Юліус пакрочыў са спальні так хутка, як толькі мог. Малы шыбаваў следам, фрэкен Бок рушыла подбе-гам са свайго пакоя, і ўсе разам яны ўварваліся ў пакой Малога.

— О, дарагі наш спадар Янсан, зладзеі, падумаць толькі! — лямантавала фрэкен Бок.

Карлсана ў пакоі не было — Малы адразу гэта заўважыў. Напэўна, паляцеў дадому. Акно было

адчыненае. Вось і добра, проста цудоўна! Тады ні Філе з Руле яго не ўбачаць, ні паліцыя. Гэта неяк занадта добра, каб быць праўдай!

— Яны ў шафе, — сказала фрэкен Бок адначасова спалохана і задаволена. Але дзядзька Юліус паказаў на горб, што ўздымаўся ў пасцелі Малога, і спытаў:

— Можа, лепей мы спачатку пабудзім Малога?

Потым ён здзіўлена перавёў позірк на Малога, які стаяў побач з ім.

— Хаця, я гляджу, ён ужо прачнуўся. Але хто ж тады ў ложку?

Фрэкен Бок уздрыгнула. Яна ўжо ведала, хто ў ложку. Штосьці нават больш вусцішнае за зладзеяў.

— Там нешта жудаснае, — сказала яна. — Нешта страшэнна жудаснае! Напэўна, з казачнага свету!

Тады вочы дзядзькі Юліуса заззялі. Ён зусім не баяўся, наадварот, нават пагладзіў горб, які тапырыўся пад коўдрай.

— Штосьці тоўстае і жудаснае з казачнага свету... Я *мушу* на гэта паглядзець, перш чым разбяруся з нейкімі там зладзеямі!

Ён рэзка адкінуў пакрывала.

— Хі-хі, — сказаў Карлсан і задаволена сеў у ложку. — А вось і не казачны нехта схаваўся тут! Гэта проста маленькі я! Вось дык аблапошыў, га?

Фрэкен Бок раз'юшана зыркнула на Карлсана, дзядзька Юліус таксама выглядаў вельмі расчараваным.

— У вас і па начах гэтае дзіцё бадзяецца? — спытаў ён.

— Так, але я надзяру яму вушы, калі ў мяне будзе час, — сказала фрэкен Бок. Потым яна спалохана схапілася за руку дзядзькі Юліуса.

— Спадар Янсан, прашу вас, трэба пазваніць у паліцыю!

Тут здарылася нешта нечаканае. З шафы пачуўся рэзкі голас:

— Адчыніце ў імя закона! Гэта паліцыя!

Фрэкен Бок, дзядзька Юліус і Малы не на жарт здзівіліся, а Карлсан толькі раззлаваўся.

— Паліцыя... Спрабуйце каго іншага надурыць, бязглуздыя памаўзлюкі!

Але тут Філе крыкнуў, што за ўтрымліванне ў шафе паліцэйскіх, якія прыйшлі лавіць небяспечных шпіёнаў, выпісваюць вялікія штрафы. «Ух як выкручваюцца», — падумаў Малы.

— Калі ласка, проста адчыніце, — крыкнуў Філе.

Тады дзядзька Юліус паслухмяна падышоў і адамкнуў іх. Філе і Руле вываліліся з шафы. Яны і праўда здаваліся такімі раззлаванымі і падобнымі

да паліцэйскіх, што дзядзька Юліус і фрэкен Бок моцна перапалохаліся.

— Але, спадары паліцэйскія, — з сумневам прамовіў дзядзька Юліус, — у вас жа няма формы!

— Няма, бо мы з сакрэтнай службы бяспекі, — сказаў Руле.

— І мы сюды прыйшлі, каб затрымаць яго, — паказаў Філе на Карлсана. — Ён вельмі небяспечны шпіён!

Але тут фрэкен Бок зарагатала смехам, ад якога валасы ўстаюць дыбарам.

— Шпіён! Гэты вунь! Не, ведаеце што! Гэта проста брыдкі аднакласнік Малога!

Карлсан саскочыў з ложка.

— Да таго ж я найлепшы вучань у класе, — горача сказаў ён, — таму што ўмею махаць вушамі... ну і арыфметыку ведаю, як жа без гэтага!

Але Філе не паверыў. Ён схапіў кайданкі і пагрозліва рушыў на Карлсана. Ён падыходзіў усё бліжэй, але тут Карлсан так убрыкнуў яго ў галёнку, што Філе пакручаста вылаяўся ды заскакаў на адной назе.

— Віншую з сіняком, — задаволена сказаў Карлсан, і Малы падумаў, што ўжо чаго-чаго, а сінякоў у зладзеяў мусіць быць чым болей. Вока Філе ўжо амаль заплыло і зусім пасінела. Малы падумаў, што так яму і трэба, раз ён прывалокся сюды і хацеў

скрасці ягонага Карлсана, каб прадаць за дзесяць тысяч крон. Брыдкія зладзеі! Малы пажадаў ім у думках столькі сінякоў, колькі на іх можа змясціцца.

— Хлусня, ніякія яны не паліцэйскія, — сказаў ён. — Яны зладзеі, я ведаю.

Дзядзька Юліус задумліва пачухаў патыліцу.

— Гэта нам трэба высветліць, — сказаў ён.

Ён прапанаваў усім пайсці ў гасцёўню і разабрацца, зладзеі Філе і Руле ці не.

Было ўжо амаль светла. Зоркі ў небе за акном пабляклі, надыходзіў новы дзень, і Малому нічога так не хацелася, як нарэшце пайсці паспаць, а не сядзець тут ды слухаць хлусню Філе і Руле.

— Няўжо вы не чыталі ў газеце, што па Васастане лятае шпіён? — Руле дастаў з кішэні газетную выразку.

Дзядзька Юліус пагардліва паглядзеў на яго.

— Не варта верыць лухце, якую пішуць газеты, — сказаў ён. — Хаця я магу і пачытаць гэта яшчэ раз. Пачакайце, толькі вазьму акуляры!

Дзядзька Юліус сышоў у спальню, але адразу ж вярнуўся. Ён быў вельмі раззлаваны.

— Цудоўныя паліцэйскія, нічога не скажаш! — крыкнуў ён. — Вы скралі ў мяне гаманец і гадзіннік! Ану, калі ласачка, зараз жа выграбайце іх сюды!

Але тут Філе і Руле таксама страшэнна раззлаваліся.

— Небяспечна вінаваціць паліцэйскіх у крадзяжы гаманцоў і гадзіннікаў, — заявіў Руле.

— Гэта, між іншым, называецца знявагай годнасці, — сказаў Філе. — А за знявагу годнасці паліцэйскага, між іншым, трапляюць у турму.

Карлсану, відаць, нешта прыйшло ў галаву, бо ён раптам заспяшаўся. Ён, зусім як дзядзька Юліус, выбег з пакоя і гэтак жа хутка вярнуўся. Ён увесь кіпеў ад злосці.

— А мой кулёк з карамелькамі, — крыкнуў Карлсан, — хто яго ўзяў?!

Філе пагрозліва пайшоў на яго.

— Ты нас у гэтым хочаш абвінаваціць?

— О не, я ж не вар'ят які, — сказаў Карлсан. — Са знявагай годнасці я асцярожны. Я толькі магу сказаць, што калі той, хто забраў кулёк, зараз жа яго не верне, то атрымае ліхтара і на другім воку!

Малы хуценька падаў яму кулёк:

— Вось ён. Я прыхаваў яго для цябе.

Тады Філе насмешліва сказаў:

— Так, так, вы паглядзіце! Але давайце, вінавацьце ва ўсім нас, калі думаеце, што гэта вам дарам пройдзе!

Фрэкен Бок пакуль сядзела моўчкі, але цяпер таксама захацела выказацца.

— Я ўжо здагадалася, хто ўмыкнуў гадзіннік і гаманец. Ён жа толькі і робіць, што крадзе:

то булачкі, то аладкі, то яшчэ што, да чаго рукі дацягнуцца!

Яна паказала на Карлсана, і той зусім раз'юшыўся.

— Ну, ведаеш што! Гэта знявага годнасці, і гэта небяспечна, калі ты не ведала, боўдзіла!

Але фрэкен Бок не зважала на Карлсана. Яна хацела сур'ёзна пагаварыць з дзядзькам Юліусам. Яна лічыла, што гэтыя два спадары маглі і праўда быць з сакрэтнай паліцыі, бо выглядалі яны цалкам прыстойна, былі апранутыя як след і ўсё такое. Фрэкен Бок ніколі не бачыла рабаўнікоў і лічыла, што зладзеі звычайна апранаюцца абы-як, у розныя лахманы.

Тут Філе і Руле, вядома, вельмі ўзрадаваліся. Філе сказаў, што адразу зразумеў, які мудры і цудоўны чалавек гэтая дама, і што ён у захапленні ад таго, што яму пашчасціла з ёй пазнаёміцца. Ён павярнуўся да дзядзькі Юліуса, каб той падтрымаў яго.

— Яна проста чароўная, праўда, вы таксама так лічыце?

Не было падобна, што дзядзька Юліус думаў пра гэта раней, але цяпер яму хоцькі-няхоцькі давялося пагадзіцца, і тады фрэкен Бок апусціла вочы і зачырванелася.

— Так, яна чароўная, як грымучая змяя, — прамармытаў Карлсан.

Ён сядзеў у куце каля Малога і храбусцеў карамелькамі, а спустошыўшы кулёк, усхапіўся і пачаў скакаць па пакоі. Здавалася, ён проста дурэе, але падчас гэтых скокаў ён пакрысе апынуўся якраз за спінамі Філе і Руле.

— Такую мілую даму хочацца сустрэць яшчэ не аднойчы, — сказаў Філе, і фрэкен Бок пачырванела яшчэ больш і зноў апусціла вочы.

— Гэта ўсё цудоўна наконт мілых і чароўных дам, — нецярпліва сказаў дзядзька Юліус, — але цяпер я хацеў бы даведацца, куды падзеліся мой гаманец і гадзіннік!

Здавалася, Філе і Руле не пачулі, што ён сказаў. Філе так захапляўся фрэкен Бок, што яго больш нічога не абыходзіла.

— Яна такая прыемная, праўда, Руле? — ціха сказаў ён, але так, каб фрэкен Бок пачула. — Прыгожыя вочы... І такі неверагодна добранадзейны нос, на які можна паспадзявацца ў любой прыгодзе, праўда, Руле?

Тут фрэкен Бок ажно падскочыла на сваім крэсле і выпрачыла вочы.

— Які нос? — ускрыкнула яна. — Як вы сказалі?

Філе зусім сумеўся.

— Ну, я толькі сказаў... — пачаў быў ён, але фрэкен Бок не дала яму працягнуць.

— Ага, гэта вось, я так разумею, Філіп, — сказала яна, і Малому здалося, што яна ўсміхнулася амаль так жа вусцішна, як Матухна.

Філе здзівіўся.

— Адкуль вы ведаеце? Вы пра мяне нешта чулі?

Фрэкен Бок сярдзіта кіўнула.

— Яшчэ як чула! Святыя ўгоднікі, колькі я пра вас чула! А гэта, значыцца, Рудальф, — паказала яна на Руле.

— Так, але адкуль вы ведаеце? Можа, у нас нейкі агульны знаёмы? — узрадавана пацікавіўся Філе.

Фрэкен Бок кіўнула гэтак жа сярдзіта.

— Падобна на тое! Фрэкен Фрыда Бок з вуліцы Фрэйгатан — вы ж яе ведаеце? У яе ж неверагодна добранадзейны нос, на які можна паспадзявацца ў любой прыгодзе, зусім як у мяне, праўда?

— Хаця твой больш нагадвае не добранадзейную бульбіну, а агурок з пупырышкамі, — зазначыў Карлсан.

Філе, відаць, усё ж не надта цікавіўся насамі, бо раптам перастаў выглядаць такім радасным. Наадварот, здавалася, ён больш за ўсё хацеў бы адсюль збегчы, дый Руле таксама. Але за іх спінамі стаяў Карлсан. І раптам грымнуў такі стрэл, што Філе і Руле падскочылі ад страху.

— Не страляйце, — крыкнуў Філе, бо адчуў палец Карлсана, прыстаўлены да спіны, і падумаў, што гэта пісталет.

— Тады даставай гаманец і гадзіннік, — крыкнуў Карлсан, — іначай бабахне.

Філе і Руле пачалі нервова корпацца ў кішэнях пінжакоў, і ўрэшце гаманец з гадзіннікам і праўда ўпалі проста на калені дзядзьку Юліусу.

— На, таўстун, — крыкнуў Філе, а потым абодва зладзеі стрымгалоў кінуліся да дзвярэй, і ніхто не стаў іх спыняць.

Але фрэкен Бок рынулася за імі следам. Яна гналася за імі праз вітальню і калідор, выскачыла на лесвічную пляцоўку і крыкнула наўздагон, пакуль яны беглі ўніз па сходах:

— Фрыда пра ўсё даведаецца! Святыя ўгоднікі, як яна ўзрадуецца!

Яна злосна тупнула пару разоў, нібыта працягвала за імі гнацца, а потым крыкнула зноў:

— Каб нагі вашай больш не было на Фрэйгатан, бо тады пральецца кроў. Чуеце, што кажу? Кро-о-о-оў!

Карлсан адкрывае дзядзьку Юліусу казачны свет

Пасля ночы з Філе і Руле Карлсан пачаў задзіраць нос яшчэ больш, чым звычайна.

— А вось і найлепшы ў свеце Карлсан! — Малы кожную раніцу прачынаўся пад гэты крык, і ў пакой залятаў Карлсан.

Штораніцы ён найперш даставаў з зямлі персікавую костачку, каб паглядзець, ці нашмат яна вырасла, а потым абавязкова падлятаў да старога люстэрка над камодай Малога. Люстэрка было невялікае, але Карлсан лятаў перад ім і так і гэтак, каб як след разгледзець сябе. Увесь ён там не змяшчаўся.

Ён нешта напяваў і насвістваў, пакуль лятаў. Калі прыслухацца, можна было зразумець, што гэта хваласпеў, складзены ў свой гонар.

— Найлепшы ў свеце Карлсан... хм-ці-ці-хм... Каштуе дзесяць тысяч... пужае злыдняў пісталентам... якое жахлівае люстэ-э-эрка... у ім амаль што не відаць... найлепшага Карлсана ў свеце... але тое, што відаць, прыгожае... хм-ці-ці-хм... і ўзорна тоўстае, так-так... і ва ўсіх сэнсах добрае.

З гэтым Малы быў згодны. Ён лічыў, што Карлсан добры ва ўсіх сэнсах. А самае дзіўнае, што нават дзядзька Юліус быў ад Карлсана проста ў захапленні, бо Карлсан вярнуў яму гаманец і гадзіннік. Гэтага дзядзька Юліус не забудзе. Фрэкен Бок, наадварот, па-ранейшаму на яго злавалася. Але Карлсан не зважаў: галоўнае, казаў ён, каб своечасова карміла.

— Калі мяне не накормяць, то я з вамі не гуляю, — абвясціў ён.

Фрэкен Бок больш за ўсё на свеце жадала, каб Карлсан з імі не гуляў, але што зробіш, калі на баку Карлсана былі Малы і дзядзька Юліус. Штораз, калі Карлсан залятаў у акно і плюхаўся за стол, як толькі яны збіраліся есці, яна бурчала, але зрабіць нічога не магла, і Карлсан заставаўся сядзець дзе сядзеў.

Ён узяў гэта за звычку пасля ночы з Філе і Руле. Карлсан, відаць, палічыў, што такому герою, як ён, нават самая злая страхмістрыня не зможа ні ў чым адмовіць.

Тае ночы Карлсана, пэўна, крыху прытамілі ўсе гэтыя даследаванні храпу, перапаўзанні з адной схованкі ў іншую і бабаханне з пісталета, бо ён заляцеў у пакой Малога толькі бліжэй да вячэры. Ён адразу пачаў прынюхвацца, ці не ўчуе шматабяцальнага водару ежы з кухні.

Малы таксама спаў доўга, час ад часу прачынаючыся. Бімба спаў з ім разам у ложку. Начная тузаніна са зладзеямі і праўда моцна стамляе. Малы толькі-толькі прачнуўся, калі прыляцеў Карлсан: яго пабудзілі незвычайныя жахлівыя гукі, што чуліся з кухні. Гэта фрэкен Бок увіхалася там, *спяваючы* на ўсё горла. Малы ніколі раней не чуў, каб яна спявала, і вельмі спадзяваўся, што яна зараз перастане, бо гучала гэта непрыемна. Чамусьці сёння яна была ў надзвычайным гуморы. З раніцы яна схадзіла дадому на Фрэйгатан, наведала Фрыду — магчыма, гэта яе так ажывіла, бо яе песня проста грымела:

— Ах, Фрыда, лепей бы табе... — спявала фрэкен Бок, але што было б лепей для Фрыды, засталося таямніцай, бо Карлсан уварваўся на кухню і крыкнуў:

— Стоп! Стоп! Ты так галосіш, што людзі падумаюць, быццам я цябе збіваю!

Тады фрэкен Бок замаўчала і пахмура паставіла на стол тушанае мяса. Прыйшоў дзядзька Юліус, усе паселі за стол і пачалі есці. Малы думаў, што прыемна сядзець вось так разам і размаўляць пра жахлівыя начныя падзеі. Карлсану спадабалася ежа, і ён пахваліў фрэкен Бок:

— Бач ты, часам і ў цябе няўрокам атрымліваецца смачнае мяса!

Фрэкен Бок нічога не адказала. Яна толькі каўтнула пару разоў і сціснула вусны.

Карлсану спадабаліся і маленькія шакаладныя пудынгі, якія яна прыгатавала на дэсерт. Ён засунуў у рот цэлы пудынг, перш чым Малы паспеў пакаштаваць хоць лыжку свайго, і сказаў:

— Што тут скажаш, смачны гэты пудынг, але я ведаю штосьці смачнейшае ўдвая!

— І што гэта? — спытаў Малы.

— Два такія пудынгі, — сказаў Карлсан і схапіў сабе яшчэ адзін пудынг. Гэта значыць, фрэкен Бок засталася без салодкага, бо зрабіла толькі чатыры порцыі. Карлсан заўважыў, што яна незадаволеная, і пагразіў ёй пальцам.

— Запомні, што некаторым таўстунам пры гэтым стале патрэбна дыета. А дакладней, двум таўстунам — не буду называць імёнаў, але гэта не я і не вось гэты дахадзяга, — паказаў ён на Малога.

Фрэкен Бок яшчэ мацней сціснула вусны і зноў прамаўчала. Малы са страхам паглядзеў на дзядзьку Юліуса, але той, відаць, нічога не пачуў. Ён сядзеў і сварыўся на гультаюг з гарадской паліцыі. Ён ім пазваніў і паведаміў пра злачынства, але з тым жа поспехам мог бы гэтага і не рабіць. Яны сказалі, што ў іх на чарзе яшчэ трыста пятнаццаць іншых

крадзяжоў, якія трэба расследаваць, і заадно спыталі, колькі чаго ў кватэры знікла.

— Але тады я ім даходліва патлумачыў, — сказаў дзядзька Юліус, — што дзякуючы аднаму вельмі смеламу і кемліваму хлопчыку зладзеям давялося сысці ні з чым.

Ён ухвальна паглядзеў на Карлсана. Той заганарыўся, як певень, і даў фрэкен Бок пераможнага штурхаля.

— Ну, што ты цяпер скажаш? Найлепшы ў свеце Карлсан пужае злыдняў пісталентам!

Дзядзька Юліус, праўда, таксама спалохаўся таго пісталета. Ён, вядома, быў рады і ўдзячны, што атрымаў назад гаманец і гадзіннік, але ўсё адно лічыў, што маленькім хлопчыкам нельга гуляць з агнястрэльнай зброяй. Пасля таго як Філе і Руле з усіх капытоў збеглі ад іх, Малому давялося доўга тлумачыць, што да чаго, пакуль дзядзька Юліус паверыў, што гэта проста цацачны пісталет.

Пасля вячэры дзядзька Юліус пайшоў у гасцёўню выкурыць цыгару. Фрэкен Бок мыла посуд і, відавочна, нават Карлсан не мог надоўга сапсаваць яе гумору, бо яна зноў завяла сваё: «Ах, Фрыда, лепей бы табе...» Але раптам яна заўважыла, што ў яе не засталося ніводнага ручніка, каб выцерці посуд, і зноў раззлавалася.

— Ці можа хто-небудзь мне сказаць, куды падзеліся ўсе ручнікі? — яна агледзелася, шукаючы вінаватых.

— Так, *хто-небудзь* можа, а дакладней — найлепшы ў свеце шукальнік ручнікоў, — сказаў Карлсан. — Чаму б табе не пытаць у яго *ўвесь час* пра тое, чаго ты не ведаеш, дурнічка такая?

Карлсан кінуўся ў пакой Малога і вярнуўся з цэлай гарой ручнікоў, за якімі не было відаць яго самога. Гэта была адна вялікая, брудная і запыленая куча. Фрэкен Бок раззлавалася яшчэ больш.

— *Як* ручнікі маглі так запэцкацца? — крыкнула яна.

— Яны пабывалі ў казачным свеце, — сказаў Карлсан, — а там, каб ты ведала, ніколі пад ложкамі не пыласосяць.

Так міналі дні. Ад мамы і таты прыйшла паштоўка. Круіз цудоўны, і яны спадзяюцца, што з Малым усё добра і што дзядзька Юліус не нудзіцца з адным толькі Малым і фрэкен Бок у доме.

Пра Карлсана, які жыве на даху, яны нічога не напісалі, і той неймаверна раззлаваўся.

— Я б ім адправіў паштовачку, калі б меў пяць эрэ на марку, — сказаў ён. — Я б ім напісаў: «Усё правільна! Няважна, як пачуваецца Карлсан, ці добра яму са Страхмістрыняй, — пра гэта нават

не турбуйцеся, хаця гэта ён усё ўлагоджвае і пужае злыдняў пісталентам, знаходзіць зніклыя ручнікі, прыглядвае за вашай фрэкен Бок і ўсё астатняе».

Малы быў рады, што ў Карлсана няма пяці эрэ на марку, бо мама і тата не ўзрадаваліся б, атрымаўшы

такую паштоўку. Змесціва сваёй скарбонкі Малы выграб і аддаў Карлсану раней, але ўсе тыя манеткі разышліся, і Карлсан злаваўся.

— Абы-што нейкае, — сказаў ён. — Я каштую дзесяць тысяч крон, а ў мяне нават пятака на марку няма. Як думаеш, дзядзька Юліус не пагодзіцца купіць мае вялікія пальцы на нагах?

Малы моцна засумняваўся.

— Але ж ён цяпер страшэнна мною захапляецца, — не здаваўся Карлсан.

Малы ўсё адно сумняваўся, і тады Карлсан пакрыўдзіўся, зляцеў да сябе і вярнуўся толькі тады, калі надышоў час есці і Малы прасігналіў яму: «Прылятай».

Малы падумаў, што мама і тата, пэўна, хвалююцца, як пачуваецца дзядзька Юліус, якому даводзіцца дзяліць жытло з фрэкен Бок, калі яны пра гэта напісалі. Але яны хвалююцца дарэмна. Насамрэч дзядзька Юліус пачуваўся з фрэкен Бок вельмі добра, так гэта выглядала. З кожным днём, заўважаў Малы, яны знаходзілі больш і больш тэм для размоў. Яны часта сядзелі ў гасцёўні, і было чуваць, як дзядзька Юліус расказвае пра казачны свет ды ўсялякае іншае, а фрэкен Бок адказвае яму так рахмана і лагодна, што нават не верыцца, што гэта Страхмістрыня.

Урэшце Карлсан пачаў нешта падазраваць. Адбылося гэта тады, калі фрэкен Бок узяла за звычку зачыняць рассоўныя дзверы паміж вітальняй і гасцёўняй. Хоць гэтыя дзверы былі там заўсёды, ніхто ў сям'і Свантэсанаў ніколі іх не зачыняў. Магчыма, таму, што знутры была засаўка, і Малы аднойчы, калі быў зусім маленькі, замкнуўся і не мог выйсці. Пасля такой навукі мама вырашыла, што досыць і заслоны. Але цяпер, калі фрэкен Бок і дзядзька Юліус пілі вечарамі каву ў гасцёўні, фрэкен Бок раптам заманулася зачыняць за сабой дзверы. Дзядзьку Юліусу гэта, відаць, таксама здавалася правільным, бо калі Карлсан аднойчы, не зважаючы на зачыненыя дзверы, увайшоў у гасцёўню, дзядзька Юліус сказаў, што хлопчыкі мусяць пашукаць іншае месца для гульняў, бо яму з фрэкен Бок трэба папіць кавы ў цішыні і спакоі.

— Дык і мне трэба, — з папрокам сказаў Карлсан. — Ты давай сюды каву, а ты цыгарай мяне пачастуй — будзьце вы ўрэшце як людзі!

Але дзядзька Юліус справадзіў яго, і фрэкен Бок задаволена засмяялася. Яна, відаць, падумала, што нарэшце перамагла.

— Гэтага я не пацярплю, — сказаў Карлсан. — Я ўжо ім пакажу!

Наступнае раніцы, калі дзядзька Юліус быў у лекара, а фрэкен Бок пайшла на рынак купляць салаку, Карлсан прыляцеў да Малога з вялікім свердлам у руцэ. Малы бачыў гэты свердзел на сцяне ў Карлсанавым дамку, і спытаў, навошта ён спатрэбіўся Карлсану. Але тут грукнула вечка адтуліны на дзвярах, куды закідвалі пошту, і Малы пабег паглядзець, што там прыйшло. На дыванку перад дзвярыма ляжалі паштоўкі — адна ад Бусэ, другая ад Бэтан. Малы так узрадаваўся, што перачытаў паштоўкі ўздоўж і ўпоперак, а калі начытаўся ўдосталь, Карлсан ужо зрабіў сваю справу. Ён прасвідраваў ладнае вочка ў рассоўных дзвярах.

— Ты што, Карлсан, — спалохаўся Малы, — нельга ж дзверы так свідраваць... Навошта ты гэта зрабіў?

— Каб падглядаць, чым яны там займаюцца, вядома, — адказаў Карлсан.

— Фу, як не сорамна, — сказаў Малы. — Мама кажа, што нельга падглядаць у замочную адтуліну.

— Яна такая разумная, твая мама, — сказаў Карлсан. — Яна ўсё слушна кажа. Замочная адтуліна — каб замыкаць дзверы, гэта з самой назвы зразумела. Але гэта не замочная адтуліна, а дзвярное вочка... Ты такі кемлівы, што сам здагадаешся, для чаго

яно… вось, менавіта, — сказаў Карлсан яшчэ да таго, як Малы паспеў нешта адказаць.

Карлсан выцягнуў з рота жуйку і закаркаваў дзірку, каб яе не было відаць.

— Хой, хой, — сказаў ён. — Даўно ў нас не было вясёлага вечарка, але сёння мы дакладна пазабаўляемся.

Потым Карлсан паляцеў са свердлам дадому.

— У мяне яшчэ такія-сякія справы, — сказаў ён. — Але я вярнуся, калі запахне смажанай салакай.

— А што ў цябе за справы? — спытаў Малы.

— Адна маленькая хуткая справа, каб хоць, прынамсі, здабыць грошай сабе на марку, — сказаў Карлсан і паляцеў.

Але ён і праўда вярнуўся, калі запахла смажанай салакай. За вячэрай ён быў у гуморы. Ён выняў з кішэні пятак і запхнуў яго ў кулак фрэкен Бок.

— Гэта каб цябе крыху падбадзёрыць, — сказаў ён. — Купі сабе якую-небудзь фінціклюшку на шыю ці яшчэ што-небудзь такое!

Фрэкен Бок адкінула манету.

— Я цябе сама зараз адфінціклюшу! — сказала яна.

Але тут акурат прыйшоў дзядзька Юліус, і фрэкен Бок, відавочна, не захацела фінціклюшыць Карлсана пры ім.

— Яна робіцца такая лагодная і дзіўная, як толькі з'яўляецца Казачнік Юле, — сказаў пасля Карлсан Малому. Фрэкен Бок і дзядзька Юліус ужо, як звычайна, зачыніліся ў гасцёўні, каб папіць кавы сам-насам.

— А зараз мы паглядзім, наколькі ўвогуле яны могуць быць жахлівыя, — сказаў Карлсан. — Я зраблю апошнюю спробу па-добраму, але потым пачну надзаляць ім бязлітасна і страшна.

На здзіўленне Малога, ён дастаў з кішэні цыгару, запаліў яе і пагрукаў у дзверы. Ніхто не крыкнуў «Уваходзьце, калі ласка!», але Карлсан усё адно ўвайшоў, энергічна папыхваючы цыгарай.

— Прабачце, гэта, напэўна, пакой для курцоў, — сказаў ён. — У такім разе я, мабыць, магу тут выкурыць цыгару?

Але тут дзядзька Юліус проста раз'юшыўся. Ён выхапіў у Карлсана цыгару, разламаў яе напалам і сказаў, што калі ён яшчэ хоць раз убачыць, як Карлсан курыць, то так яго адлатошыць, што той павек не забудзе, і з Малым больш гуляць не дазволіць, за гэтым дзядзька Юліус прасочыць.

Вусны Карлсана задрыжалі, вочы напоўніліся слязьмі, і ён прымерыўся даць дзядзьку Юліусу кухталя.

— А я такі добры да цябе быў усе гэтыя дні, дурань такі, — сказаў ён, красамоўна зыркнуўшы на дзядзьку Юліуса.

Але той выштурхаў яго з гасцёўні, рассоўныя дзверы зачыніліся, а потым пачулася, як шчоўкнула засаўка. Раней дзверы не замыкаліся.

— Бачыш сам, — сказаў Карлсан Малому, — без надзаляння тут ніяк.

Ён пагрукаў кулаком у дзверы і крыкнуў:

— Ты мне і цыгару спаганіў, дурань!

Потым ён засунуў руку ў кішэню штаноў і чымсьці там загрымеў. Гучала быццам манеты. Так, зусім як пятакі, як цэлая куча пятакоў.

— Шчасце, што я багаты, — сказаў ён, і Малы затрывожыўся.

— Адкуль у цябе столькі грошай?

Карлсан таямніча падміргнуў яму.

— Заўтра даведаешся, — сказаў ён.

Малы яшчэ больш захваляваўся. А раптам Карлсан кудысьці злятаў і скраў гэтыя грошы! Тады ён нічым не лепшы за Філе і Руле... І праўда, а што, калі ён не толькі на яблычнай арыфметыцы знаецца? Малога гэта вельмі турбавала. Але ў яго не было болей часу пра гэта думаць, бо Карлсан ужо акуратна і ціха выкалупваў жуйку з дзвярнога вочка.

— Ну вось, — сказаў ён і паглядзеў у дзірку. Але адразу ж адхіснуўся, нібыта ўбачыў штосьці жахлівае.

— Як ім не сорамна! — сказаў ён.

— Што яны робяць? — Малога разабрала цікаўнасць.

— Я б і сам хацеў ведаць, — сказаў Карлсан. — Але гэтыя свавольнікі пераселі!

Звычайна дзядзька Юліус і фрэкен Бок сядзелі на маленькай канапе, якую цудоўна было відаць праз дзвярное вочка. Там яны і знаходзіліся, калі Карлсан зайшоў да іх з цыгарай. Але цяпер яны адтуль зніклі. Малы сам змог пераканацца, калі зазірнуў у вочка. Яны, відаць, перайшлі на іншую канапу, якая стаяла ля акна, і гэта, сказаў Карлсан, было падступна і здрадліва. Сумленныя людзі, запэўніў ён, заўсёды сядзяць так, каб іх было бачна і ў вочка, і ў замочную адтуліну.

Бедны Карлсан! Ён плюхнуўся на крэсла ў вітальні і няўцешна ўперыўся перад сабой. Упершыню здавалася, што ён упаў духам. Нялёгка прыняць, што твая цудоўная ідэя з дзвярным вочкам выявілася нічога не вартай!

— Хадзем, — сказаў ён урэшце. — Пойдзем пашукаем што-небудзь у цябе, можа, сярод тваіх мэтлахаў знойдзем якіх цапстрыкаў ці добрых штуковін для надзаляння.

Карлсан доўга корпаўся ў шуфлядках і скрынках Малога, але не знаходзіў нічога прыдатнага для надзаляння. Раптам ён прысвіснуў і выцягнуў доўгую шкляную трубку, з якой Малы звычайна страляў гарошынамі.

— Тое, што трэба, — задаволена сказаў Карлсан. — Цапстрыка знайшлі, засталося адшукаць штуковіну!

І ён знайшоў штуковіну, прычым выдатную. Гэта быў вялізны надзіманы шар.

— Хой, хой, — сказаў Карлсан, і ягоныя пульхныя ручкі задрыжалі ад нецярплівасці, калі ён прывязваў шар да аднаго канца трубкі. Потым ён прыставіў трубку другім канцом да вуснаў і надзьмуў яго. Карлсан задаволена крэкнуў, калі ўбачыў непрыгожы твар, надрукаваны чорным колерам на жоўтым шары, які рос усё больш і больш, пакуль ён дзьмуў.

— Гэта, мабыць, задумана як твар Месяца, — вырашыў Малы.

— Гэта можа быць задумана як хоць што, — сказаў Карлсан і выпусціў з шара паветра. — Галоўнае, што гэтым можна надзаляць.

І надзаляннe выйшла цудоўнае. Яно атрымалася сапраўды цудоўнае, хаця Малы хіхікаў так, што ледзь усё не сапсаваў.

— Хой, хой, — сказаў Карлсан і асцярожна прасунуў у вочка шкляную трубку з абвіслым, як анучка, шарам. Потым ён пачаў штомоцы дзьмуць у трубку, а Малы стаяў побач і хіхікаў — о, як бы ён хацеў вось цяпер сядзець у гасцёўні разам

з фрэкен Бок і дзядзькам Юліусам і раптам убачыць вялізны твар Месяца, які надзімаецца ва ўсім сваім харастве, але не ў небе, дзе яму *варта* было б быць, а дзесьці ў змроку каля дзвярэй. У гэты час года, праўда, сапраўднага змроку не бывае, але ў гасцёўні ўсё ж было дастаткова цёмна, каб такая заблукалая поўня выглядала містычна і вусцішна, гэта Малому было ясна.

— Мне трэба зрабіць прывідны рык, — сказаў Карлсан. — Панадзімай пакуль, каб паветра не выйшла!

І Малы паслухмяна нахіліўся да трубкі і пачаў надзімаць, пакуль Карлсан выдаваў жахлівыя прывідныя рыкі. Напэўна, ад іх двое, што сядзелі ў гасцёўні, схамянуліся і ўбачылі нарэшце твар Месяца, таму што раптам пачуўся крык, якога чакаў Карлсан!

— Крычыце-крычыце, — задаволена сказаў Карлсан, але потым прашаптаў:

— А цяпер будзе самае цікавае!

Ён дазволіў паветру вырвацца з шара, той нібы хрыпянуў і абвяў, зноў ператварыўшыся ў анучку. Карлсан паспешліва зацягнуў яго праз адтуліну назад і гэтак жа імкліва заляпіў вочка новай порцыяй жуйкі, а сам хутка, як вожык, знік пад столікам

у вітальні — звыклай схованцы. Малы запоўз следам так шпарка, як мог.

У наступную секунду яны пачулі, як засаўка адсунулася і дзверы адчыніліся. Фрэкен Бок высунула галаву з гасцёўні.

— Мабыць, гэта ўсё ж дзеці, — сказала яна.

Але за ёй стаяў дзядзька Юліус і горача пратэставаў.

— Колькі я мушу табе даводзіць, што казачны свет поўніцца патаемнікамі і што толькі патаемнікі могуць пралятаць скрозь зачыненыя дзверы, як ты не разумееш?

Тады фрэкен Бок рахмана адказала, што калі падумаць, то ўсё так і ёсць. Але яна відавочна не жадала дазваляць розным патаемнікам з казачнага свету, каб тыя заміналі ёй папіваць каву з дзядзькам Юліусам, бо вельмі хутка яна зноў завабіла яго за сабой на канапу. Карлсан і Малы засталіся ў вітальні, і глядзець ім заставалася толькі на зачыненыя дзверы. Задавальненне так сабе, падумаў Малы. Карлсан, напэўна, думаў тое самае. Так, ён дакладна думаў тое самае!

І тут раптам зазваніў тэлефон. Малы адказаў. Гэта быў голас нейкай цётачкі, якая хацела паразмаўляць з фрэкен Бок. Малы здагадаўся, што гэта Фрыда

з Фрэйгатан, і, да свайго сораму, узрадаваўся. Цяпер ён меў поўнае права перашкаджаць фрэкен Бок, і хаця ён быў добрым хлопчыкам, але часам любіў пагарэзаваць.

— Фрэкен Бок, вас да тэлефона! — крыкнуў ён і пагрукаў у дзверы.

Але марна.

— Скажы, што я занятая, — крыкнула ў адказ фрэкен Бок.

Ні патаемнікі, ні фрыды не маглі адарваць яе ад кавы і ад дзядзькі Юліуса. Малы вярнуўся да тэлефона і перадаў словы фрэкен Бок Фрыдзе, але тая пачала распытваць, чым гэта такім занятая яе сястра, калі яна зможа перазваніць і ўсё такое. Урэшце Малы сказаў:

— Вы лепей самі ўсё заўтра ў яе спытайце!

Потым ён паклаў слухаўку і азірнуўся, дзе там Карлсан. Але той знік. Малы пашукаў яшчэ і знайшоў яго ў кухні. Дакладней, на адчыненым акне. На падаконні верхам на найлепшай мамінай мятле сядзела нешта, што мусіла быць Карлсанам, хаця выглядала яно як маленькая ведзьма ці варажбітка: твар чорны, на галаве хустка, а на плячах вядзьмарская мантыя ў кветачкі — старая бабуліна лёгкая кофта, якую яна забыла ў каморы, калі гасцявала апошні раз.

— Не, Карлсан, — захваляваўся Малы, — табе нельга зноў лятаць на вачах у дзядзькі Юліуса.

— Гэта не Карлсан, — сказаў Карлсан глуха, — гэта *злыдзьма*, дзікая і страшэнная!

— Злыдзьма? — перапытаў Малы. — Што гэта, такая ведзьма?

— Так, але страшнейшая, — сказаў Карлсан. — Злыдзьмы нашмат злейшыя на людзей. Раззлуеш такую — нападзе без папярэджання.

— Але... — запнуўся Малы.

— Яны самыя небяспечныя ва ўсім казачным свеце, — заявіў Карлсан. — І я ведаю парачку, у якой зараз ад выгляду злыдзьмы валасы стануць дыбарам.

І злыдзьма вылецела ў чэрвеньскі блакіт, у чарадзейнае сутонне. Малы стаяў і не ведаў, што яму рабіць. Але потым прыдумаў і пабег у пакой Бусэ. Адтуль ён пабачыць не горш за дзядзьку Юліуса і фрэкен Бок, як злыдзьма залятае ў гасцёўню.

Паветра ў пакоі здавалася задушлівым, і Малы адчыніў акно. Ён вызірнуў адтуль і ўбачыў, што акно гасцёўні таксама адчыненае — насустрач летняй ночы і казачнаму свету! Малы падумаў, што дзядзька Юліус і фрэкен Бок сядзяць там і нават не здагадваюцца, няшчасныя, што злыдзьмы *існуюць*. Яны былі так блізка ад яго, што ён мог чуць іх мармытанне. Шкада, што нельга іх пабачыць!

Затое злыдзьму ён бачыў. Толькі падумаць: калі б ён не ведаў, што гэта проста Карлсан, а не сапраўдная злыдзьма, кроў застыла б у жылах, няма сумневаў! Сапраўды вусцішна пабачыць на свае вочы злыдзьму ў небе. Так і сам паверыш у казачны свет, падумаў Малы.

Злыдзьма праляцела пару разоў міма акна гасцёўні і зазірнула туды. Тое, што яна ўбачыла, яе

відавочна здзівіла і расчаравала, бо яна некалькі разоў паматляла галавой. Яна яшчэ не заўважыла Малога ў суседнім акне, а той не насмеліўся азваць-ца. Але Малы горача замахаў рукамі, і тады злыдзьма пабачыла яго. Яна памахала яму ў адказ, і чорны твар асвятліла шырокая ўхмылка.

Малы падумаў, што дзядзька Юліус і фрэкен Бок, відаць, не ўбачылі злыдзьму, бо іхняя размова-мармытанне працягвалася гэтак жа спакойна. Але раптам цішыню і спакой летняга вечара прарэзаў крык. Крычала яна, злыдзьма. Ой, як яна крычала — зусім як... Напэўна, зусім як злыдзьма, бо Малы ніколі ў жыцці не чуў такога крыку, і здавалася, што ляжант гэты ідзе ажно з казачнага свету.

Болей ніякага мармытання з гасцёўні не чулася — павісла поўная цішыня.

Але злыдзьма імкліва заляцела да Малога і адным рыўком скінула з сябе хустку і кофту, выцерла з твару сажу аб фіранкі Бусэ — і вось у пакоі ўжо ніякая не злыдзьма, а проста Карлсан, які паспешліва закінуў вопратку, мятлу і ўсё злыдзьмаўскае прычындалле пад ложак Бусэ.

— Ведаеш што, — сярдзіта падскочыў Карлсан да Малога. — Трэба прапісаць у законе, каб старым людзям забаранялася вось так паводзіцца.

— Гэта як? Што яны рабілі? — зацікавіўся Малы.

Карлсан раззлавана пачатляў галавой.

— Ён трымаў яе за руку! Ён сядзеў там і трымаў яе за руку! Яе — Страхмістрыню! Ну, што ты на гэта скажаш?

Карлсан уперыўся ў Малога, нібыта чакаў, што той самлее ад здзіўлення, а калі гэтага не здарылася, гыркнуў:

— Ты што, не чуеш, што я кажу? Яны сядзелі там і трымаліся за рукі — ат жа якія дурылы!

Карлсан робіцца самым заможным багацеем свету

Наступны дзень стаў для Малога незабыўным. Ён прачнуўся рана, прычым сам, а не ад крыкаў найлепшага ў свеце Карлсана, які прыляцеў яго будзіць. Малы здзівіўся і на дыбачках пабег у калідор, каб узяць газету. Ён хацеў пачытаць коміксы ў цішыні і спакоі, пакуль дзядзька Юліус не забярэ газету сабе. Але да коміксаў у гэты дзень так і не дайшло. Бедны Малы, ён нават не перагарнуў першую старонку! Бо на яго адтуль глядзеў вялізны загаловак, ад якога ў Малога выступіў халодны пот.

ТАЯМНІЦА РАЗГАДАНАЯ! ГЭТА БЫЎ НЕ ШПІЁН

Пад загалоўкам быў фотаздымак з мостам Вэстэрбрун, над якім ляцеў — так, Малы не памыліўся —

над мостам ляцеў Карлсан. Яшчэ там змяшчаўся здымак буйным планам, дзе Карлсан з ухмылкай паказваў свой складны прапелер і круцёлку на жываце, якая ўключала матор.

Малы чытаў і плакаў.

Учора ў рэдакцыю завітаў дзіўны госць. Прыгожы, спрэс разумны і ўзорна тоўсты мужчына ў сваім найлепшым веку — як ён сам прадставіўся — наведаў нас і запатрабаваў узнагароду дзесяць тысяч крон. Лятучая таямніца з Васастана — гэта ён сам, а не хто-небудзь іншы, запэўніў ён і дадаў, што ён ніякі не шпіён, і мы яму верым. «Я шпіёню толькі за такімі, як Страхмістрыня і Казачнік Юле», — сказаў ён. Гэта вельмі дзіцячыя і прастадушныя словы, і, наколькі мы разумеем, гэты наш «шпіён» — проста надзвычай тоўсты школьнік, найлепшы вучань у класе, як сцвярджае ён сам. Але ў хлопчыка ёсць тое, што прымусіць любое дзіця яму пазайздросціць. Гэта маленькі маторчык, з дапамогай якога ён можа лятаць, — вы бачыце яго на фота. Матор стварыў найлепшы ў свеце вынаходнік, сцвярджае хлопчык. Аднак расказаць падрабязней пра гэта ён адмовіўся. Мы зазначылі, што вынаходнік мог бы стаць мультымільянерам, калі б наладзіў масавую вытворчасць такіх мататаў, на што хлопчык адказаў: «Вялікі дзякуй, не трэба забіваць неба лятучымі дзецьмі, хопіць мяне і Малога!»

Тут Малы ўсміхнуўся — а здорава ўсё ж, што Карлсан хоча лятаць з ім *адным*, а не з кімсьці яшчэ! — але потым шморгнуў носам і працягнуў чытаць.

Трэба прызнаць, хлопчык здаваўся не зусім нармальным. Размаўляў блытана, на нашы пытанні адказваў дзіўна і нават не захацеў назваць імёны сваіх бацькоў. «Маці ў мяне мумія, а бацька — Дуг Сноў», — урэшце сказаў ён. Больш мы ад яго нічога не дазналіся. «Сноў» гучыць як англійскае прозвішча, так што, магчыма, бацька хлопчыка — англічанін. У любым разе, верагодна, яго-ны бацька — вядомы лётчык, калі мы слушна зразумелі няўцямную прамову хлопчыка. Відавочна, сын зацікавіўся палётамі дзякуючы бацьку. Хлопчык запатрабаваў адразу ж выдаць яму ўзнагароду. «Яе мушу атрымаць я, а не Філе ды Руле ці яшчэ які памаўзлюка», — сказаў ён. Усю суму ён папрасіў выдаць манетамі па пяць эрэ, «бо толькі пятакі — сапраўдныя грошы», патлумачыў ён. Ён пайшоў ад нас з кішэнямі, набітымі пятакамі. Па рэшту ён зойдзе з тачкай, як толькі зможа. «Глядзіце не прамантачце мае грошы, іначай прыляціць злыдзьма і забярэ вас», — папярэдзіў ён. Што ні кажыце, знаёмства з ім было займальнае, нават калі мы зразумелі не ўсё з таго, што ён кажа. «Запомніце, што вы заплацілі толькі прыблізна за адзін вялікі палец на маёй назе», — такія

былі яго развітальныя словы. Потым ён вылецеў у акно і пакіраваў у бок Васастана. Як ні дзіўна, прозвішча хлопчыка не Сноў, як у бацькі. Як так атрымалася, ён таксама адмовіўся патлумачыць. Ён ні на якіх умовах не захацеў раскрыць нашай газеце сваё сапраўднае імя, «бо Малы супраць», як ён патлумачыў. Падобна, што ён вельмі прывязаны да свайго малодшага сябра. Такім чынам, як бы нашага госця ні звалі, мы не можам раскрыць яго імені, але ж можам прынамсі сказаць, што пачынаецца яно на «Карл», а заканчваецца на «сан». Але паколькі асоба не хоча паведамляць газеце сваё імя, то мы мяркуем, што яна мае на гэта права. Таму мы і называлі тут хлопчыка проста хлопчыкам, а не Карлсанам, як яго насамрэч завуць.

— «Падобна, што ён вельмі прывязаны да свайго малодшага сябра», — прамармытаў Малы і зноў шморгнуў носам. Але потым ён падышоў да шнурка ад званка і сярдзіта таргануў за яго. Наверсе прагучаў сігнал «Прылятай!»

І Карлсан прыляцеў. Ён загудзеў у акне, жвавы і вясёлы, як чмель.

— Ці пішуць сёння ў газеце што-небудзь асаблівае? — гулліва спытаў ён і выкапаў з зямлі персікавую костачку. — Прачытай мне, калі там нешта сапраўды цікавае!

— Як табе не сорамна! — сказаў Малы. — Ты хіба не разумееш, што ўсё сапсаваў? Нас ніколі не пакінуць у спакоі, ні цябе, ні мяне.

— Няўжо нехта думае, што цябе трэба пакінуць у спакоі? — сказаў Карлсан і выцер запэцканыя ў зямлі далоні аб піжаму Малога. — Трэба, каб бабахала, каб весела было, а іначай я не гуляю, так і ведай. Ну давай, пачытай мне ўжо!

І пакуль Карлсан лятаў то так, то гэтак перад люстэркам, захапляючыся сабой, Малы яму чытаў.

Ён прапускаў месцы накшталт «надзвычай тоўстага школьніка», каб не засмучаць Карлсана, але ўсё астатняе прачытаў ад пачатку і да канца. Карлсан аж надзьмуўся ад задавальнення.

— «Займальнае знаёмства» — гэта пра мяне! Так, у гэтай газеце пішуць толькі праўду.

— «Падобна, што ён вельмі прывязаны да свайго малодшага сябра», — прачытаў Малы і сарамліва паглядзеў на Карлсана. — Таксама праўда?

Карлсан прыпыніў палёт, каб падумаць.

— Як ні дзіўна, праўда, — крыху неахвотна пагадзіўся ён. — Толькі падумаць, што нехта можа быць прывязаны да такога дурненькага хлопчыка, як ты! Гэта ўсё, вядома, ад маёй дабрыні, бо я самы добры і лагодны ў свеце... Ну, чытай далей!

Але Малы не змог чытаць далей, пакуль не праглынуў камяк у горле: усё ж ён і праўда падабаецца Карлсану! Тады астатняе ўсё няважна!

— А добра, што я сказаў ім, каб не друкавалі маё імя ў газеце, — сказаў Карлсан. — Гэта я *выключна* дзеля цябе зрабіў, бо ты ж у такой таямніцы мяне хочаш трымаць, што вы, што вы!

Потым ён схапіў газету і нейкі час замілавана разглядаў абодва фотаздымкі.

— Проста неверагодна, які ж я прыгожы, — сказаў ён. — А які я ўзорна тоўсты — гэта яшчэ больш неверагодна, ты паглядзі!

Ён паднёс газету пад нос Малому. Але потым забраў назад і горача цмокнуў сваё фота, на якім паказваў круцёлку на жываце.

— Хой! Калі я бачу сябе, мне хочацца крыкнуць «ур-ра!» — сказаў ён.

Але Малы выхапіў у яго газету.

— Нельга, каб фрэкен Бок і дзядзька Юліус гэта ўбачылі, — сказаў ён. — Нізашто!

Ён засунуў газету як мага далей у шуфлядку стала. Праз хвіліну ў пакой зазірнуў дзядзька Юліус і спытаў:

— Малы, газета ў цябе?

Малы паматаляў галавой:

— Не, не ў мяне!

У яго ж *і праўда* яе не было, бо яна ляжала ў шуфлядцы, патлумачыў ён потым Карлсану.

Але, здавалася, дзядзька Юліус не так ужо і пераймаўся газетай. Яму, відаць, было пра што падумаць, прычым думалася пра нешта прыемнае, бо ён

выглядаў незвычайна вясёлым. Да таго ж ён збіраўся ісці да лекара. Апошні раз. Праз пару гадзін дзядзька Юліус з'язджаў назад у Вэстэргётланд.

Фрэкен Бок дапамагла яму апрануць паліто, і Малы з Карлсанам чулі, як яна пераконвае яго, каб зашпільваўся на ўсе гузікі, акуратна пераходзіў дарогу і не курыў так рана.

— Што сталася з нашай Страхмістрыняй? — здзівіўся Карлсан. — Яна лічыць сябе ягонай жонкай?

Сапраўды, гэты дзень быў поўны нечаканасцей!

Не паспеў дзядзька Юліус сысці, як фрэкен Бок кінулася камусьці тэлефанаваць. Яна размаўляла гучна, і Карлсан з Малым усё чулі.

— Алё, Фрыда? — бадзёра пачала яна. — Як ты там, нос на месцы?.. Сапраўды? Але я табе так скажу, за мой нос можаш болей не хвалявацца, бо я яго забіраю з сабой у Вэстэргётланд, я туды зараз пераязджаю... Не, не працаваць — а замуж, уся такая непрыгожая — ну, што ты на гэта скажаш?.. Вядома, я магу табе сказаць, за каго, — за спадара Юліуса Янсана, за яго і нікога іншага... так, менавіта, лічы, што цяпер ты размаўляеш са спадарыняй Янсан, мая Фрыдачка... Ты расчулілася, плачаш... Ну, ну, Фрыда, годзе раўці, ты яшчэ захамутаеш якога-небудзь зладзюгу... Ну ўсё, няма часу, жаніх можа прыйсці ў любую хвіліну... Потым болей раскажу, мая Фрыдачка.

Карлсан вырачыўся на Малога.

— Ці існуюць якія-небудзь добрыя горкія лекі для тых, хто з'ехаў з глузду? — спытаў ён. — Бо калі існуюць, нам трэба зараз жа выдаць дзядзьку Юліусу вялікую-вялікую дозу!

Але Малы пра такія лекі нічога не ведаў.

Карлсан спачувальна ўздыхнуў, а калі дзядзька Юліус вярнуўся ад лекара, ён ціха падышоў да яго і паклаў яму ў руку манетку ў пяць эрэ.

— Навошта мне гэта? — спытаў дзядзька Юліус.

— Купі сабе што-небудзь прыемнае, — цяжка вымавіў Карлсан, — табе гэта трэба.

Дзядзька Юліус падзякаваў, але сказаў, што ён і без пятакоў вельмі шчаслівы і ўсцешаны.

— Хаця вы, хлопчыкі, вядома, будзеце засмучаныя, калі я скажу, што збіраюся забраць ад вас цётку Хільдур.

— Цётку Хільдур? — не зразумеў Карлсан. — Гэта яшчэ хто такая?

Калі Малы яму патлумачыў, ён доўга рагатаў.

Але дзядзька Юліус працягваў распісваць, які ён шчаслівы. Гэтых дзён яму ніколі не забыць, сказаў ён. Спачатку яму чароўным чынам адкрыўся казачны свет! Вядома, часам, калі ведзьмы ляталі перад акном, было страшнавата, але...

— Не ведзьмы, — сказаў Карлсан, — а злыдзьмы — дзікія, страшэнныя і жахліва вусцішныя!

Але ўсё адно, працягваў дзядзька Юліус, добра адчуваць, што жывеш у тым самым свеце, што і твае продкі. Хаця найлепшы падарунак гэтых дзён — казачная прынцэса на імя Хільдур. Неўзабаве ў іх будзе вяселле!

— Казачная прынцэса на імя Хільдур, — паўтарыў Карлсан з аганьком у вачах. Ён доўга смяяўся, потым паглядзеў на дзядзьку Юліуса, паматляў галавой і зноў засмяяўся.

Фрэкен Бок тупала па кухні і была такой вясёлай, якой Малы яе ніколі не бачыў.

— Мне таксама падабаюцца ведзьмы, — сказала яна, — бо калі б тое страхоцце не праляцела за акном і не напалохала нас у той вечар, то ты, Юліус, не кінуўся б мне на шыю, і нічога б тады не было.

Карлсан уздрыгнуў.

— Вельмі міла, — пачаў ён сярдзіта, але потым толькі пацепнуў плячыма. — Хаця гэта з'ява банальная. Але я лічу, што злыдзьмаў у Васастане нам болей не трэба.

А фрэкен Бок усё хадзіла і хадзіла, і чым больш яна думала пра вяселле, тым весялейшай рабілася.

— Ты, Малы, пойдзеш з намі на вяселле, — пагладзіла яна яго па шчацэ. — Я табе пашыю чорны аксамітны гарнітур — уяўляеш, які ты будзеш прыгажунчык?

Малога перасмыкнула. Чорны аксамітны гарнітур... Ды Крыстэр з Гунілай яго да смерці абсмяюць!

А вось Карлсан не засмяяўся, а ўзлаваўся.

— Я з вамі не гуляю, калі мяне таксама не пусцяць на вяселле, — сказаў ён. — Я таксама хачу чорны

аксамітны гарнітур, таксама хачу быць прыгажунчыкам, а іначай я проста не гуляю!

Тут ужо фрэкен Бок засмяялася.

— Анягож, цудоўнае вяселле будзе ў нас, калі мы пусцім цябе ў царкву!

— Вось і я так думаю, — жыва падхапіў Карлсан. — Я мог бы стаяць ззаду за табой у сваім чорным аксамітным гарнітуры і махаць вушамі ды час ад часу даваць салют, бо на вяселлі ж мусіць быць салют!

Дзядзька Юліус быў такі шчаслівы, што яму хацелася ўсіх радаваць, і ён дазволіў Карлсану таксама прысутнічаць на вяселлі. Але тады фрэкен Бок сказала, што калі Карлсан збіраецца прыйсці, то яна лепш увогуле не пойдзе замуж.

Надышоў вечар. Малы сядзеў на ганку Карлсанавага дамка і глядзеў, як спускаюцца прыцемкі і па ўсім Васастане, па ўсім Стакгольме, куды сягае вока, загараюцца агні.

У гэты вечар ён сядзеў побач з Карлсанам, і ўсё было так цудоўна. Недзе там, у Вэстэргётландзе, якраз цяпер падышоў да станцыі цягнік і з яго выходзіў дзядзька Юліус. Недзе там, у Балтыйскім моры, белы карабель з мамай і татам на борце трымаў курс на Стакгольм. Фрэкен Бок суцяшала Фрыду ў доме на вуліцы Фрэйгатан. Бімба забраўся спаць у свой кошык. А тут, на даху, побач са сваім найлепшым сябрам сядзеў Малы, і яны разам елі булачкі з вялікага пакета — смачныя, свежыя булачкі, спечаныя фрэкен Бок, — гэта было цудоўна. І ўсё адно Малога нешта трывожыла. У таго, каму

выпала быць найлепшым сябрам Карлсана, не бывае спакою.

— Я спрабаваў прыглядаць за табой, як толькі мог, — сказаў Малы. — Я праўда стараўся. Але што цяпер будзе, я не ведаю.

Карлсан узяў яшчэ адну булачку і праглынуў яе цалкам.

— Які ж ты дурны! Яны ж цяпер не змогуць здаць мяне ў рэдакцыю і атрымаць кучу пятакоў, я гэтаму паклаў канец! Філе, Руле і ўсяму іхняму кодлу цяпер нецікава паляваць на мяне, разумееш?

Малы таксама ўзяў сабе булачку і задумліва яе ўкусіў.

— Не, гэта ты дурны, — сказаў ён. — Увесь Васастан будзе кішэць народам, мноства разявак захочуць паглядзець, як ты лятаеш, будуць спрабаваць скрасці твой матор і ўсякае такое.

Карлсан ухмыльнуўся.

— Ты праўда так думаеш? Прынамсі, гэта значыць, у нас раз-пораз будуць надарацца вясёлыя вечаркі!

— Вясёлыя вечаркі, — сярдзіта перадражніў Малы. — Ды ў нас ніколі больш не будзе спакойнай хвіліны, кажу табе. Ні ў цябе, ні ў мяне.

Карлсан выглядаў яшчэ больш задаволеным.

— Што ж, трэба спадзявацца, што так яно і будзе. Малы раззлаваўся па-сапраўднаму.

— Ну а як дасі гэтаму рады? — абурыўся ён. — Што ты будзеш рабіць, калі сюды заявяцца натоўпы людзей?

Тады Карлсан схіліў галаву набок і паглядзеў на Малога з-пад чупрыны.

— Ёсць тры спосабы, і ты іх ведаеш. Надзаляць, хітраваць і фігураваць. І я збіраюся ўжыць усе тры.

У яго быў такі хітры выгляд, што Малы не мог не засмяяцца, хоць і не збіраўся. Ён хіхікнуў — спачатку ціха, але потым смех, як бурбалкі, пачаў вырывацца з яго, і чым больш ён смяяўся, тым больш вясёлым рабіўся Карлсан.

— Хой, хой, — сказаў ён і штурхануў Малога так, што той ледзьве не кульнуўся з ганка. А Малы тады засмяяўся яшчэ больш і падумаў, што самае вясёлае толькі пачынаецца.

А Карлсан сядзеў на ганку і замілавана разглядаў два чорныя вялікія пальцы, што выглядвалі з падраных шкарпэтак.

— Не, не буду іх прадаваць, — сказаў ён. — Больш не прасі мяне, Малы! Не прадам, бо гэтыя пальцы належаць самаму заможнаму багацею ў свеце, і яны больш не прадаюцца.

Ён засунуў руку ў кішэню і задаволена загрымеў россыпам пятакоў.

— Хой, хой, багаты, прыгожы, спрэс разумны і ўзорна тоўсты мужчына ў сваім найлепшым веку — гэта я. Найлепшы ў свеце ва ўсіх сэнсах Карлсан, разумееш, Малы?

— Разумею, — сказаў Малы.

Але ў кішэнях Карлсана былі не толькі пятакі — там быў яшчэ і ягоны маленькі пісталет. Не паспеў Малы запярэчыць, як Карлсан бабахнуў такім стрэлам, што рэха ад яго пракацілася па ўсім Васастане.

«Ну, пачалося», — падумаў Малы, бо ўбачыў, як у суседніх дамах адчыняюцца вокны, і пачуў узрушаныя галасы. Карлсан заспяваў, пагойдваючы двума чорнымі вялікімі пальцамі ў такт:

Трэба, каб бабахала, каб весела было —
вось так: бабах, бубух, бабам, бубум, тра-ла-ло!
Каб імянінных булачак быў поўны дом,
вось так! Бах, бух, бам, бум, бом!
Хай мне крычаць:
«Здароўценькі! Віншуем! Ура!» —
І дораць падарункі, каб аж бах-тарарах!
Вось так: хой, хой, хой!
Вось так: вой, вой, вой!
Вось так: бах, бубух, бабам, бубум і бом!

АСТРЫД ЛІНДГРЭН (1907—2002) добра ведаюць ва ўсім свеце. Яе кнігі перакладзены больш чым на сто моў і выдадзены агульным накладам прыкладна 160 мільёнаў асобнікаў.

Першая кніга пісьменніцы — «Піпі Доўгаяпанчоха» — выйшла ў 1945 годзе, адразу пасля Другой сусветнай вайны, і вельмі хутка стала папулярнай. Яна перакладзена на семдзесят моў. Потым Астрыд Ліндгрэн напісала яшчэ восемдзесят кніг. Па многіх з іх былі зняты фільмы, серыялы, пастаўлены спектаклі.

«Чалавецтва занятае дзвюма вялікімі рэчамі: смерцю і любоўю. Яны хвалююць кожнага незалежна ад узросту. Не трэба, каб кнігі палохалі дзяцей, але важна, каб мастацтва казала ім праўду гэтак жа, як і дарослым», — лічыла пісьменніца.

У сваіх творах Астрыд Ліндгрэн часта паказвала тое асяроддзе, у якім сама жыла. Яна нарадзілася

ў Насе, на хутары Вімербю, і шчаслівае дзяцінства на прыродзе адлюстравана ў многіх яе кнігах. Піпі Доўгаяпанчоха, Эміль, Карлсан, які жыве на даху, Браты Львінае сэрца, дзеці з Бюлербю, Роні, дачка разбойніка... Мільёны дзяцей і дарослых па ўсім свеце любяць гэтых персанажаў і адчуваюць сябе як дома на віле Кавардакуле, у замку разбойнікаў або на даху стакгольмскага дома.

Астрыд была смелай і моцнай асобай, якая змагалася за правы дзяцей, выступала супраць гвалту і за гуманнае абыходжанне з жывёламі. Яна адыграла важную ролю ў фарміраванні грамадскай думкі ў Швецыі. Немагчыма пераацаніць значэнне пісьменніцы для ўсёй еўрапейскай культуры.

«Я хачу пісаць для чытачоў, якія ўмеюць ствараць цуды. Дзеці ствараюць цуды, калі чытаюць. Вось чаму дзецям патрэбны кнігі».

ПА ПЫТАННЯХ НАБЫЦЦЯ КНІГ ЗВЯРТАЙЦЕСЯ:
г. Мінск, тэл. (8-10-375-17) 272-29-75;
e-mail: popuri@mail.ru; mail@popuri.ru; www.popuri.ru;
г. Масква, ТАА «Выдавецкі дом “Белкніга”»,
тэл. (495) 276-06-75; e-mail: popuri-mos@mail.ru,
popuri-m@mail.ru.

Літаратурна-мастацкае выданне

ЛІНДГРЭН Астрыд

КАРЛСАН ХІТРУЕ ЗНОЎ

Для малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту

Пераклад са шведскай мовы — *Алеся Башарымава*
Мастак — *Арсен Джанік’ян*

Адказны рэдактар — *Наталля Давыдоўская*
Стылістычны рэдактар — *Паліна Грынчанка*
Вёрстка — *Вадзім Нога*
Карэктар — *Віктар Іваноў*
Афармленне вокладкі — *Ніна Дулуб*

Падпісана ў друк 04.12.2019. Фармат 70×90 1/16. Папера афсетная.
Друк афсетны. Ум. друк. арк. 15,21. Тыраж 2100 экз. Заказ 0592.
Дата вытворчасці: студзень 2020 г.

ТАА «Папуры». Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў №1/151 ад 24.01.2014.
Рэспубліка Беларусь, 220113, г. Мінск, вул. Мележа, 5, корп. 2, к. 403.

Надрукавана ў друкарні «Фактор-Друк».
Украіна, 61030, г. Харкаў, вул. Саратаўская, 51.
Тэл.: + 380 57 717 53 57.

Карлсан хітруе зноў

Усё пачалося
з вялізнага перапалоху:
Карлсана заўважылі
ў горадзе, і таму, хто яго
спаймае, абяцаюць узнагароду!
Але гэты штукар дасць рады
любым цяжкасцям.

Што ні старонка – новая прыгода.
Ты зноў сустрэнеш фрэкен Бок,
і круцялёў Філе і Руле,
і загадкавага прывіда.
З імі дакладна
не засумуеш!

Упершыню на беларускай мове –
усе тры кнігі пра Малога і Карлсана!

EAC
0+

ПОПУРРИ
popuri.ru

ISBN 978-985-15-4262-4
9 789851 542624

Астрыд Ліндгрэн

Карлсан хітруе зноў